беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 30 (68)
28 кастрычніка
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

Вітаўтас Ландсбэргіс:

«Нашыя дачыненьні ня ў лепшым стане»

Адразу пасьля перамогі партыі кансэрватараў на мінулых парлямэнцкіх выбарах у Літве карэспандэнт «Нашай Нівы» Андранік Антанян сустрэўся зь лідарам гэтай партыі Вітаўтасам Ландсбэргісам.

«НН»: Спадар Вітаўт, безумоўная перамога Вашай партыі і палітыкаў правай арыентацыі на мінулых выбарах у Сэйм Літоўскай Рэспублікі выглядае звонку не зусім лягічнай. Найбуйнейшыя літоўскія газэты й тэлерадыёкампаніі ня надта каб падтрымлівалі ані ўзначаленую Вамі партыю кансэрватараў, ані партыю хрысьціянскіх дэмакратаў, якая заняла другое месца ў выбарчай гонцы. Чым Вы можаце патлумачыць гэтую зьяву?

В.Л.: Гэта сапраўды так. На жаль, большасьць палітыкаў і супрацоўнікаў мас-мэдыя занадта высока думаюць пра тую ролю, якую яны выконваюць у грамадзтве, а таксама пра свой аўтарытэт сярод жыхароў Літвы. Яны займаюць тое месца ў нашым грамадзтве, якое займаюць. На шчасьце, сёньня ня так лёгка маніпуляваць думкаю выбаршчыкаў, як гэта было колькі гадоў таму. **Газэты цяпер у большай ступені займаюцца бізнэсам, пошукам чытача й заляцаньнем да яго, чым фармаваньнем ягонай думкі.**

Працяг на старонцы 4.



Здымак Анатоля Клешчука.

Праежалі

19 кастрычніка ў Менску, у Беларусі мелася адбыцца нешта вельмі важнае — страшнае і адначасова сьветлае. Афіцыёзны сход і забароненая маніфэстацыя. Тое «прадчуваньне грамадзянскай вайны», пра якое шмат казалі і пісалі напярэдадні, 19-га ня спраўдзілася, але, бадай, і ня зьнікла. Усё стала выглядаць крыху менш адназначна, кола рэальных суб'ектаў беларускай палітыкі стала крыху шырэй за аднаго чалавека, прэзыдэнта. Але падзеі 19-га ня толькі не адказалі на пастаўленыя пытаньні (шмат хто чакаў зусім простых адказаў), але й дадалі пытаньні свае, на якія можна будзе адказаць толькі заўтра: ці сапраўды «дрогнуў» патэнцыяльны дыктатар? ці слушна паводзілі сябе маніфэстанты? ці ёсьць прычыны для аптымізму або пэсымізму?

Самы галоўны набытак 19-га — гэта першае кволае адчуваньне таго, што ў Беларусі зьявіўся нехта больш мудры за натоўп. Гэты нехта сваімі незаўважнымі маніпуляцыямі выводзіць палітычнае жыцьцё краіны з заганнага кола стрэсаў, папулізму і рэвалюцыяў. Насуперак жаданьням узурпатара-прэзыдэнта, галоўны набытак якога — ягоныя ворагі. Насуперак жаданьням натоўпу, які прагне зрабіць Лукашэнку «другую Румынію».

19-га кастрычніка не было пераможцаў і пераможаных, не было вайны і не было рэвалюцыі. Мы проста адчулі, што ўсё можа разьвівацца ў іншай плоскасьці, не абавязкова ў кірунку да вайны або рэвалюцыі. Культура ня можа перамагчы хамства ягонымі сродкамі. Яна ўжывае сілу толькі ў поўнай згодзе з заканадаўствам. А хамства кіруецца ўласным эмацыйным разагрэвам і папулісцкімі лёзунгамі. 19-га А.Лукашэнка выказаў столькі абразаў на адрас нацыянальнае традыцыі, людзей нашае культуры, самое Беларусі, колькі яшчэ не выказваў ніколі. «Булыжник — орудие пролетариата». Зброя культуры — закон.

Дык вось, галоўнае пытаньне, якое паставілі падзеі 19-га: ці сапраўды ў краіне зьявіўся нехта больш мудры за натоўп? Ці ў беларускую дэмакратыю прыйшлі канкрэтныя лідары — на зьмену лідарству вулічнае стыхіі? Ці адчуюць сябе наступныя маніфэстацыі — кіраванымі?

Але на ўсе гэтыя пытаньні мы зможам адказаць толькі заўтра. Што да сёньня, то адзінае зусім зразумелае — 19-га мы пражылі. Праехалі. Хто дзе і хто як. Пра гэта аўтары «НН» пішуць у сваіх дзёньніках, лістах і нататках *на старонцы 3.*

Палітычны камэнтар

У бандэрлёгаў сумны лёс

Алег Дашкевіч

Апошнім часам сытуацыя ў краіне нагадвала мне сцэну зь вядомага мульціка пра Маўглі. Калі ўдаў, утаропіўшыся гіпнатычным позіркам у зграю малпаў, шыпеў на іх: «Бандэрлёгі, падыйдзіце на крок бліжэй... яшчэ бліжэй... яшчэ...» Бандэрлёгі пішчэлі, усьведамляючы, што іх чакае, але былі няздольныя адарвацца ад гіпнатычнага позірку і паслухмяна сунуліся ў пашчу ўдава.

Нешта падобнае адбываецца ў Беларусі на працягу двух зь лішкам гадоў. Палымяныя прамовы Лукашэнкі, рэфэрэндумы, сходы. Крок за крокам, крок за крокам. Ня надта думаецца, што тыя пяць тысяч мінус адзінаццаць чалавек, якія галасавалі за ўсе рэзалюцыі народнага хуралу, у душы пагаджаліся зь імі, але... але ступілі на крок бліжэй. У іншы час і пры іншых абставінах, магчыма, у падобнай сытуацыі падобны сход прагаласаваў бы і за харакіры. Сёньня сытуацыя крыху ня тая. Крыху ня тая краіна, маленькая, зь ня той гісторыяй, мэнтальнасьцю, моладзьдзю. Ня тыя крыху парлямэнт і Канстытуцыйны Суд, якія ня хочуць прыпадабняцца да бандэрлёгаў. Але шукаюцца магчымасьці прыпадобніць краіну да той, з харакіры...

— Я вернул вам красное знамя, я верну вам великую страну.

Ва ўмовах Беларусі незалежнай Лукашэнка пэрспэктываў ня мае, як ня мае на гэты конт і залішніх ілюзіяў. Мэта адна — Расея. Што ж, зь ягонага боку ўсё выглядае слушна. Іншая прастора, іншыя норавы, страшная колькасьць злога, пакрыўджанага на ўсіх народу, туга па імпэрыі. Больш удзячную глебу для ТАКОЙ палітыкі цяжка ўявіць.

Лукашэнка першы і, хутчэй за ўсё, апошні зь лідараў краінаў былога саюзу, хто здаваў, здае і будзе здаваць незалежнасьць сваёй Айчыны. Гэта спосаб яго існаваньня і пэрспэктыва на ўласную палітычную будучыню. Спажыўцоў ягонай палітыкі, нягледзячы на ўсю яго скандальнасьць, там, у Расеі, хапае як сярод палітычных колаў, так і сярод электарату. Калі прыняць пад увагу тыя ўмовы, у якіх сёньня існуе Расея (пэўнае расчараваньне ва ўладзе... схлынула папулярнасьць Жырыноўскага... крыўда за паразу камуністаў... адстаўка Лебедзя), то харызма інтэгратара Лукашэнкі сапраўды мае шанец на запатрабаваньне. Пры ўзроўні расейскай тэхналёгіі палітычнай раскруткі і гіпнозу Лукашэнкі ягоны посьпех, напрыклад, пры ўдзеле ў расейскіх выбарах, цалкам верагодны. Але такому зьбегу абставінаў перашкаджае разыходжаньне ў заканадаўствах Расеі і Беларусі, якое Лукашэнка ўсімі магчымымі спосабамі будзе імкнуцца нівэляваць, не перабіраючы ў сродках. Таму згода Лукашэнкі на прапанаваную парлямэнтам дату рэфэрэндуму — гэта толькі чаканьне новага зручнага моманту. Спадзявацца на тое, што ўсе расейскія палітычныя эліты адпрэчаць Лукашэнку, альбо проста скарыстаюцца ім і выкінуць яго, не зусім апраўданыя. Калі ёсьць тавар, цалкам верагодна, што зьявіцца і пакупнік. Сёньня ў Маскве дэфіцыт на сьцягі. Для кагосьці такім сьцягам можа стаць і Лукашэнка.

У выпадку, калі прэзыдэнцкія выбары у Расеі адбудуцца праз год, першае, чаго нельга дапускаць сёньня, — гэта падвойнага грамадзянства з Расеяй. Можна спрагназаваць, што захады Лукашэнкі ў гэтым кірунку будуць проста шалёныя. Нам жа трэба бараніць незалежнасьць. У іншым выпадку нам цяжка будзе пазьбегнуць лёсу бандэрлёгаў ня толькі ў Беларусі, але і ў Расеі.

Алег Дашкевіч

Фірма "Концессия"
рэалізуе
ЗАПЧАСТКІ
да МТЗ і НЯМЕЦКАЙ с/г тэхнікі
ШЫНЫ
ЦЭМЭНТ
ШЫФЭР
Магчымы бартэр на с/г прадукцыю
т/ф (017) 220-36-76

ТЭЛЕПРАГРАМА

20 MTV
1 сусьветны бэстсэлер гэтага месяца

ПРЭС-РЭЛІЗ
6 Сьвет за тыдзень. Кароткія навіны.

СПАЖЫВЕЦ
10 Які выбраць кампутар?

АДПАЧЫНАК
12 50 спосабаў пазбавіцца стрэсу

Інфарматар

Рэпартажы

Каля сьцяны...

Гістарычна гэта — Пішчалаўскі замак. У народзе яго называюць Валадаркай, афіцыйна — «установа УЖ-15/13-1» або СІЗО №1. Сёньня тут сядзяць і крымінальнікі, і палітычныя. Кожны дзень пад сьценамі Валадаркі дзяжурыць чарга зь некалькіх дзясяткаў чалавек. Гэта сваякі, сябры і адвакаты вязьняў...

Рэпартаж на старонцы 3.

Кніжны клюб у Менску

Штосуботу ад чатырох раніцы «на клюбе» пачынаецца бурлівае жыцьцё. Заплаціўшы за ўваход усяго дзьве тысячы «зайцоў», тут можна адшукаць даўно забытую кнігу з глыбока савецкіх часоў, набыць апошнюю маскоўскую ці піцерскую навінку, дамовіцца пра партыю ў некалькі тысячаў асобнікаў ці проста паштурхацца каля латкоў, столікаў, стосаў ды пачак стракатых, бліскучых, тонкіх і тоўстых кніг, кніжак, кніжачак...

Рэпартаж на старонцы 11.

Гісторыя

Французкія ахвяры беларускай партызанкі

8 жніўня 1996 г. мінула 55 гадоў з таго часу, як першы грамадзянін Францыі быў залічаны ў савецкі партызанскі атрад у Беларусі. Пра лёс гэтага і іншых французаў, якія партызанілі ў нашых лясах — *у артыкуле на старонцы 13.*

Літаратура

Ваеннае становішча

Дзьве навэлы вядомага польскага пісьменьніка Марка Навакоўскага зь ягонай кнігі «Рапарт пра ваеннае становішча» — *на старонцы 14.*

Беларускі рэнэсанс

5 лістапада, у аўторак у камэрнай залі (касьцёл Сьв. Роха) адбудзецца канцэрт мужчынскага хору "Унія".

Падпіска дзеля знаёмства

У другім паўгодзьдзі многія ўстановы атрымліваюць «Нашу Ніву» бясплатна. Дзякуючы клопату Беларускага Фонду Сораса, наша газэта прыходзіць у навучальныя ўстановы, школы, музэі і клюбы па ўсёй Беларусі. За мінулыя месяцы Вы пазнаёміліся з «НН», і ў новую падпісную кампанію Вам будзе лягчэй зрабіць свой выбар — ці працягнуць падпіску самастойна, ці адмовіцца ад яе. Рэдакцыя вельмі разьлічвае на Ваш удзел. З свайго боку мы мяркуем у новым, 1997-м годзе павялічыць колькасьць старонак газэты, пашырыць нашыя рубрыкі, прысьвечаныя гісторыі і культуры, увесьці некалькі новых тэматычных палосаў. Значна пашырыцца таксама наш «Інфарматар». Адным словам, тыднёвік стане больш арганізаваным, зьмястоўным і прыгожым.
Не забудзьцеся працягнуць Вашу падпіску на «НН».
Выпісаць тыднёвік можна на кожнай пошце.
Наш індэкс: 63125.

Новы дагматызм

Першае лёгкае раздражненьне я адчуў наканфэрэнцыі пра Сярэднюю Эўропу, якая адбывалася ў канцы верасьня й пра якую «НН» ужо пісала. Назва канфэрэнцыі была наступная: «Другая Эўропа: Культурная парадыгма й геапалітычная рэальнасьць». І вось, каб забясьпечыць менавіта «рэальнасьць», быў арганізаваны «паліталягічны блёк» канфэрэнцыі.

Там я знайшоў прадмет майго зьдзіўленьня — беларускія палітолягі напрыканцы 1996 году казалі тое самае, што яны абвяшчалі два, тры, а нават 6-7 гадоў таму. Спрошчана кажучы, галоўныя тэзы палітолягаўвыступоўцаў на той канфэрэнцыі, а таксама вялікай часткі беларускіх палітолягаў увогуле, зводзяцца да прызнаньня таго факту, што большасьць насельніцтва Беларусі — гаспадарча ды мэнтальна залежная ад дзяржавы, грамадзка інэртная, і таму схільная да падтрымкі аўтарытарнага і нярынкавага рэжыму.

Яшчэ адзін варыянт разьвіцьця гэтае тэзы абгрунтоўвае неабходнасьць у любым выпадку выратаваць цяжкую індустрыю, а гэта раўназначна далейшаму захаваньню той палітычнай мадэлі адносінаў Беларусі з Расеяй, калі першая можа папросту ня сплочваць пазыкі за нафту й газ.

Абсалютысцкая выснова з гэтых пасылак: нацыяналістам і кансэрватарам варта памаўчаць, усё, што адбываецца ў Беларусі з рэформамі й грамадзянскімі правамі, абсалютна заканамернае, таму ад сёньняшняга рэжыму можна дамагацца толькі некаторых ідэалягічных карэкцыяў, да прыкладу, адмовы ад антызаходняй рыторыкі. Галоўны тут пункт развагаў — лягічны ланцуг «індустрыйнасьць = аўтарытарызм», што азначае канцэптуальную непазьбежнасьць сёньняшняе сытуацыі. Няма асаблівага сэнсу пералічваць імёны — бальшыня масыву газэтнае публіцыстыкі рэпрэзэнтуе менавіта такія падыходы.

Самае хуткае й простае тлумачэньне для сябе — мы маем справу з рэцыдывамі марксысцкае сьвядомасьці зь яе эканамічным дэтэрмінізмам. Але ўсе сьветапоглядныя тэзы беларускіх палітолягаў нельга растлумачыць толькі ўжо архаічнай індустрыйнай ідэалёгіяй. Бо палітолягі спасылаюцца на сацыялягічныя выкладкі, на пазытывісцкую інфармацыю.

Вось тут і можна знайсьці разуменьне сюжэту. Пачнем менавіта з антыпазытывісцкага «разуменьня» сэнсу культурна-гістарычных зьяваў і структураў, якое супрацьстаіць пазытывісцкаму «тлумачэньню» сацыяльнай рэальнасьці. Зыходзячы з натуралізму — еднасьці законаў прыроднай і сацыяльна-гістарычнай рэчаіснасьці, і сцыентызму — патрабаваньня таго, каб мэтады сацыяльнага дасьледаваньня былі такімі ж аб'ектыўнымі, як і мэтады вывучэньня прыроды, прыхільнікі «стандартнае канцэпцыі навукі» выкарыстоўваюць у сваім аналізе наступныя, вельмі эфэктыўныя ў беларускай сытуацыі прынцыпы:

— спэцыфіку сацыяльных паводзінаў чалавека яны дасьледуюць толькі празь ягоныя адкрытыя паводзіны;

— навуковасьць паняцьцяў і сьцьверджаньняў усталёўваюць толькі на падставе эмпірычных працэдураў;

— усе сацыяльныя зьявы абавязкова апісваюцца колькасна.

У дачэненьні да беларускіх рэаліяў выкарыстаньне гэтых прынцыпаў дазваляе ствараць стабільна высокія рэйтынгі рэжыму А.Лукашэнкі. Беларускія сацыёлягі, да прыкладу, часта праводзяць тэлефонныя апытаньні. Уявіце сабе сцэнку: да хатняй гаспадыні тэлефануюць незнаёмыя ёй людзі і пытаюцца, як яна ставіцца да палітыкі прэзыдэнта. Што мусіць адказаць залежны ад сацыяльнай палітыкі ўладаў чалавек? Праўда, у названым прыкладзе ёсьць і больш глыбінная аснова — фэномэн улады. Гэта значыць, што бальшыня насельніцтва прыстасоўвацца да ўлады і вонкава зьяўляецца да яе лаяльнаю. Але й гэты фэномэн не трапляе пад увагу сучаснай беларускай паліталёгіі.

Беларуская сацыялягічная школа стварыла ўжо шмат казусаў. Адзін з новых прыкладаў самаабвяржэньня й супярэчнасьцяў сацыялягічных зьвестак у Беларусі можна знайсьці ў інтэрвію з дырэктарам Інстытуту сацыялёгіі Яўгенам Бабосавым у апошнім ЛіМе. Паводле дасьледаваньня, якое правёў інстытут, большасьць насельніцтва краіны ў рознай ступені падтрымлівае палітыку А.Лукашэнкі і ўхваляе прапанаваную ім Канстытуцыю. Гэта кантэкст асноўнай часткі інтэрвію. Але недзе пад канец матэрыялу мы можам знайсьці наступную інфармацыю: на пытаньне «Ці гатовыя Вы прымаць удзел у мітынгах пратэсту супраць палітыкі прэзыдэнта?» станоўча адказалі 24% рэспандэнтаў. Узяць удзел у страйках выказалі гатоўнасьць 18,9%, у галадоўках пратэсту — 7%, ва ўзброеных выступах супраць рэжыму — 6%, у масавых беспарадках — 5%. Гэтыя лічбы павінны прымусіць цалкам зьмяніць альбо ўяўленьні пра беларускую сытуацыю, альбо мэтадалёгію дасьледаваньня. Калі 6% насельніцтва сапраўды гатовыя ўзяцца за зброю, дык які тады павінен быць пляст стыхійна незадаволеных?

Прэтэндуючы на аб'ектыўнасьць ды навуковасьць увогуле, пазытывізм, што ўласьціва менавіта навуковаму пазнаньню, вельмі выразна разьмяжоўвае суб'ект і аб'ект пазнáньня. Але ці можна такі падзел рабіць пры вывучэньні грамадзтва, дзе суб'ект і аб'ект пазнаньня супадаюць? Беларускае грамадзтва, да таго ж, спрабуюць вытлумачыць з дапамогай вельмі недасканалых прыладаў пазытывісцкае сацыялёгіі.

І вось цяпер найгалоўнейшае. Праводзячы эмпірычныя дасьледаваньні й аналізуючы іх вынікі, беларускія сацыёлягі й палітолягі не зважаюць на стратэгічныя працэсы, якія адбываюцца ў Беларусі. Фіксуюцца праблемы й канфрантацыі палітычнага моманту, але ня ўлічваецца, што адначасова адбываюцца працэсы паўставаньня нацыі ды ўзьнікненьня незалежнага ад дзяржавы грамадзтва.

Уся палітыка й сёньня вырашаецца ва ўладных кабінэтах, дзе распрацоўваюцца сцэнары разьвіцьця сытуацыі. Да рэфэрэндуму таму й зьвяртаюцца, каб надаць прынятаму рашэньню відмо легітымнасьці. Сам па сабе рэфэрэндум нічога ня значыць.

Але правілы палітычнай гульні ўжо парушаныя ў саміх уладных кабінэтах. І вось таму значэньне пачынае набываць маладая самасьвядомасьць беларускага грамадзтва й нацыянальная стыхія. Асабліва апошняя не вымяраецца на падставе зьнешніх праяваў паводзінаў і для традыцыйнай сацыялёгіі будзе абсалютна непрадказальнаю. Калі сказаць зусім брутальна — галасы за Лукашэнку нічога ня значаць, бо рэальна ў Беларусі адбываюцца зусім іншыя працэсы, якія зьяўляюцца малацікавымі для вузкага аналізу сёньняшняе палітычнае сытуацыі.

Таму няўвагу да спэцыфікі сацыяльных зьяваў ды абсалютызацыю мэтадаў колькасных навук мы можам акрэсьліць як дагматызм, што апанаваў грамадзкія дысцыпліны ў Беларусі.

Алег Дзярновіч

Пацалунак з нафтаю на вуснах

У Беларусі паклалі новую трубу. Па гэтай трубе з Расеі ў Польшчу пойдзе газ. Так званы «залаты» стык транскантынэнтальнага газаправоду «Ямал — Эўропа» пад лабызаньні Лукашэнкі з расейскімі «газпрамаўцамі» адбыўся каля маленькага мястэчка Збочна паблізу Слоніма.

Для Расеі, якая ўжо сёньня мае магчымасьць перакачваць празь Беларусь 55 мільярдаў кубамэтраў газу, зь якіх 13-14 мільярдаў распускаецца па нашай краіне, гэты праект — адзін з самых істотных і ў эканамічным, і ў геапалітычным сэнсе. Частка газу, а ў пэрспэктыве і нафты, пойдзе ў Нямеччыну і Польшчу. Расея не губляе надзеі, што па яе энэргарэсурсы могуць зьвярнуцца і іншыя спажыўцы. Аднак на сёньня іх не знаходзіцца. Нават краіны Балтыі і Ўкраіна не сьпяшаюцца складаць усе яйкі ў адзіны кошык. Што да Эўропы... Для Нямеччыны расейская нафта і газ складаюць толькі 12 працэнтаў ад рэсурсаў, якія яна імпартуе. Астатняя Эўропа тым часам шукае больш надзейных і прадказальных кампаньёнаў.

«Газанафтавыя» краіны экс-СССР становяцца ўсё больш прывабнымі для эўрапейскіх інвэстараў. Распрацоўваюцца альтэрнатыўныя шляхі транспартоўкі энэргарэсурсаў у абыход Расеі і яе хворага сатэліта. Адзін зь іх — так званы Эўра-Азіяцкі калідор — праз Азэрбайджан і Грузію. Першая партыя нафты з казахстанскага радовішча Тэнгіз, якое распрацоўваецца з удзелам кампаніі Chevron, два тыдні таму ўжо паступіла ў Баку. Эўрапейцы не хаваюць сваёй зацікаўленасьці ў калясальных рэсурсах Цэнтральнай Азіі і Закаўказьзя, якія ў наступным стагодзьдзі радыкальна могуць зьмяніць рынак энэргарэсурсаў у сьвеце.

Прэзідэнт Chevron сп. Мацке на днях у Тбілісі адзначыў, што Казахскі нафтавы кансорцыюм не дапусьціць аніякіх перавагаў Расеі перад Грузіяй і Азэрбайджанам. Звыш таго, сп. Мацке пераканаваны, што транспарт праз Расею немэтазгодны з прычыны прымітыўных тэхналёгіяў і нізкай прапушчальнай магчымасьці рассійскіх трубаправодаў, якія ўдвая менш могуць прапускаць нафты, чым новыя трубаправоды Chevron у Азэрбайджане і Грузіі, празь якія ў Эўропу пойдзе 6 мільёнаў тон казахскае нафты ў год. Апроч таго, прэзыдэнт Chevron заўважыў, што Захад мае стратэгічныя інтарэсы ў Грузіі, і разам з амэрыканскімі кампаніямі ён не пашкадуе сілаў для прыцягненьня сюды іншых буйных інвэстараў.

Дарэчы, разам з сп. Мацке, у Грузію прыбыў дырэктарат General Motors. General Motors зьбіраецца сур'ёзна заняцца мадэрнізацыяй грузінскага машынабудаваньня. А ўжо сёньня гэтая буйнейшая амэрыканская каманія заказала спэцыяльны дакумэнтальны фільм пра Грузію (коштам 100 тыс. USD). Гэтую стужку будуць дэманстраваць з наступнага месяца пад патранажам General Motors у амэрыканскім тэлебачаньні, заклікаючы сур'ёзных інвэстараў.

Калі праект Эўра-Азіяцкага калідору будзе завершаны, на Каўказе паміж Эўропаю і Азіяй будзе створана цэлая сыстэма транзыту і новы эканамічны арэал.

Заўважым, што з гэтай сыстэмай не зьвязаная Арменія. У вачах Захаду, нягледзячы на напорыстае лобі, яна застаецца краінай-агрэсарам, прамаскоўскі і недэмакратычны курс якой стаў зусім відавочным пасьля апошніх прэзыдэнцкіх выбараў у Ерэване. Ад тых, каго падазраюць у фальсыфікацыях, хто страляе ў апазыцыю, нармальныя людзі імкнуцца трымацца далей. А таму Арменія ўдзельнічае ў праекце «Ямал-Эўропа» разам зь Беларусяй і Расеяй. Гэты праект дасьць працу двум тысячам спэцыялістаў з Расеі, Арменіі і Беларусі, пра што бравурна адрапартавала «Рэспубліка». Калі параўнаць тэмпы росту беспрацоўя ў гэтых трох краінах з гэтай лічбаю, то давядзецца толькі ўсьміхнуцца на самоце.

Ідэя Chevron пра стварэньне новага эканамічнага калідору атрымала гарачую падтрымку прэзыдэнта Казахстану Назарбаева, які рашуча заявіў, што ягоная краіна мае патрэбу ў альтэрнатыўных шляхах экспарту сыравіны і прадукцыі на Захад.

Цікава, што ў гэтыя ж кастрычніцкія дні Тбілісі і Баку наведаў міністар замежных справаў Францыі Эрвэ дэ Шарэт. Міністру, паводле ягоных словаў, удалося заручыцца абавязацельствам прэзыдэнта Гейдара Аліева, што французкі канцэрн «Эльф-Акітэн» таксама зможа прыняць удзел ў геалягічна-пашуковых і здабыўчых працах у Азэрбайджане. У Грузіі французкія прадпрыемствы разьлічваюць атрымаць кантракты на пастаўку сыстэмаў кантролю за паветранымі зносінамі і абсталяваньня для ачышчэньня вады. Каўказ, як адзначыў дэ Шарэт, мае стратэгічнае значэньне для Францыі. Паводле ягоных словаў, на Каўказе і ў раёне Касыпія разьвернецца «баталія за будучыя працоўныя месцы для французкай моладзі».

Пакет дамоваў з Францыяй, які прывез Лукашэнка, відавочна не натхняе Парыж. Як гавораць на Каўказе, «колькі ні крычы «Халва! Халва!» — у роце салодка ня стане». Маргінальны амбіцыйны банапарцік, які раўняецца на паўнамоцтвы французскіх прэзыдэнтаў, — не навіна для французскай дыпляматыі, якая мае досьвед і ў Афрыцы, і ў Азіі. А эканамічна той лапік Эўропы, які завецца Беларусь, разглядаецца як кур'ёзная паталёгія.

За эканамічнымі інтарэсамі пасыпаюць і палітычныя ініцыятывы. З ініцыятывы Францыі створана група «сяброў Грузіі» для вырашэньня праблемаў Абхазіі. У яе, апроч сталых удзельнікаў СБ ААН, уваходзіць і Нямеччына. Са словаў лэ Шарэта, Францыі даводзіцца даганяць на Каўказе ЗША, Вялікабрытанію і Нарвэгію, якія своечасова разгледзелі значнасьць гэтага рэгіёну. Пра краіны СНГ тут гутарка нават і ня йшла.

У сваю чаргу, Лукашэнка, матывуючы татальную арыентацыю на расейскі паліўна-энэргетычны комплекс, заявіў, што эканамічная бясьпека Беларусі наўпрост залежыць ад паставак паліва з Расеі! Бясьпека ад каго?.. Зрэшты, Лукашэнку можна зразумець — Чарнамырдзін ужо стукнуў кулаком па стале. Запазычанасьць Беларусі расейскай энэргасыстэме склала на пачатку кастрычніка 7 млрд. БРБ! Магчымасьці заплаціць па рахунках болей не застаецца. Вось і даводзіцца Лукашэнку асабіста прысутнічаць на шоў у Збочне са зваркамі, стыкамі, трубамі... Цалаваць, абдымацца і бажыцца. А то з Усходу могуць прыйсьці і іншыя палітычныя ініцыятывы.

Сяргей Баркоўскі

"Наша Ніва" незалежны тыднёвік

НАША НІВА

заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991

заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Таццяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)

АДРАС ДЛЯ ДАПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі перыёдычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

Праекалі
Разрадкі не было...

Андрэй Мыш

19-га кастрычніка я прыехаў у Менск за пазычаныя грошы, другі раз у жыцьці і не ўяўляў сабе нават, куды ісьці. А ехаў, каб паўдзельнічаць у «беларускай рэвалюцыі»... Насуперак усяму.

З інстытуту вырваўся ледзьледзь. Як вядома, наладзілі кантроль. Я сказаў, што на вясельле... Калі набыў квіток, то ўбачыў, што вяртацца ня будзе за што...

Настрой быў жудасны: што я тут раблю? Куды ісьці?.. Цэлы дзень на нагах. У страўніку толькі два яблыкі...

На Нямізе — двухсотмэтровы ланцуг амону. Усё нагадвае здымкі фільма «пра вайну». Як добра бачная «дзяржава ў дзяржаве»!

А з другога боку... быццам барбары захапілі нашую краіну, абгарадзіліся вайскоўцамі й сьвяткуюць перамогу — ядуць, п'юць... Цырк прыехаў. Калі б не БТРы...

А як эмацыйна віталі людзі дэлегатаў!.. Няўжо тыя нават не засаромеліся? Я б даўно ўжо — скрозь зямлю...

Разрадкі не было! Я прыехаў — і ўсё спакойна. Затое ўбачыў усю гэтую «кухню».

Усё, што нагадвала пра сур'ёзнасьць падзеі: замежныя карэспандэнты, войска і велізарны натоўп, зь якім раіліся такія людзі як Багданкевіч, Хадыка зь Беленькім, Голубеў, Бухвостаў, Карпенка, Захаранка і іншыя.

Яшчэ на свае вочы пабачыў спадара Грыба, які цёпла вітаў шэсьце.

Вось такія справы. Напрыканцы крыху паштурхаліся зь міліцыяй ды сфатаграфаваліся (ня памятаю, на жаль, зь якога выданьня была тая Кэрал)...

Магілёў

Пераступіць Мяжу

Севярын Квяткоўскі

Малады Баец ня мае досьведу бруду, ён ня ведае войска, ён — індывідуаліст. Перад забойствам першай ахвяры МБ уяўляе зь сябе згустак рамантызму, сьветлага й злога адначасова. Толькі адзіны з тысячы МБ пераступае мяжу Сьмерці. Па той бок мяжы, якой трызьніць ці ня кожны малады, нараджаецца Жаўнер. Жаўнеры і Войска — непрымальныя для Маладых Байцоў. Але, яны трызьняць Мяжой...

19 кастрычніка багата менскіх рамантыкаў апынулася на вуліцах роднага гораду ў пошуках знакаў, што сьведчаць аб пачатку дзеяньня. Яны шукалі Мяжу, а знайшлі ўвасабленьне мроі аб СВАІМ горадзе. Седзячы ў адной з кавярняў Траецкага, цяжка было ўявіць, што ўжо ўвечары яно згубіць іррэальную атмасфэру Беларускага Места Пад Акупацыяй. Наўкола гучала выкшталцоная беларуская мова, наведнікі — скрозь літаратары, журналісты, мастакі, музыкі... Непрымусовыя размовы, жарты, і зацкаваныя позіркі людзей ва ўніформе, якія зрэдку спрабавалі пагрэцца ў кавярні, але адразу ж сьпяшаліся незаўважна прасьлізнуць на двор, да сваёй тэхнікі, шчытоў і супрацьгазаў. Туды, дзе яны могуць пазьбегнуць позірку Маладога Байца, які стаіўся ў самым далёкім кутку кавярні. У той дзень Баец не знайшоў патрэбных знакаў. Ён убачыў рэальнасьць — уласную адзіноту. Ён зьведаў адчуваньне, што даецца ня кожнаму: ён УБАЧЫЎ сябе. Баец зразумеў, што, забіўшы ў гэты дзень «свайго араба», ён адно павялічыў бы адзіноту. Ня важна як прарэагаваў бы нешматлікі пераляканы натоўп, крыкам нянавісьці, ці крыкам радасьці... Натоўп мог змаўчаць. Беларусь пакуль ня мае сваіх Жаўнераў. Пераступіць Мяжу, пераўтварыцца ў Жаўнера — значыць ахвяраваць сябе. Цяпер беларускія Маладыя Байцы маюць больш важкі іспыт, чым вясною. Яны гатовыя да бруду, які паўстаў з маладосьці іхніх дзядоў. Іхні рамантызм зьнікае пад дулам аўтамата. Ён пакідае адно колькі пытаньняў, кожнае зь якіх пачынаецца словамі: «ці варта?» Пакуль нашыя Байцы маюць крыху часу, каб адказаць на свае пытаньні. Пакуль яны працягваюць трызьніць...

Той, хто трызьніць Сьмерцю, ня можа стацца забойцам, але, той, хто трызьніць Сьмерцю, не дазволіць забіць сябе. 19 кастрычніка адзіны з тысячы Малады Баец пазбавіўся мрояў.

Менск

Да Адамовіча

Ганна Матусэвіч

19 кастрычніка я не паехала ў Менск пад кулі снайпэраў, а махнула ў слаўнае места Віцебск, бо там сядзіць паэт Славамір Адамовіч.

Ёкнула маё сэрца, калі ўбачыла каля турэмнай агароджы доўгую брудную сьцяну дрэваў. Адчыніла прапускнік — казённая маладая мордачка выдала мне казённую адмову. І паўтарыла яе пасьля, калі я ўсё ж стаяла нерухома. Ляпнула наглуха засоўка. Не станавіцца ж на калені перад глухой сьцяной!

Я выйшла і доўга стаяла ў роздуме перад брунатнай сьцяной дрэваў сьпіной да змрочнай будыніны СІЗО. Завярнулі ў прапускнік два маладыя чыны. Надта ж самаўпэўненая, спрытнюшчая ў іх хада! У такіх і туману ня выпрасіш, хоць віцебскі туман працінаў мяне наскрозь сваёй зольлю. Я рушыла ў бок Смаленскага кірмашу...

Чарнец прызначыў мне спатканьне а 9-ай гадзіне на гэтым жа пляцы. Гадзіны са дзьве калела на ўшчэнт заплёваным аўтобусным прыпынку. Пасьля пабрыла на пляц. Ён ужо чакаў мяне. Я ўклала ў ягоныя чорныя рукі торбу з салам, цыбуляй, часныком, журавінамі, яблыкамі, морквай; цэляфанавы мяшок з прэсай, гарбатай ды завязаным у насоўку крыжыкам. Ён папытаўся, ці верыць мой каханак у Бога. Я адказала, што ня верыць ён, ды веру я, і што так патрэбна Богу. (А на ўласнай шыі крыжыка я ніколі не насіла). Асобна падала тоўстую капэрту. Папярэдзіла, што гэтая рэч — самая галоўная. Бухнула 200.000. Запісала ягоны адрас, паабяцаўшы прыслаць грошы яшчэ, калі толькі дачуюся, што даставіць дачку (Славамірава слова) у месца. На разьвітаньне паціснула руку і паабяцала чарняцу месца ў раі, як некалі Хрыстос ўкрыжаванаму побач з сабой разбойніку.

Дарэшты змучаная, зьнясіленая, вярталася я ў Койданава.

Суцэльнай бясконцай дарогай плакаў дождж. Шэрым покрывам навісаў туман. І толькі разпораз — як фіранкі ў чорным вакне, што быццам разгойдваліся ветрам, і тады відаць была пазалота яснага дня ды белыя ваконныя рамы — гэтак мільгалі раптоўнай радасьцяй жоўтыя беластвольныя бярозкі сярод восеньскай аднастайнай шэрасьці...

Каля сьцяны...

З усіх вядомых шляхоў не заўсёды тэрба выбіраць найкарацейшыя. Мой, напрыклад, найкарацейшы шлях на працу праходзіць пад сьценамі Валадаркі. Былы Пішчалаўскі замак, потым завод, цяпер — «установа УЖ-15/ІЗ-1» у афіцыйных паперах. А ў народзе —проста Валадарка. Зь вялікімі сьценамі, за якімі можа апынуцца кожны. Ня толькі «крымінальнікі». Палітвязьні з УНА-УНСО сядзяць менавіта на Валадарцы.

Ля сьценаў Валадаркі ўзьнікае падсьвядомае жаданьне — хутчэй іх абмінуць. Быццам прадчуваеш, што хутка можаш убачыць гэтыя сьцены з адваротнага боку. Ты знаходзісься ў іншым сьвеце, іншым грамадзтве, але па гэты бок сьцяны ты — толькі фармальна. Між тымі, хто па гэты бок, і тымі, хто па той, розьніца невялікая і вельмі хісткая. Розніцы амаль няма.

Адзінае месца ў Менску, дзе людзі ёсьць заўсёды — гэта пад сьценамі Валадаркі. Чарга на наступны дзень складаецца прыкладна а 17 гадзіне ў дзьвюх сьпісах — на спатканьне і на перадачы. Хтосьці абавязкова трымае гэтыя сьпісы і для цябе: каб ты і такія, як ты, маглі запісацца нават уначы. Кажуць, што раней сьпісы былі непатрэбныя, бо за дзень было 5-8 наведнікаў. Сёньня ў сьпісах чалавек 80-100. Узьнікае ўражаньне, што «сядзіць» палова краіны. Адразу прыгадваецца: «Краіна ў кратах».

Увечары, у цемры, падыходзіш да сьцяны, запісваесься куды табе трэба, садаеш на лаву (пакуль што не падсудных — па гэты бок сьцяны), размаўляеш і чакаеш сяброў. Ноч сьветлая і халодная, зоркі, як вочы ваўкоў, глядзяць на цябе з паразуменьнем — ты тут сам на-сам зь імі.

Зусім няважна, хто ты, да каго ты прыйшоў, да крымінальных або палітычных. Тут усе па адной справе і вы ўсе людзі. Зоры-ваўкі, начныя ліхтары, пустая вуліца імя Валадарскага (дарэчы, хто ён быў такі?), і Бог (ты спадзяесься) з табою. Сяброў ты дачакаўся, яны прынесьлі гарэлку і ты п'еш — за тую свабоду, якая пакуль што належыць табе, але ўжо не належыць тым, хто за сьцяной. І жадаеш свабоды ўсім: палітвязьням, злодзеям, забойцам. Сьцены турмы разам з табою паглынаюць гарэлку. Бо ты (як, дарэчы, і яны) ужо цалкам зьмерз за гадзіну чаканьня. А камусьці тут сядзець усю ноч. Калі пашанцуе — у машыне, калі не — на той лаве, на якой сядзіш ты.

На наступны дзень трэба падысьці сюды а 6-й гадзіне раніцы. Спраўдзіць, ці ня зьніклі куды-небудзь сьпісы і тваё прозьвішча ў іх. Потым чакаеш у чарзе і зьдзіўляесься. Большасьць тых, хто чакае — жанчыны. Гэта зразумела: жанчыны тут маюць перавагу і на спатканьне ідуць першымі. Палова жанчын — маладыя, некаторыя яшчэ бяруць з сабою дзяцей гадоў да 7-мі. Дзеці, якіх паднялі а пятай раніцы, трываюць чаканьне ня менш мужна за бацькоў. Тры разы я быў зранку на Валадарцы і ня чуў, каб нехта зь дзяцей плакаў.

Адвакаты таксама чакаюць у чарзе, каб наведаць сваіх кліентаў.

У другі ці трэці раз ужо не адчуваеш таго хваляваньня, зь якім прыходзіў упершыню. Ты ўжо свой тут. Ужо ведаеш, што і як рабіць, што казаць. Першыя тры месцы ў чарзе заўсёды пакідаюцца для тых, хто начаваў пад сьценамі турмы са сьпісамі. Заяву на перадачу можна пісаць у адным асобніку, а ня ў двух, як таго патрабуе шыльдачка. Цыгарэты можна перадаць у блёку і можна зь фільтрам (у адрозьненьне ад «Прылукаў»). Рэчы перадаюцца толькі цёмнага колеру і ў вагу перадачы (8 кг у месяц) не ўваходзяць. І яшчэ шмат-шмат таго, пра што «звычайныя» грамадзяне ня ведаюць. Ты ўжо свой тут — пад сьценамі.

Нарэшце ты выканаеш даручаную табе справу. Усё ў былым —чаканьне, зоркі, ліхтары, людзі, якія ўчора стаялі там з табою... Але іншыя людзі стаяць там сёньня і будуць стаяць заўтра.

Цяпер ты маеш поўнае права выпіць — за тых, хто там, за тых, хто тут і за свабоду і першых, і другіх. Але заўсёды памятаеш — наступная сустрэча з гэтымі сьценамі празь месяц. Зноўку чакаеш.

Я дзякую ўсім тым, хто адгукнуўся і адгукаецца сёньня на заклік дапамагчы палітычным вязьням - украінцам. Дзякуй ад нас, ад адвакатаў, ад палітвязьняў і ад Украіны. Калі гэты рэжым сканае, мы аддзячым вам ня толькі на словах.

Сяргей Пульша

Здымак Міхала Баразны.

Вітаўтас Ландсбэргіс:

«Нашыя дачыненьні ня ў лепшым стане»

Працяг са старонкі 1.

Гэта абумоўлена ў пэўнай ступені й даволі цяжкай эканамічнай сытуацыяй у краіне, таму я маю падставы сцьвярджаць, што сёлета парлямэнцкія выбары прайшлі ў пэўнай ступені па-за ўплывам сродкаў масавай інфармацыі.

«НН»: Летась, калі Ваша партыя са значнай перавагай перамагала на выбарах у мясцовыя органы самакіраваньня, для большасьці аналітыкаў гэтая перамога была нечаканай. І тады многія казалі пра тое, што Літоўская Дэмакратычная партыя Працы па-просту наўмысна прайграла менш істотны бой дзеля таго, каб мець рэальны шанец узяць рэванш на выбарах у Сэйм...

В.Л.: Вы маеце рацыю. У той час гэтае меркаваньне было пашыранае сярод пэўнай часткі людзей. І экс-камуністы прыклалі ўсе намаганьні для таго, каб дыскрэдытаваць мясцовыя органы самакіраваньня, і гэтым самым нажыць сабе палітычную выгаду. Урад, які тады ўзначальваў Адолфас Шляжавічус, не пералічваў у мясцовыя бюджэты грошы, прадугледжаныя законам. Былі нярэдкімі выпадкі ціску на мэраў гарадоў, якія зьяўляліся сябрамі нашай партыі. Гэтая тактыка нічога добрага ня дала ані грамадзянам, ані ўраду, ані тым больш ЛДПП. Не касіра трэба вінаваціць у тым, што каса завода пустая. Касір толькі адлічвае грошы, выдзеленыя на заработную плату рабочым. ЛДПП сыходзіць з таго, чаму дзеячы гэтай партыі навучыліся ў СССРаўскім мінулым — з прызнаньня выключнай і нават прымусовай ролі дзяржавы ва ўсіх сфэрах жыцьця. Мы ж, кансэрватары, імкнемся вызваліць людзкую ініцыятыву.

«НН»: Апошнім часам у Літве актывізаваліся разнастайныя палітычныя, каляпалітычныя й проста бандыцкія групоўкі ультраправага кірунку. З чым Вы гэта зьвязваеце?

В.Л.: Сапраўды, такія групоўкі йснуюць, як існуюць яны ў большасьці краінаў Эўропы. Звычайна яны стаяць на службе ўрадаў прасацыялістычнай арыентацыі. Гэтых людзей, часьцей за ўсё бязь іх ведама, выкарыстоўваюць пэўныя колы дзеля навешваньня пэтлікаў на сваіх палітычных праціўнікаў, якіх бывае цяжка перамагчы ў сумленнай барацьбе. Нярэдкія выпадкі, калі сябры арганізацыяў ультраправага кшталту працуюць на спэцслужбы варожых дзяржаваў. Наша ж партыя адназначна нэгатыўна ставіцца да дзейнасьці падобных арганізацыяў, і вельмі часта мы самі перадаем гэтых правакатараў у рукі ўладаў.

«НН»: У які бок, на Вашу думку, зьменяцца міждзяржаўныя дачыненьні паміж Літвой і Беларусяй з прыходам новага ўраду?

В.Л.: Калі ў нас хопіць сілаў у Сэйме, каб сфармаваць новы ўрад, то ніякіх асаблівых зьменаў у зьнешняй палітыцы Літоўскай Рэспублікі наогул, і ў дачыненьнях зь Беларусяй, ў прыватнасьці, не адбудзецца. Мы будзем будаваць нашыя ўзаемаадносіны з кіраўніком выканаўчай ўлады Рэспублікі Беларусі. Сёньня, чыста з прагматычных інтарэсаў, мы ня можам пайсьці на разрыў адносінаў зь Беларусяй. Але ў той жа момант нашыя сымпатыі на баку беларускага дэмакратычнага руху, і мы будзем імкнуцца пашырыць нашы міжпартыйныя й міжпарлямэнцкія дачыненьні, якія сёньня далёка ня ў лепшым стане.

Што да беларускай дыяспары ў Літве, то сёлета, 1-га верасьня я прысутнічаў на сьвяце пачатку навучальнага году ў Віленскай беларускай гімназіі. І я ганаруся тым, што ў нашай краіне беларусы маюць права атрымаць поўную адукацыю на беларускай мове. І забараніць рабіць гэта беларусам ніхто ня мае маральнага права.

На вялікі жаль, на пачатку 90-х гадоў дачыненьні паміж нашымі краінамі былі азмрочаныя непаразуменьнямі, якія ўзьнікалі з таго, што некаторыя партыі ў Беларусі пачалі выстаўляць літоўскаму боку тэрытарыяльныя прэтэнзіі. Савецкім ідэолягам было выгадна пасварыць адвечных суседзяў, спадкаемцаў аднае дзяржавы. На шчасьце, гэты экспэрымэнт не атрымаўся, і я з надзеяй гляджу на пэрспэктывы разьвіцьця нашых краінаў.

Вітаўтас Ландсбэргіс. Нарадзіўся 18 кастрычніка 1932 г. у Коўне. Бацька — Вітаўтас Ландсбэргіс-Жамкальніс, слынны літоўскі архітэктар, аўтар праекту рэканструкцыі Катэдральнага пляцу ў Вільні, сябра Часовага Ўраду Літоўскай Рэспублікі (1941), які пасьля быў распушчаны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі.
Вітаўтас Ландсбэргіс — піяніст, музыказнаўца, гісторык мастацтва й культуры. Доўгі час выкладаў у Віленскім Пэдагагічным Інстытуце й Віленскай Кансэрваторыі. Аўтар 8 манаграфіяў пра творчасьць М.К.Чурлёніса.
У 1988-90 гадах сябра ініцыятыўнай групы «Саюдзіса», старшыня камісіі па ахове помнікаў культуры.
У 1989 годзе быў абраны народным дэпутатам СССР.
У 1990-92 Страшныя Вярхоўнай Рады Літоўскай Рэспублікі (Сэйму).
З 1992-га да 1996 году лідар правай апазыцыі ў Сэйме, старшыня партыі «Тэвінес Саюнга» («Саюз Айчыны») (кансэрватары Літвы).
Доктар Honoris Causa Чыкагскага Каталіцкага Ўнівэрсытэту Ігнацыя Лаёлы й Ордэна Ўэбэра, а таксама Ковенскага ўнівэрсытэту імя Вітаўта Вялікага.

На выбарах у літоўскі Сэйм перамагла партыя кансэрватараў. Яе лідар Вітаўтас Ландсбэргіс лічыцца самым антырасейскім палітыкам Эўропы. Ягоныя палымяныя прамовы і ініцыятывы ў Радзе Эўропы сапсавалі шмат крыві расейскім дыпляматам.

Ландсбэргіс — адзін з самых ненавісных палітыкаў для савет-рэваншыстаў. Ён жывы сымбаль бескампраміснай барацьбы з камунізмам і савецкай акупацыяй. Ён жывы сымбаль рашучага разрыву зь мінулым. У адрозьненьне ад шматлікіх беларускіх, украінскіх, расейскіх і польскіх палітыкаў-дэмакратаў, Ландсбэргіс ніколі не адмаўляўся ад сваіх прынцыпаў і ня браў на ўзбраеньне папулісцкіх, палавінчатых лёзунгаў.

Чакаецца (і гэтага асабліва баяцца расейцы), што новы Сэйм, большасьць у якім будзе належаць кансэрватарам, хрысьціянскім дэмакратам і цэнтрыстам, паспрыяе прыняцьцю рашэньня аб прызнаньні Літвой незалежнасьці Чачэніі.

У 1991 годзе, калі Ландсбэргіс быў Старшынём Вярхоўнай Рады, незалежную Літву спачатку прызнала толькі маленькая Ісьляндыя, што выклікала бурную, аж да разрыву дыпляматычных зносінаў, рэакцыю Масквы. Ісьляндыя моцна падтрымала Літву маральна. Літве тады было вельмі цяжка ў абцугах расейскай эканамічнай блякады і пад рулямі калябарантаў і салдат генэрала Ўсхопчыка.

Цяпер менавіта прадстаўнікі Літвы разам з украінцамі, палякамі, латышамі і эстонцамі найбольш настойвалі на ўвязцы прыёму Расеі ў склад Рады Эўропы з вызваленьнем Чачэніі.

Вяртаньне посткамуністаў да ўлады ва Ўсходняй Эўропе пачалося зь Літвы, калі патрыятычны, свойскі і прасьцецкі Бразаўскас перамог на першых прэзыдэнцкіх выбарах кандыдата ад апазыцыі, эмігранта.

Зьмены ў партыйнай плыняформе Дэмакратычнай партыі Працы сталі ўзорнымі для іншых посткамуністычных партыяў нашага рэгіёну Эўропы. Тым жа шляхам і з тым жа посьпехам пайшлі Дэмакратычная лявіца ў Польшчы, сацыялісты ў Вугоршчыне, папулісты ў Славаччыне, Кучма ва Ўкраіне, сацыялісты ў Баўгарыі. Камуністы ў Расеі захавалі вернасьць прынцыпам і прайгралі.

Міжнародны каментар

Дажыць да постхамунізму

У Беларусі, разрываная антаганізмамі, цяжка нават зразумець, чым адрозьніваюцца праграмы левых і правых у суседніх краінах. І тыя, і другія за рынкавы капіталізм. І тыя, і другія за ўваходжаньне ў NATO. І тыя, і другія за строгую павагу да Канстытуцыі. Левыя традыцыйна больш абяцаюць і больш забіраюць у тых, хто працуе, на карысьць тых, хто супрацоўнічае. Але халера іх разьбярэ, хто лявейшы, Квасьнеўскі ці Валэнса. Газэта «Товарищ» магла б ахарактарызаваць першага як «стаўленіка буйнога нацыянальнага капіталу», а другога як кандыдата «дробнай буржуазіі і клерыкалаў».

Лягічна меркаваць, што посьпех «новых правых» у Літве стане першай прыкметай таго, што ківач палітычных прыхільнасьцяў на постсавецкіх абшарах нарэшце кульнецца направа, адхіляючы ад улады памяркоўна левых і выкідаючы за борт палітыкі балбатуноў-папулістаў.

Відавочна таксама, што пагроза Масквы прыняць «адэкватныя захады» ў выпадку пашырэньня NATO на Ўсход, могуць мець адзін вынік: дзяржавы, супраць якіх скіраваныя гэтыя захады, яшчэ больш пераконваюцца ў неабходнасьці далучэньня да эўрапейскіх абарончых структураў.

І яшчэ адна важная відавочнасьць: толькі ў лічаных краінах Усходняй Эўропы хамунізм прайшоў на зьмену камунізму. Яшчэ некалькі гадоў назад пра трыюмф Хама з трывогай пісалі Славамір Мрожак і «Наша Ніва». Сёньня нават у тых краінах, дзе хамунякі заўсёды былі ў пашане, яны вымушаныя пераходзіць у глухую абарону.

Галоўным, гістарычным ворагам кансэрватараў заўсёды быў перш за ўсё ня ўласна камунізм, сацыялізм, лібэралізм ці папулізм, а любыя праявы, любая сыстэма, што абуджаюць красамоўства Хама, безаблічнай народнай масы, грознай і беспакорнай. Пра гэтую «масу», як самую страшную зьяву індустрыйнага грамадзтва, зь якой вырастаюць таталітарныя ідэалёгіі, пісалі Бёрк, Артэга-і-Гасэт, Арэнт. Упершыню хама ўзьвялічыла, а арыстакратыю стаптала Французская рэвалюцыя.

Рэвалюцыі ажыццяўляе інтэлігенцыя. З рэвалюцыяў скарыстоўваюць хамунякі. Так было і ў нас.

Нянавісьць да незразумелай хаму культуры, да недасягальнага яму ладу мысьленьня і жыцьця выкарыстоўваюць безадказныя палітыкі-хамы. Яны падштурхоўваюць свайго брата да рэваншу за комплексы ўласнай бескультурнасьці.

У Беларусі Хаму жывецца прывольна. Ён можа перад тэлекамэрай парваць акрэдытацыйнае пасьведчаньне журналіста. Ён можа лаяць матам дэманстрантаў з-за сьпінаў міліцыянтаў. Ён можа забараніць студэнтам філфаку пісаць дыплём па-беларуску: «Вы же учитесь на русском отделении или вы тоже националистка?» Ён можа ўголас разважаць у электрычцы, што «вот цяпер, калі Лукашэнка возьме ўсю ўласьць, мы ўжо ў гэтых жыдоў катэджы пазабіраем». Ён можа па ўсіх каналах тэлебачаньня разважаць пра шкодніцтва «всякіх там гілевічэй».

У Літве хамунякі ня ў модзе. Там перамагаюць выкладчыкі музыкі.

Грамадзтву добра тады, калі хаму цяжка. Ці хутка і мы дажывем да постхамунізму?

Андрэй Дынько

Трагедыя ў Бэльгійскім Каралеўстве

У мінулую нядзелю ў сталіцы Бэльгіі Брусэлі адбылася масавая дэманстрацыя, у якой узялі ўдзел болей за 100 тыс. чалавек. Нагодай для дэманстрацыі паслужыла нядаўняе забойства дзьвюх маленькіх дзяўчынак пэдафілам-маньякам. Падчас вулічнага шэсьця ўдзельнікі вельмі эмацыйна выказвалі свой пратэст супраць карумпаванасьці і некампэтэнтнасьці ўладаў, што выявіліся ў выніку расьсьледаваньня гэтай справы. Нават бэльгійскі манарх, каб супакоіць сваіх вернападданых, вымушаны быў зьвярнуцца праз агульнанацыянальную тэлевізію з адмысловай заявай.

Калі перафразаваць Шэкспіра, то нешта прагніла ў Бэльгійскім Каралеўстве. Апошнім часам у тутэйшых сродах масавай інфармацыі ўсё часьцей зьяўляюцца аповеды пра палітычную карупцыю, пра выкраданьне людзей з мэтай выкупу, дзіцячы сэкс, заказныя забойствы ды пакрыцьцё злачынстваў паліцыяй. Таму ня дзіва, што насельніцтва краіны губляе давер да ўраду ды розных інстытутаў грамадзтва. Недзе ў Вялікабрытаніі ці Францыі такое яшчэ можна было б зразумець. Але ж Бэльгія — маленькая ўтульная краіна з колькасьцю насельніцтва, што ледзь дацягвае да 10 млн. чалавек — здаўна лічылася адной з самых спакойных ды камфартабэльных краінаў Эўропы.

Падобна на тое, што Бэльгія апынулася ў ліку першых невялікіх краінаў Эўропы, што пачынаюць зьведваць некаторыя адмоўныя наступствы свайго растварэньня ў агульнаэўрапейскім плавільным катле Эўрапейскай Садружнасьці. Зьнікненьне межаў паспрыяла вольнаму перасоўваньню ня толькі тавараў ды турыстаў, але й злачынцаў. Апроч таго, урад Бэльгіі сёньня больш заклапочаны тым, як дагадзіць агульнаэўрапейскім бюракратам дзеля найхутчэйшага ўваходжаньня ў адзіную валютную ды мытную прастору. Для хатніх праблемаў ужо не хапае ані часу, ані волі.

За мінулыя месяцы ў краіне адбыліся настолькі экстраардынарныя падзеі, што нават былы прэм'ер-міністар Бэльгіі Вільфрад Марцінэ заявіў, што ягоная радзіма валіцца ў бездань. Зь ягоных словаў, гэта выражаецца ў першую чаргу ў маральным стане грамадзтва.

Найпершы прыклад — жнівеньскія падзеі вакол выкрыцьця злачынстваў мясцовага пэдафіла Марка Дзю Тру. Спакойныя і абыякавыя бэльгійцы гатовыя былі на часткі парваць злачынцу пасьля таго, як паліцыя знайшла пры доме забойцы закапаныя трупы замучаных ім васьмігадовых дзяўчынак. Некалькімі днямі раней улады здолелі вызваліць дзьвюх яшчэ жывых дзяўчынак, якіх пэдафіл трымаў пад замком. Пасьля злачынца паказаў месца, дзе закапаў яшчэ дзьвюх раней забітых ім дзяўчынак.

Пахаваньне няшчасных ахвяраў выклікала нацыянальную жалобу. Людзі пачалі задаваць пытаньне: як такое ўвогуле магло адбыцца ў Бэльгіі? А тут яшчэ стала вядома пра саўдзел некаторых дэтэктываў паліцыі, што прыкрылі забойцу. Бо за два гады да таго Дзю Тру ўжо праходзіў па справе ўгону аўтамабіля, дзе былі замяшаныя паліцэйскія чыны. Апроч таго, паліцыя ведала пра вычварную неабыякавасьць Дзю Тру да дзяцей. Але злачынец адкруціўся і працягваў сваю чорную справу. Людзей абурае тое, што, нягледзячы на інфармаванасьць уладаў, судовая сыстэма ніяк не адрэагавала на гэта. Адразу пасьля інфармацыі пра зьнікненьне першых дзяўчынак паліцыя пачала пошукі Дзю Тру, але зь іншых прычынаў. Пры гэтым нічога не было паведамлена судовым органам і пракуратуры. Існуе меркаваньне, што паліцыянты імкнуліся самі разабрацца з «сваім чалавекам», каб не падстаўляць зьвязаных зь ім чыноў.

Прадстаўнік Бэльгійскага цэнтру палітычных дасьледаваньняў Серж Гавэц лічыць, што ўсё гэта сымптомы аднае хваробы. Часам здараецца так, што паліцыянт расьследуе злачынства, у якім сам жа й быў замяшаны. Натуральна, што хаўрусьнікі пастараюцца прыкрыць адзін аднаго. С.Гавэц лічыць, што ўсё гэта вынік таго, што ў 1991 г. жандарам далі занадта шмат новых паўнамоцтваў. А дзе зашмат паўнамоцтваў, там аслаблены кантроль з боку грамадзтва, што, у сваю чаргу, вядзе да карупцыі.

Часта адну й тую справу расьсьледуюць адначасова жандармэрыя і крымінальная паліцыя — дзьве структуры-канкурэнты. Усё гэта прывяло да фэномэну «вайны паліцыянтаў», калі вартавыя парадку пачалі самі парушаць закон у пагоні за сфэрамі ўплыву. І тут да крымінału далучылася вялікая палітыка. Менавіта тады, у 1991 г., пракацілася першая хваля арыштаў карумпаваных чыноўнікаў. Нават колішні міністар замежных справаў Бэльгіі, генэральны сакратар NATO Вілі Клаас падаў у адстаўку з-за свайго дачыненьня да скандалу вакол хабару. Такі ж лёс напаткаў і ягонага пераемніка на пасадзе міністра замежных справаў. Са словаў С.Гавэца, усе гэтыя падзеі моцна падарвалі давер грамадзтва да ўсяе палітычнае сыстэмы Бэльгіі.

Апошнім часам былі спробы рэфармаваць судова-прававую сыстэму. Але, са словаў прафэсара крыміналістыкі Брусэльскага Універсытэту Соні Стакан, такія спробы — задужа нязначныя і запозьненыя. У чым прычына?

Рэч у тым, што бэльгійскі ўрад на працягу дзесяцігодзьдзяў усе свае высілкі скіроўваў на ўтрыманьне франкамоўнай ды флямандзкай частак насельніцтва пад фэдэратыўным дахам адзінай краіны, а іншыя праблемы проста ігнараваў. Але, нягледзячы на ўсе высілкі, у краіне адбываецца відавочны рух да самавызначэньня дзьвюх рознамоўных і рознакультурных частак насельніцтва. Трагедыя вакол замучаных дзяўчынак і наступнае пачуцьцё калектыўнай віны здолелі на нейкі момант згуртаваць бэльгійцаў. Але час ідзе, гора забываецца, і імкненьне да нацыянальнай самастойнасьці зноў выходзіць на першы плян. Асабліва з боку флямандцаў. Бо забойства дзяцей ды палітычныя скандалы маюць дачыненьне да франкамоўных прадстаўнікоў краіны. А гэта дае флямандцам падставы патрабаваць адасабленьня ад «небясьпечных» суседзяў.

Уладзімер Бараніч

№ 30/96
28 кастрычніка-
3 лістапада

ШТОТЫДНЁВЫ
ІНФАРМАЦЫЙНЫ
ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ
НАША НІВА

Інфармацтар

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

НАША НІВА

žǧīöūśįźęēůńðľeſ-čąžǧźšäłłýāņüäōüćķţ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ
ЗАБЕСЬПЯЧЭННЕ
BELARUSIAN PUBLIC
RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЁ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ

Адкрыты ліст Ягонаму Праасьвяшчэнству, Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі, Мітрапаліту Менскаму і Слуцкаму Філарэту.

Дарагі і любасны ў Госпадзе Ўладыка Філарэт!

Цяперашнія часы нашай смутнай гісторыі змушаюць мяне зьвярнуцца да Вас, як да Першаерарха і першай асобы нашай Царквы, ад веку Беларускай і Праваслаўнай, і зазначыць сваё ад'яднаньне ад Вашага пастырскага апякунства і клопату пра маё духоўнае збавеньне і ўратаваньне. Улады, і гэта праўда, заўсёды ад Бога, але ці не сказаў наш Збавіцель, што кесару — кесарава, а Богу — Богава? Вы шырока расчынілі свае дзьверы для тых, каму ўладна і пагрозьліва загадана каяцца ў сваіх грахах перад кесарам. Сапраўднае пакаяньне яшчэ нам ня дадзенае, і Вы гэта добра ведаеце. Я, як і Вы, стаю на дзяржаўніцкіх пазыцыях, але ці азначае гэта, што вера наша і продкаў нашых павінна стацца дзяржаўнай рэлігіяй і канфэсіяй? Наш народ шматканфэсійны і, у большасьці сваёй, хрысьціянскі. Ці не разбураеце Вы адну еднасьць дзеля другой, смутнай; бо сапраўдная еднасьць ёсьць перадусім у любові да бліжняга. Падаяньне ад уладаў, на якое і Вы, пэўна, разьлічваеце,— гэта падаяньне сквапнаму. Шаноўны Ўладыка, у малітвах сваіх буду зьвяртацца па заступніцтва Божае і Ўсяленскага Патрыярха, каб быў прыняты пад покрыў Царквы Канстанцінопальскай, ад якой пайшло хрышчэньне нашага народа і земляў нашых.

Алесь Анціпенка,
сузаснавальнік Беларускага Праваслаўнага Брацтва Трох Віленскіх Пакутнікаў, былы сябра рэдкалегіі часопіса "Праваслаўе ў Беларусі і ў сьвеце". 24.10.96.

20 ЛЕПШЫХ ВІДЭАКЛІПАЎ "MTV" НА 11.10.1996 ГОДА

"+" - павышэньне пазыцыі кліпа ў сьпісе ў параўнаньні зь мінулым тыднем "-" - паніжэньне пазыцыі кліпа "*" - навінка "=" - бязь зьменаў пазыцыі

Пазыцыя	*Выканаўца*	Назва кліпу
* 20	*Hootie And The*	"Sad Caper" (Atlantic) Blowfish
- 19	*Nas*	"If I Ruled The World" (Columbia)
* 18	*R.E.M.*	"Bittersweet Me" (Warner Bros.)
* 17	*Counting Crows*	"Angels Of The Silences" (DGC)
- 16	*Filter*	"Jurassitol" (Miramax Records/Hollywood Records)
+ 15	*Sheryl Crow*	"If It Makes You Happy" (A&M)
+ 14	*Bones Thugs-N-Harmony*	"Days Of Our Lives" (Ruthless/Eastwest/EEG)
+ 13	*No Doubt*	"Don't Speak" (Trauma/Interscope)
- 12	*Soundgarden*	"Burden In My Hand" (A&M)
+ 11	*Donna Lewis*	"I Love You Always Forever" (Atlantic)
+ 10	*Alanis Morissette*	"Head Over Feet" (Maverick/Reprise)
+ 9	*Sublime*	"What I Got" (Gasoline Alley/MCA)
= 8	*The Wallflowers*	"6th Avenue Heartache" (Interscope)
- 7	*Salt-N-Pepa*	"Champagne" (MCA)
+ 6	*Rage Against The*	"People Of The Sun" (Epic) Machine
+ 5	*Blackstreet featuring*	"No Diggity" (Interscope) Dr. Dre
- 4	*311*	"Down" (Capricorn/Mercury)
+ 3	*Metallica*	"Hero Of The Day" (Elektra)
+ 2	*Keith Sweat featuring*	"Twisted" (Elektra) Kut Klose
= 1	*The Fugees*	"Ready Or Not" (Columbia)

Сьпіс сусьветных бэстсэлераў у цьвёрдай вокладцы на 24 кастрычніка 1996 г.

1.	**THE DEEP END OF THE OCEAN.**	*ЖАКЛІН МІТЧАРД*
2.	**DESPERATION.**	*СТЫВЭН КІНГ*
	EXECUTIVE ORDERS.	*ТОМ КЛЭНСІ*
3.	**THE REGULATORS.**	*РЫЧАРД БАХМАН*
4.	**JACK AND JILL.**	*ДЖЭЙМС ПАТЭРСАН*
5.	**TO THE HILT.**	*ДЗІК ФРЭНСЫС*
6.	**A SECRET AFFAIR.**	*БАРБАРА ТЭЙЛАР БРЭДФАРД*
7.	**THE NOTEBOOK.**	*НІКОЛАС СПАРКС*
8.	**THE CELESTINE PROPHECY.**	*ДЖЭЙМС РЭДФІЛД*
9.	**THE LAW OF LOVE.**	*ЛОРА ЭСКІВЭЛ*
10.	**ICON.**	*ФРЭДЭРЫК ФАРСАЙТ*
11.	**THE RUNAWAY JURY.**	*ДЖОН ГРЫШЭМ*
12.	**THE LAST DON.**	*МАРЫЁ П'ЮЗА*
14.	**SERVANT OF THE BONES.**	*ЭН РАЙС*
15.	**THE TENTH INSIGHT.**	*ДЖЭЙМС РЭДФІЛД*

Прадаюцца два баяны (адзін Тульскі). Нядорага. Званіць пасьля 19.00. Тэлефон: 236-54-89.

Куплю нядорага смычок для скрыпкі 1/4. Тэлефон: 236-54-89.

Навучаю французскай мове хутка і якасна. Тэлефон: 231-06-33.

Язерскі Сяргей Андрэевіч 220037, Менск, 2-гі зав. Баграціёна, 19-814 Запрашаем у беларускамоўнае асяродзьдзе для зьняцьця нерашучасьці ва ўжыванні роднай мовы. Даведкі штосеравы з 18.00 да 20.00. Тэлефон: 265-74-12.

Беларусы! Небясьпека навісла над нашай Бацькаўшчынай. Трэба бараніць яе. Яднайцеся ў дружыны Нацыянальнай Самаабароны. Тэлефон: 261-38-37.

Аленачка Сьцяпанава (г.Ворша)! Зычым посьпехаў і мы пераможам! Наста, Зьміцер і Гойша.

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Давопі пэрспэктыўная каманда "Няміга" па "Што? Дзе? Калі?" беларускага чэмпіяната, шукае спонсараў. Тэлефон: 2-53-28-89.

Vit 26/182/75 šukaje siabroŭku — vysokuju (da 178 sm) lićvinku, z žanockimi pavodzinami dy pastavaju (dobra kab meła dačynieńne da tvorčaści). Pisać:220123, Miensk, a/s 71.

Dzieła sumiesnych zaniatkaŭ ahulnafizyčnaj padrychtoŭkaj maju patrebu ŭ kantakcie ż biełaruskimi chłapcami, što majuć ułasnuju bazu dla zaniatkaŭ. Pisac: 220123, Miensk, a/s 71.

Adzin z apošnich lićvinoŭ šukaje sustreču z suplamieńnikami što vyznajuć pahanstva. Pisać: 220123, Miensk, a/s 71.

Катэдж у Радашковічах, жылы, 2 паверхі, усе зручнасьці, дзялянка 30 сотак, мяняю на кватэру ў Менску ці прадаю. Тэлефон: (273) 94-5-30.

СП "Арбор" Паліграфічныя паслугі ад блянкаў да кніг. Кошты памяркоўныя. Тэлефануйце: 262-49-04.

Дарагі Аркадзь Якаўлевіч Капілаў! Віншую Вас з кнігай "Замкавая 2/7", якая змагла пабачыць сьвет з дапамогай "Джойнту". Шчасьця, здароўя і новых посьпехаў!
Міхась Маліноўскі

Віншую Зуйкевіча Вячаслава з 28-годзьдзем. Шчасьця табе і здароўя. Юрэвіч Віталь.

Папрацую на дабрабыт вашай араганізацыі. Інжынэр (ПЭВМ) + 2 гады бугальтэрыя. Ёсьць арганізацыйныя здольнасьці. Тэлефон: 270-08-71. Ганна. Пасьля 19.00.

Куплю расейска-беларускі тэхнічны (хімічны) слоўнік. Тэлефон 47-49-26 (Гомель).

Мастачка з вышэйшай адукацыяй шукае працу. Магу працаваць з Corel Draw. Тэлефон: 47-69-82.

Малады абаяльны лідар-патрыёт шукае прывабную дзяўчыну-беларусачку, аднадумку і, магчыма, спадарожніцу жыцьця. 222310 г.Маладэчна, вул.Палявая, 39.
Сяргей Юркевіч.

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Імя і прозьвішча

Адрэса, тэлефон

Тэкст:

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.

220123, Менск, а/с. 71 НАША НІВА



⇧ Паважаныя чытачы! 22 кастрычніка прыкладна ў сем гадзінаў вечара на тэрыторыі "Мінгарсьвятла" быў знойдзены гэты дакумэнт, які ў рэдакцыю нам даслаў адзін з нашых чытачоў. Калі хтосьці ведае пра ўладальніка гэтага дакумэнту, калі ласка, зьвяртайцеся ў рэдакцыю "НН".

У адпаведнасьці з рашэньнем Савета ад 18.10.96 г. Гаспадарчая асацыяцыя "Банкаўскі Саюз" ліквідуецца. Прэтэнзіі крэдытораў прымаюцца напрацягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Заявы пра прэтэнзіі прымаюцца ў пісьмовым выглядзе з дадаткам дакумэнтаў, якія пацьвярджаюць права патрабаваньня.

Зьвяртацца на адрэсу:
220002, г.Менск, вул. В.Харужай, 31А.
Тэл. **228-60-25.**
Факс: **228-60-31.**

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусі
АБАНЭМЭНТ на газэту **63125**

НАША НІВА

Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму _____ (прозьвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | Літэр

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА

на газэту **63125**

НАША НІВА

Кошт | падпіска _____ руб. | пераадрас. _____ руб. | Колькасьць камплектаў

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму _____ (прозьвішча, ініцыялы)

СЬВЕТ ЗА ТЫДЗЕНЬ

ПАНЯДЗЕЛАК, 21 КАСТРЫЧНІКА:

БЕЛАРУСЬ. На імя Станіслава Шушкевіча ў Вярхоўны Савет прыйшла тэлеграма ад караля Гішпаніі Хуана Карласа, які, пралятаючы

над тэрыторыяй Беларусі, накіроўваўся зь візытам у Рэспубліку Карэя. У ёй кароль называе Шушкевіча прэзыдэнтам Беларусі і выказвае яму найлепшыя пажаданьні.

ЧАЧЭНІЯ. Прадстаўнік часовага кааліцыйнага ўраду Ічкерыі заявіў пра тое, што выбары прэзыдэнта і парлямэнту рэспублікі павінны адбыцца не пазьней за 27 студзеня 1997 году. Адзіным кандыдатам на пасаду прэзыдэнта краіны вылучаны Аслан Масхадаў.

ЧАЧЭНІЯ. Былы кіраўнік чачэнскай дэлегацыі на перамовах з Расеяй Хожахмед Ерыханаў узначаліў нацыянальную чачэнскую нафтавую кампанію.

ЗША. У панядзелак Міністэрства абароны ЗША абвесьціла, што контар-адмірал Марша Дж. Івэнс, дырэктар Вайскова-марской ад'юнктуры, стане часовым дырэктарам Эўрапейскага цэнтра дасьледаваньняў у галіне бясьпекі імя Джорджа Маршала (Гарміш, Нямеччына).

ІТАЛІЯ. 21 кастрычніка стала вядомым, што на Сусьветным харчовым саміце, які пройдзе з 13 па 17 лістапада ў Рыме (Італія), будуць агучаныя палітычная заява і плян дзеяньняў па кіраўніцтву намаганьнямі краінаў у справе выкараненьня голаду і недаяданьня. Саміт падзіцца пад эгідай Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (ФАО). Чакаецца, што ў ім возьмуць удзел больш за 100 краінаў.

БОСЬНІЯ. ЗША і ААН знайшлі падтрымку аднаго з найбольш вядомых сусьветных супэргерояў — Супэрмэна — у барацьбе супраць неабясшкоджаных мінаў, якія пагражаюць дзецям панішчанай вайной Босьніі і Герцагавіны. "Сталёвы чалавек" будзе на сербска-харвацкай і ангельскай мовах засьцерагаць дзяцей ад небясьпечнасьцяў, зьвязаных з наземнымі мінамі, як пэрсанаж новай кнігі коміксаў, складзенай выдавецтвам "Ды-сы-комікс" сумесна зь міністэрствам абароны і пры падтрымцы Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ).

БОСЬНІЯ-ГЕРЦАГАВІНА. У панядзелак стаў вядомым факт, што ў Босьніі і Герцагавіне налічваецца 16000 вядомых мінных палёў. Вядома, што існуюць яшчэ тысячы нявыйдзеных палёў. У басьнійскай зямлі могуць знаходзіцца да 3 міліёнаў мінаў.

УКРАІНА. "Той факт, што Украіна бярэ ўдзел ў падтрыманьні міру на тэрыторыі Босьніі і Харватыі гаворыць пра тое, што яна грае сваю ролю ў справах рэгіёна", — заявіў Дзяржсакратар ЗША Крыстофэр журналістам 21 кастрычніка перад сустрэчай зь міністрам замежных справаў Украіны Ґ.Удавенкам.

АЎГАНІСТАН. Кіраўніцтва руху Талібан і генэрал Рашыд Дустум дамовіліся пра спыненьне баявых дзеяньняў. Але Ахмад Шах Масуд не дапучыўся да пагадненьня, выставіўшы патрабаваньне дэмілітарызацыі Кабулу.

ЛІТВА. Сталі вядомымі папярэднія вынікі выбараў у парлямэнт Літвы. Перамагла кансэрватыўная партыя Вітаўтаса Ландсбэргіса, якая заваявала па партыйных сьпісах болей за 29 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў.

НІКАРАГУА. Паводле папярэдніх вынікаў на прэзыдэнцкіх выбарах лідар лібэралаў Арнольда Алеман перамог сандыніста Даніэля Артэгу.

ЯПОНІЯ. Лібэральна-дэмакратычная партыя на чале з прэм'ер-міністрам Рутара Хасімотам заваявала 239 з 500 месцаў у парлямэнце краіны.

ІТАЛІЯ. Дажджы, якія ідуць на поўначы Італіі ўжо некалькі дзён, прывялі да моцнай паводкі. Толькі за суткі ўзровень вады ў рацэ По ўзьняўся на 4 мэтры.

БЕЛАРУСЬ. У цэнтры Менску абстраляны аўтамабіль, на якім ездзіць намесьнік старшыні Вярхоўнага Савету Генадзь Карпенка — адзін зь лідараў апазыцыі.

ІЗРАІЛЬ. Прэзыдэнт Францыі Жак Шырак, распачаўшы свой візыт у Ізраіль, заявіў, што толькі незалежная палестынская дзяржава можа стаць гарантам бясьпекі габрайскай дзяржавы.

АЎТОРАК, 22 КАСТРЫЧНІКА:

УКРАІНА. Украінскі міністар замежных справаў Генадзь Удавенка на брыфінгу, што адбыўся ў Нацыянальным прэс-клюбе, заявіў, што эканамічныя рэформы на Украіне ідуць хаця і павольна, але ўпэўнена. Міністар ахарактарызаваў адносіны Украіны і Польшчы як выдатныя. Што тычыцца Беларусі, ён выказаў надзею на тое, што "цяперашні працэс дэмакратычных рэформаў у гэтай краіне будзе працягвацца".

ЗША. Прэзыдэнт Клінтан заявіў, што ў мэтах далейшага разьвіцьця праграмаў рэканструкцыі ў Лібане, ён накіруе ў бліжэйшы час урадам розных краінаў запрашэньні да ўдзелу ў канфэрэнцыі "Сябры Лібана", якая мае адбыцца ў Вашынгтоне 16 сьнежня.

ЗША. Кіраўнічым дырэктарам (з амэрыканскага боку) Эўрапейскага банку рэканструкцыі і разьвіцьця прызначаная Карэн Шэфэрд.

КІТАЙ. Запляваны на наступны месяц візыт дзяржсакратара ЗША Крыстафэра ў Кітай, як было сказана на брыфінгу прадстаўніка Дзярждэпартамэнту ЗША Нікаласа Бэрнса, стане першым візытам такога ўзроўню за апошнія два з паловай гады.

ТУРЦЫЯ. Памочнік дзяржсакратара ЗША Робэрт Пэлетру сустрэўся з курдзкім лідарам Масудам Барзані на паўднёвым усходзе Турцыі. Пад час сустрэчы Пэлетру падкрэсьліў, што групоўкам курдаў неабходна спыніць вайну паміж сабой і пачаць міратворчы працэс, і што Ірак і Іран павінны ўстрымлівацца ад ўдзелу ў міжкурдзкіх сутычках.

ІРАК. Звыш 600 праціўнікаў ірацкага рэжыму і іх сем'і былі эвакуяваныя з Паўночнага Іраку, адкуль, пачынаючы з 23 кастрычніка, яны пачалі выпраўляцца на Гуам. Чакаецца, што большасьць зь іх атрымае палітычны прытулак у ЗША.

ІРАК. У выніку баёў у ірацкай правінцыі Курдыстан колькасьць уцекачоў у Іран выросла да 65 тыс. чалавек і яшчэ каля 40 тыс. сабраліся на ірана-ірацкай мяжы.

ТУРЦЫЯ. Прыняты новы пакет ініцыятываў па правах чалавека, прапанаваным ня так даўна прэм'ер-міністрам Тансу Чылер. Сярод іншых прапановаў там ёсьць рашэньне аб скарачэньні дапушчальнага тэрміну затрманьня прыватных асобаў.



НІКАРАГУА. На выбарах у Нікарагуа ў якасьці назіральнікаў прысутнічалі экс-прэзыдэнт ЗША Джымі Картэр і колішні дзяржсакратар ЗША Джэймс Бэйкер.

ПАЎНОЧНАЯ КАРЭЯ. ЗША зьвярнуліся з катэгарычнай просьбай да Паўночнай Карэі не выпрабоўваць балістычныя ракеты і вызваліць амэрыканскага грамадзяніна Карла, які ня так даўна быў узяты пад варту ў гэтай краіне

ЗША. Прэзыдэнт Біл Клінтан, выступаючы ў Дэтройце, сказаў: "Сёньня я хачу абвесьціць амэрыканскую мэту: да 1999 году — 50-й гадавіны NATO і дзесяцігодзьдзя падзеньня Бэрлінскага муру — мы запросім першую групу краінаў далучыцца да NATO ў якасьці сяброў".

АНГЛІЯ. Каралева Элізабэта, адкрываючы паседжаньні брытанскага парлямэнту, выказалася за пашырэньне NATO і супраць узгадненьня гэтага пытаньня з Расеяй.

КІТАЙ. Маці кітайскага дысыдэнта Ван Даня, якому пагражае сьмяротнае пакараньне, заявіла пра тое, што сама выступіць у абарону свайго сына пасьля таго, як кітайскія ўлады далі ёй на пошукі адваката адзін дзень.

РАСЕЯ. Суд у справе расейскай дысыдэнткі Валерыі Навадворскай, якая абвінавачваецца ў распальваньні нацыянальнай варожасьці (арт. 74 ч. 1 ККРФ), адправіў матэрыялы пракуратуры на дадатковае расьсьледаваньне.

ІРАК. У гэты дзень намесьнік міністра абароны ЗША Джон П. Уайт абвесьціў пра шэраг мерапрыемстваў ва ўстанаўленьні кантактаў звароту па дапамогу прыкладна 20000 вэтэранам вайны ў Пэрсідзкім заліве, якія маглі знаходзіцца блізку ад Хамісіі (Ірак) у пэрыяд з 4 па 15 сакавіка 1991 года. Гэтыя дзеяньні прымаюцца ў рамках мерапрыемстваў па поўным дасьледаваньні і збору ўсёй інфармацыі, якая можа дапамагчы вызначыць прычыны хваробаў, пра якія гавораць удзельнікі той вайны.

ЗША. У аўторак Клінтан падпісаў законапраект Палаты прадстаўнікоў N 1281 — "Закон пра раскрыцьцё ваенных злачынстваў". Гэты закон прымушае ўрадавыя ведамствы ЗША публікаваць любыя дакумэнты, што тычацца людзей, у дачыненьні якіх маецца інфармацыя пра іх удзел у ваенных злачынствах нацыстаў.

КІТАЙ. Кіраўніцтва СІА (ЦРУ) прызналася, што з 14 да 16 кастрычніка ў Кітаі знаходзіўся дырэктар гэтай арганізацыі Джон Дэйч. Мэтаю візыту была спроба спыніць магчымы продаж Кітаем Пакістану ядзерных тэхналёгіяў.

СЕРАДА, 23 КАСТРЫЧНІКА:

ІЗРАІЛЬ. Жак Шырак сустрэўся зь Ясірам Арафатам і яшчэ раз выказаўся за стварэньне незалежнай палестынскай дзяржавы.

НАРВЭГІЯ. Прэм'ер-міністар Нарвэгіі Гру Харлем Брукланд абвясьціла ў парлямэнце, што падае ў адстаўку і прапануе каралю Улафу V на сваё месца кандыдатуру лідара Нарвэскай Працоўнай партыі Турб'ёрна Ягланда. Гру Харлем Брукланд зьяўляецца асноўным кандыдатам на пасаду Генэральнага сакратара ААН замест Бутраса Галі.

АЎГАНІСТАН. Войскі Ахмад Шах Масуда, які не падтрымаў перамовы талібаў і Рашыда Дустума, распачалі новы наступ на Кабул.

ПОЛЬШЧА. У Варшаве прайшоў 40-тысячны "Марш Жыцьця" супраць абортаў.

Польскі Сойм будзе разглядаць праект лібэралізацыі закону, які забараняе аборты.

БЭЛЬГІЯ. Генэральны сакратар NATO Хаўер Салана заявіў, што цалкам згодны з выказваньнем Біла Клінтана адносна пашырэньня NATO.

УКРАІНА. Міністар замежных справаў Украіны Генадзь Удавенка заявіў, што ягоная краіна ня мае нічога супраць пашырэньня NATO і хоча ўмацоўваць партнэрскія адносіны з альянсам.

РАСЕЯ. Выбары органаў дзяржаўнай улады суб'ектаў РФ, якія прайшлі ў 25 рэгіёнах, характарызуюцца парушэньнямі і судовымі разьбіральніцтвамі. 23 кастрычніка на пашыраным паседжаньні ЦВК назвалі прычыну — недасканаласьць мясцовых законаў. Найбольш шырока распаўсюджаным парушэньнем стала патрабаваньне абавязковага пражываньня кандыдатаў на тэрыторыі дадзенага рэгіёну.

ЧАЦЬВЕР, 24 КАСТРЫЧНІКА:

НІКАРАГУА. На тыдзень адкладзенае афіцыйнае прызнаньне пераможцы прэзыдэнцкіх выбараў. Большасьць партыяў краіны запатрабавала паўторнага падліку галасоў, абвінавачваючы ўлады ў масавых фальсыфікацыях.

ІЗРАІЛЬ. Службы бясьпекі блякавалі Заходні бераг ракі Ярдан і сэктар Газа з-за пагрозы тэрарыстычных актаў на гадавіну сьмерці Іцхака Рабіна.

ГРУЗІЯ. Прэзыдэнт Эдуард Шэварднадзэ заклікаў абхазаў да байкатаваньня выбараў у парлямэнт Абхазіі 24 лістапада.

ЧАЧЭНІЯ. Чачэнскія лідары яшчэ раз заявілі аб правядзеньні выбараў у краіне да 27 студзеня, а таксама пра тое, што выбары будуць праводзіцца самастойна, без дапамогі фэдэральных уладаў.

РАСЕЯ. Тры дні дырэктар Эрмітажу Міхаіл Піятроўскі знаходзіўся ў Злучаных Штатах, зьбіраючы грошы на ўтрыманьне музэю. Гадавы бюджэт Эрмітажу складае каля 10 млн. даляраў ЗША і толькі 85 працэнтаў ідзе зь дзяржаўнага бюджэту.

ПЯТНІЦА, 25 КАСТРЫЧНІКА:

АРМЕНІЯ. Упершыню пасьля забароны месяц таму мітынгаў і шэсьцяў апазыцыя на чале з былым кандыдатам у прэзыдэнты Вазгенам Манукянам правяла мітынг, на якім заклікала народ да байкатаваньня 10 лістапада муніцыпальных выбараў у краіне.

ВАТЫКАН. Папа рымскі Ян Павал II прызнаў тэорыю Чарльза Дарвіна, заявіўшы аднак, што душа ўсё ж створаная Богам.

УЗБЭКІСТАН. Прэзыдэнт Пакістану Фарух Лігары сустрэўся з прэзыдэнтам Узбэкістану Ісламам Карымавым. На сустрэчы абмяркоўвалася сытуацыя ў Аўганістане.

ЧАЧЭНІЯ. Чачэнскія лідары чарговы раз заявілі, што выступаюць за поўны вывад расейскіх войскаў з тэрыторыі краіны.

АЎГАНІСТАН. Войскі талібаў перайшлі ў наступ супраць Рашыда Дустума. Гэта першыя ваенныя сутычкі паміж імі за час канфлікту.

ІЗРАІЛЬ. Палестынскі лідар Ясір Арафат падвергнуў крытыцы кіраўніцтва Ізраіля за адсутнасьць прагрэсу на перамовах па палестынскай праблеме.

БЕЛАРУСЬ. У выставачным комплексе "Менск-ЭКСПА" адкрылася першая нацыянальная выстава "Турцыя-96", у якой прымаюць удзел 56 турэцкіх фірмаў-вытворцаў. Выстава працягнецца да 29 кастрычніка.

БЕЛАРУСЬ. У Менску завяршылася сэрыя культурных мерапрыемстваў у межах акцыі "Час Кнігі-1996", якую арганізаваў аддзел культуры пасольства Францыі ў Беларусі.

СУБОТА, 26 КАСТРЫЧНІКА:

ЗША.На Капіталійскім халме ў Вашынгтоне знайшоў часовы прытулак сямімэтровы макет ціхаакіянскага ласося. У рыбіну можна забрацца і паблукаць па яе вантробах, разглядаючы на сценах гэтай сваеасаблівай выставачнай залі выявы ласося і іншых жыхароў марской стыхіі. Вашынгтон — гэта ўжо 16-ы прыпынак у гэтым турнэ, якое працягнецца да 31 кастрычніка.

АЎСТРЫЯ. Аўстрыйскі выдавец Курт Фальк перадаў на дабрачынныя патрэбы адзін мільён шылінгаў (92000 даляраў), закрыўшы тым самым справу вакол паклёпу, якую меўся ўзбудзіць супраць яго ў судзе прэзыдэнт краіны Томас Клестыль. Справу меліся распачаць па выніках публікацыі надрукаванай у газэце Фалька "Тэгліх апес", дзе паведамлялася, што прэзыдэнт хворы на СНІД, што на самой справе не адпавядае рэчаіснасьці.

БЕЛАРУСЬ. Прэзыдэнт А.Лукашэнка даручыў Міністэрству фінансаў, Міністэрству прадпрымальніцтва і інвэстыцыяў і аб'яднаньню пацярпелых унёсчыкаў у тры тыдні "распрацаваць і ўнесьці на зацьверджаньне" ў адміністрацыю Лукашэнкі парадак паэтапнай кампэнсацыі сродкаў падманутым незаконнымі фінансавымі структурамі грамадзянам. Пры гэтым Беларускаму грамадзкаму аб'яднаньню пацярпелых унёсчыкаў з 1 лістапада загадана прыступіць да кампэнсацыі стратаў.

Падрыхтаваў А.Андрыеўскі

АДУКАЦЫЯ

Стыпэндыі DAAD для Беларусі

Нямецкая Служба Акадэмічнага Абмену (DAAD) прапануе беларускім навукоўцам, выпускнікам ВНУ і студэнтам наступныя стыпэндыі на 1997/98 навучальны год:

1. Гадавыя стыпэндыі (кастрычнік 1997 — ліпень 1998) для тых, хто скончае ВНУ па любой спэцыяльнасьці (да 32 гадоў). Даюцца дзеля — дзесяцімесячных паглыбленых ці пашыраных студыяў (10 месяцаў); — удзелу ў спэцыяльнай (дадатковай) навучальнай праграме нямецкіх ВНУ (курс з атрыманьнем сэртыфікату); , —атрыманьня дыплёму ў адным зь нямецкіх унівэрсытэтаў (пераважна па прававых, эканамічных, сацыяльных і гістарычных навуках).

Заяўкі мусяць быць добра абгрунтаваныя. Лепей, калі прэтэндэнты ўжо маюць кантакты зь нямецкімі ўнівэрсытэтамі. Для атрыманьня дыплёму неабходна прыкладаць рабочы плян, узгоднены зь нямецкім кіраўніком. Перавага будзе аддавацца таму, хто зьвязвае сваю навуковую кар'еру з працай у Айчыне.

Прэтэндэнты падаюць (усё па-нямецку):

— блянк заяўкі (запаўняць на машынцы); — біяграфію (машынапісную); — падрабязны і дакладны плян навучаньня (дасьледаваньня); — рэкамэндацыі двух спэцыялістаў-прафэсараў (у заклеенай капэрце); — пацьверджаньне (калі ёсьць) кантактаў зь нямецкімі вучонымі; — пасьведчаньне пра валоданьне нямецкай мовай (выдаецца Інстытутам Гётэ або нямецкім выкладчыкам, калі такі працуе ў ВНУ); — пасьведчаньне пра стан здароўя (падаецца толькі пасьля пасьпяховага папярэдняга адбору); — атэстат, дыплём аб заканчэньні ВНУ і (калі ёсьць) дыплём аб прысуджэньні вучонай ступені. Да копіі пасьведчаньняў у роднай мове, завераных установай, прыкладаецца пераклад на нямецкую; сьпіс навуковых публікацыяў.

Усё дасылаецца ў трох экзэмплярах. Для спэцыяльнасьцяў "архітэктура", "выяўленчае мастацтва" і "музыка" патрабуюцца дадатковыя дакумэнты.

Наогул прадугледжваецца добрае валоданьне нямецкай. Але высококваліфікаваны прэтэндэнт (асабліва ў сфэры прыродазнаўчых навук) нават са слабым веданьнем нямецкай можа атрымаць стыпэндыю, калі добра валодае ангельскай. У выпадку неабходнасьці перад пачаткам студыяў DAAD можа забясьпечыць 1-4 месячны моўны курс пры адным зь нямецкіх інстытутаў.

2. Асобныя стыпэндыі (кастрычнік 1997 — ліпень 1998) для студэнтаў эканамічна-гаспадарчых факультэтаў, якія на момант атрыманьня стыпэндыі скончаць трэці курс (да 32 гадоў). Стыпэндыяты пройдуць гадавое навучаньне ў спэцыяльных групах пры нямецкіх ВНУ, вызначаных DAAD. Заняткам можа папярэднічаць двухмесячны моўны курс. Прадугледжваецца практыка на нямецкім прадпрыемстве.

Да заяўкі прыкладаюцца тыя самыя дакумэнты, што і ў п.1.

3. Дасьледчыцкія стыпэндыі (1-6 месяцаў у 1997 календарным годзе) для асьпірантаў усіх спэцыяльнасьцяў (да 32 гадоў). Даюцца дзеля далейшай навуковай падрыхтоўкі стыпэндыятаў або ажыцьцяўленьня іх праграмы дасьледаваньня (напрыклад, збор матэрыялаў для дысэртацыі). Прадугледжваецца добрае валоданьне нямецкай або ангельскай.

Да заяўкі прыкладаюцца тыя самыя дакумэнты, што і ў п.1.

4. Сэмэстравыя стыпэндыі (кастрычнік 1997 — люты 1998) для студэнтаў германістыкі, якія на момант атрыманьня стыпэндыі скончаць трэці курс (да 32 гадоў). Навучаньне праводзіцца паводле праграмы нямецкіх ВНУ, вызначаных DAAD (універсытэт нельга выбіраць індывідуальна). Стыпэндыяты будуць мець кіраўніка.

Да заяўкі прыкладаюцца тыя самыя дакумэнты, што і ў п.1, з той розьніцай, што пацьвярджэньне кантактаў зь нямецкім ВНУ не патрабуецца.

5. Летнія стыпэндыі (1 месяц) для студэнтаў і асьпірантаў да 32 гадоў пераважна гуманітарных спэцыяльнасьцяў (плюс германістыка) з добрым веданьнем нямецкай мовы для ўдзелу ў летніх курсах нямецкіх унівэрсытэтаў (настаўнікам нямецкай мовы з СШ не зьвяртацца).

Падаюцца:

— блянк заяўкі на летнія курсы ВНУ; — біяграфія (машынапісная); — падрабязнае абгрунтаваньне; — падрабязная рэкамэндацыя прафэсара-спэцыяліста; — пасьведчаньне пра валоданьне мовай (на блянку DAAD).

6. Навуковы стаж (1-3 месяцы ў 1997 каляндарным годзе) для тых, хто атрымаў вучоную ступень супрацоўнікаў ВНУ або дасьледчыцкіх інстытутаў. Патрабуецца ясна выкладзеная праграма студыяў ці дасьледаваньня, пры магчымасьці абмеркаваная зь нямецкімі калегамі, а таксама добрае валоданьне нямецкай ці ангельскай мовай. Прэтэндаваць на гэтую стыпэндыю можна раз у тры гады.

Падаюцца:

— блянк заяўкі на навуковы стаж; — біяграфія (машынапісная); — падрабязная праграма дасьледаваньня; — заплянаваны час і месца стажу; — запрашэньне нямецкіх калегаў (іх згода прыняць); — сьпіс навуковых публікацыяў.

7. Практыка (2-3 месяцы) для студэнтаў прыродазнаўчых і інжынэрных, а таксама сельскагаспадарчых і лясных спэцыяльнасьцяў. Зацікаўленыя ў атрыманьні месцаў практыкі ў Нямеччыне могуць зьвяртацца ў DAAD.

8. Навучальныя падарожжы студэнцкіх групаў у Нямеччыну (2 тыдні) з мэтай наладжваньня кантактаў з калегамі, а таксама дзеля пашырэньня ведаў пра эканамічнае, палітычнае і культурнае жыцьцё Нямеччыны.

Дакумэнты па праграмах 1-6 падаваць у Міністэрства адукацыі РБ спадару Уладзімеру Ціханаву (220010, Менск, вул. Савецкая 9, тэл. 26-49-75; факс 27-17-36), або ў нямецкае пасольства ў Беларусі (Менск, вул. Захарава, 26, тэл. 33-07-52; 33-03-57; факс 36-85-52) ці маскоўскае бюро DAAD. У гэтых самых установах можна атрымаць блянкі заявак. Заяўкі па праграме 8 падаюцца ў нямецкае пасольства ў Беларусі ці ў маскоўскае бюро DAAD.

ІНСТРУКТАР

Як зрабіць гектограф?

Вынайдзены ў сярэдзіне мінулага стагодзьдзя гектограф, нягледзячы на забароны царскага і камуністычнага рэжымаў, добра паслугаваўся беларускім рэвалюцыянэрам і незалежнікам. Гэтым простым памнажальнікам друкаваліся адозвы, улёткі, брашуры, часопісы.

Гектограф у перакладзе з грэцкай мовы значыць "стакроць пішу". Яго менш вядомыя сынонімы — аўтограф, паліграф, шапірограф, мульціграф. Сутнасьць прыстасаваньня палягае на ўласьцівасьці адпаведна падрыхтаванай гектографнай масы ўбіраць у сябе тэкст або малюнак, выкананыя адмысловым атрамантам, і адбіваць іх сто і больш разоў на чыстыя лісты паперы.

СПОСАБЫ ВЫРАБУ ГЕКТОГРАФНАЙ МАСЫ.

Замачыце 10 г. жэлаціну ў халоднай вадзе на некалькі гадзінаў, пакуль не разбухне. Затым зьмяшайце яго з 90 г. чыстага гліцэрыну і падагравайце сумесь, не даводзячы да кіпеньня, на вадзяной лазьні або ў слоіку, пастаўленым у кіпень, пакуль гліцэрын цалкам не распусьціцца. Затым раствор заліце ў мэталічную або фаянсавую кювэту памерам крыху большую за ліст паперы. Каб у застылай масе не ўтварыліся пухірыкі паветра, ліць трэба невялікім струменем і зь мінімальнай вышыні.

У другі, больш якасны, спосаб трэба ўзяць, пажадана адным кавалкам, 200 г плітkавага стапярнага клею з костак і замачыць яго ў старым рондлі ў літры халоднай вады. Калі праз суткі на паверхні масы засталося крыху неўсмактанай клеем вады, зьбярыце яе. Затым у той жа рондаль наліце 600 г чыстага гліцэрыну. Атрыманую сумесь нагрэйце на вадзяной лазьні, але зноў жа — без кіпячэньня, пакуль яе вага ня зьменшыцца да 1 кг. Пасьля гэтага таксама паволі і з малой вышыні выліце яе ў кювэту. Калі на застылай паверхні атрымаюцца няроўнасьці над выпадковымі пухірыкамі паветра, наліце на яе тонкі слой сьпірту або адэкалёну і падпаліце. Пухірыкі зьнікнуць і маса стане роўнай.

Для гектографа неабходны адпаведны атрамант, які вырабляецца на падставе аніліновых фарбавальнікаў для тканіны.

СПОСАБЫ ВЫРАБУ АТРАМАНТУ.

Чорны — 9 мл вады, 2 г гліцэрыну, 1,7 нігразіну; сіні — 8 мл вады, 1 г гліцэрыну, 1 г аніліновага лазураку; чырвоны — 7 мл вады, 7 г гліцэрыну, 1 г фуксыну.

Экспэрымэнтальным шляхам можна ўтвараць і іншыя колеры.

ПРАЦА НА ГЕКТОГРАФЕ.

На ліст машынапіснай паперы нанясіце пяром, шкляным рэйсфэдэрам або рапідографам малюнак або тэкст. Калі ня хочаце, каб паводле почырку быў выяўлены аўтар, тэкст пішыце друкаванымі літарамі. Сьпісаным бокам ліст пакладзіце на гектографную масу і ахайна, каб не пасунуўся, пракатайце яго гумавым валікам. Затым асьцярожна здыміце. Калі адбітак на гектографнай масе атрымаўся выразны, кладзіце на яго чыстыя лісты паперы і кожны пракатвайце валікам. Так можна аддрукаваць увесь наклад.

Адпрацаваную гектаграфную масу можна выкарыстаць паўторна. Сумесьсю з 95 мл вады, 4 мл гліцэрыну і 1 мл сьпірту або адэкалёну з дапамогай мяккага тампона змыйце зь яе атрамант. Затым параўняйце паверхню падпаленым сьпіртам або адэкалёнам, як апісана вышэй. Калі ж маса асабліва забрудзілася, распусьціце яе на вадзяной лазьні і нанова заліце ў кювету.

Апісаньне гектографа зроблена паводле публікацыі ў "ЮТ для умелых рук", N8, 1990 г.

РАСЬЛІНЫ, ШТО ПАЯДАЮЦЬ МЭТАЛЫ, АЧЫШЧАЮЦЬ ГЛЕБУ

Ачыстка глебаў, забруджаных цяжкімі мэталамі, ёсьць, напэўна адной з самых невырашальных праблемаў аховы навакольнага асяродзьдзя. Глебы могуць забруджвацца як натуральным шляхам з-за выхаду на паверхню геалагічных элемэнтаў, так і ў выніку распрацоўкі радовішчаў, прамысловай дзейнасьці ці выкіду адходаў.

Мэтады, якія зараз ужываюцца для ачысткі такіх глебаў пры існуючых умовах, ёсьць ня толькі дарагімі і вымагаюць адмысловага абсталяваньня ды спэцыялістаў, але да таго ж

ПРЫГОЖАЯ МЭБЛЯ З ПАЎНОЧНАЙ ІРЛЯНДЫІ

Больш як за год група майстроў з Паўночнай Ірляндыі пад кіраўніцтвам Эндру Клімацкі (на здымку) займаецца распрацоўкай і вырабам элегантнай, і разам з тым, надзейнай мэблі з кавалкаў цэльнага дрэва.

Майстры Monlough Workshop спэцыялізуюцца на вытворчасьці ўнікальных узораў мэблі для прыватных кліентаў, архітэктараў і дызайнэраў. Кожны набор індывідуальна распрацоўваецца і старанна выраблеецца людзьмі, якія маюць шматгадовы досьвед і добра разьбіраюцца ў матэрыялах.

Мясцовыя лясы зьяўляюцца асноўнай крыніцай для загатовак. Дрэвы, у піку якіх ясень, дуб, вяз і іншыя віды, што ідуць на выраб мэблі, старанна адбіраюцца непасрэдна ў лесе. Памятаючы пра тое, што Паўночная Ірляндыя мае мала лясоў з-за папярэдняга масавага іх

ЭКАЛЁГІЯ

яны выдаляюць усю біялягічную актыўнасьць з апрацаванай глебы, што ў сваю чаргу адмоўна адбіваецца на яе фізычнай структуры.

Памятаючы пра гэта, навукоўцы займаліся дасьледаваньнямі здольнасьці пэўных расьлінаў прапанаваць "зялёнае" вырашэньне гэтай праблемы. Расьліны, здольныя да накапленьня высокіх канцэнтрацыяў такіх мэталаў як цынк, нікель, кадмій, сьвінец, медзь і кобальт маглі б прапанаваць эфэктыўны й практычны мэтад ачысткі моцна забруджаных земляў.

Выпрабаваньні на расьлінах, праведзеныя ў Вялікабрытаніі Шэфілдзкім Унівэрсітэтам, што ў Паўночнай Англіі, а таксама Інстытутам Дасьледаваньняў Расьлінаў паказалі, што існуе выдатны патэнцыял для выкарыстаньня гіпэраакумулюючых расьлінаў па выдаленьні мэталаў з глебы.

Неаторыя віды расьлінаў паказалі натуральную здольнасьць абсарбаваць мэталы з глебаў з высокім прыродным утрыманьнем мэталаў. Яны таксама могуць абсарбаваць мэталы з глебаў зь нязначнымі канцэнтрацыямі мэталаў.

Далейшыя навуковыя пошукі скіраваныя ў напрамку вызначэньня тых генатыпаў, што хутка растуць і найбольш моцна акумулююць цяжкія мэталы. Вядуцца дасьледаваньні па магчымасьці паляпшэньня металапаглынальных характарыстык шляхам генэтычнай інжынэрыі. Трэба вырашыць і праблему збору такіх гіпэраакумулюючых расьлінаў пры дапамозе спэцыялізаванай сельгастэхнікі, а таксама распрацаваць мэтады перапрацоўкі сабранага мэталанасычанага ўраджаю.

высяканьня, кампанія Monlough Workshop прытрымліваецца палітыкі насаджэньня новых дрэваў і спрыяньня паляпшэньню якасьці прыроднага асяродку.

КАМПУТАР



СУПЭР — ЦЭНТАР

Брытанскія інжынэры, навукоўцы і прамыслоўцы атрымалі вялізную перавагу ў сваіх высілках на апярэджаньне сваіх канкурэнтаў, якіх хапае ў тэхнічна прасунутых краінах.

Прарыў адбыўся ў кампутарнай галіне ў выглядзе новага Супэркампутарнага Цэнтру ў Фарнабара, што вызначаецца найноўшымі распрацоўкамі ў навуцы і тэхналёгіі.

Гэты цэнтар — самы магутны ў сваім родзе ў Эўропе. Ён дае ягоным карыстальнікам новыя магчымасьці ў выкарыстаньні супэркампутарнай дапамогі ў цэлым спэктры распрацоўкі новых тэхналёгіяў, новых мэтадаў вытворчасьці і доўсягаючых дасьледаваньняў.

Пры дапамозе самага перадавога ў сьвеце абсталяваньня і з выкарыстаньнем працэсараў Dec-Alpha, тут быў уведзены ў дзеяньне супэркампутар з хуткадзеяньнем у 40 мільярдаў апэрацыяў за сэкунду.

Гэты кампутар настолькі магутны, што, напрыклад, можа апрацоўваць неверагодна вялізны аб'ём інфармацыі пры прагназаваньні надвор'я нават за меншы час, чымся мэтэаралягічнаму спадарожніку патрабуецца на адзін віток вакол Зямлі — задача, для выкананьня якой, самаму лепшаму пэрсанальнаму кампутару спатрэбілася б некалькі тыдняў, а звычайнаму супэркампутару давялося б працаваць шэсьць гадзінаў.

Цэнтар у Фарнбара, які заснаваны брытанскай Агенцыяй па абаронных дасьледаваньнях і касьмічнай агенцыяй British Aerospace, будзе абслугоўваць кансорцыюм вядучых арганізацыяў ды, пры магчымасьці, іншых карыстальнікаў.

Паводле матэрыялаў LONDON PRESS SERVICE падрыхтаваў ***У.Баранік***

Інфарматар 28.10 - 3.11 1996 N30

ПАНЯДЗЕЛАК, 28

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.25 Мультфільмы.
9.10 "Вандроўныя аганьчыкі". М/ф. С. 1.
10.15 Фінансавы час.
10.35 Музычны салён Э.Язерскай.
11.10 "Крыж міласэрнасьці". М/ф. С. 1, 2.
13.45 Люстэрка.
14.05 "Танцуе Людмила Семянка". Ф/к
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільм.
15.20 ТБ — школе.
15.40 Студыя "Вакно".
16.35 "На добры лад".
16.55 Параграф.
17.20 "Гэтага мы не праходзілі..."
17.35 Крок.
18.05 Фінансавы час.
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 "Выспа нашай маладосьці".
19.45 Музыка бязь межаў.
20.15 "Бон тон".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 "Нашыя суседзі". М/ф.
23.10 "Музыка дажджу". Ф/к.
23.50 Навіны.

ОРТ

14.00 Навіны.
14.20 "Касьмічныя вырагавальнікі лейтэнанта Марша". Мультсэрыял.
14.45 Маратон-15.
15.00 Зорная гадзіна.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Джэм.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Гадзіна пік.
18.35 "Адгадай мэлёдыю".
19.00 "Калі..."
19.45 "Дабранач, дзеці!"
20.00 Час.
20.40 "Баіз-2". "Што адбываецца?".
21.45 "Срэбны шар".
22.25 Навіны.
22.35 "Рэальнае кіно". "Мулен Руж", "Гісторыя Цюрына".
23.40 "Пятніца, 13".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 Прыёмная доктара Багданава.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта Барбара". М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 М/ф "Бакенбарды".
16.20 Блёк-нот.
16.35 Сур'ёзная гульня.
17.05 Ваш партнэр.
17.15 L-клюб.
18.00 Момант ісьціны.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Джэнтэльмэн-шоў.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "На вастрыё нажа". М/ф.
22.00 Тэлескоп.
22.30 Прахалодны сьвет.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

17.05 Сядзібы.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
18.55, 22.55 Інфарм ТБ.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 Рытмы гораду.
20.40 Тэлеслужба бясьлекі.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
21.55 Падзея.
22.15 Гістарычныя досьледы.
22.50 Чэмпіянат Эўропы па дзюдо.

IV КАНАЛ, НТБ

17.00 "Дзеці супраць монстраў".
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 Сьвет кіно. "Шэрляк — пёсдэтэктыў".
20.25 "Канюшня Роста. Леў Копелеў жыве ў Кёльне".
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
22.30 Часінка.
23.20 Тэніс апоўначы.

АЎТОРАК, 29

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 "Гэтага мы не праходзілі.."
8.30 Абібок.
9.00 ТБ — школе.
9.20 "Вандроўныя аганьчыкі". С. 2.
10.25 Турабэктыў.
10.55 "Трапічная сьлёка".
11.55 Акаляда.
12.25 "Крыж міласэрнасьці". С. 3, 4.
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
15.45 ТБ — школе.
16.20 "Усё пра ўсё".
16.45 Беларускі мэрыдыян.
17.15 Заняткі Н.Наважылавай.
17.45 Востры вугал.
18.15 Будзьце здаровыя.
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.35 "Трапічная сьлёка".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.15 М/ф "Першая сустрэча, апошняя сустрэча".
23.45 Супэргол.
0.15 Навіны.

ОРТ

11.00 Навіны.
11.10 "Мы і рынак".
11.55 "Расейскі транзыт". С. 3.
12.55 "Як лісы з курамі пасябравалі". Мультфільм.
13.15 "Брэйн рынг".
14.00 Навіны.
14.20 "Касьмічныя вырагавальнікі лейтэнанта Марша".
14.45 Квар'етэ "Вясёлая кампанія".
14.55 Мультытролія.
15.10 Чароўны сьвет, ці Сынэма.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 ...Да шаснаццаці і старэй.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Гадзіна пік.
18.35 "Адгадай мэлёдыю".
19.00 "Тэма".
19.45 "Дабранач, дзеці!"
20.00 Час.
20.40 Фільм "Халоднае лета пяцьдзесят трэцяга..."
22.35 Хакей. Эўраліга. ЦСКА — "Вена" (Аўстрыя).
0.05 "Пятніца, 13".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 Экспавесьнік.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
16.20 Блёк-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Тэлечасопіс "Здароўе".
17.15 Тры стагодзьдзі — тры гісторыі.
17.45 Надзвычайны канал.
18.15 Лідар-прагноз.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Раз на тыдзень.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Мужчына і жанчына.
21.45 Ціхі дом.
22.25 Начное жыцьцё гарадоў сьвету.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 "Хто на што здатны".
0.05 Гарачая дзясятка.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 14.00, 15.55, 18.55, 23.25 Інфарм ТБ.
12.10 "Партрэт жанчыны".
13.10 Тэрмін адказу — сёньня.
13.35 Парады садоўнікам.
13.45, 20.45 Тэлеслужба бясьлекі.
14.10 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
15.00 "Адысэя Аляксандра Вярцінскага". Т/о.
16.10 Тата, маці тэ — спартовая сям'я.
16.40 "Інспэктар Гэджэт".
17.05 Дзіцячае ТБ: "Паласатая музыка", "Там, дзе жыве Павуціныч".
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Партрэт жанчыны".
20.20 Формула згоды.
21.00 Спартовы агляд.
21.10 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
22.00 Падзея.
22.15 "Раман імпэратара". М/ф. С. 1.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сёньня.
7.15 "Сьмерць паводле кантракту".
8.00 Лепшыя цыркі сьвету. "13-ы фэстываль цыркаў у Монтэ-Карла".
9.15 М/ф "Лекі супраць боязі".
10.45 Расейскі альбом. Гурт "Манга-Манга".
11.15 М/ф "Лісты незнаёмаму закаханаму".
13.15 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
14.45 Ю.М.Лотман. Гутаркі пра расейскую культуру.
15.30 Заняткі маляваньнем.
15.45 Міжнародны жаночы турнір па тэнісу. Кубак Крамля.
16.40 Навіны.
17.00 "Дзеці супраць монстраў".
17.30 "Вуліца Сэзам".
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 Футбол. Кубак УЕФА. "Спартак" (Масква) — "Гамбург" (Нямеччына).
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
22.30 Часінка.
23.20 Выніковая праграма пра чэмпіянат Расеі па шахматах.
23.50 Мэляманія. "Энгельбэрт Хампэрдынк".

СЕРАДА, 30

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 "Хай б'юць мяне — мацней буду". Д/ф.
9.00 ТБ — школе.
9.35 "Тайна Сьнежнай каралевы". М/ф. С. 1.
10.45 Мультфільмы.
11.10 "Трапічная сьлёка".
12.10 Відзьма-нявідзьма.
13.10 "Махляры". М/ф.
14.30 "Аннэ Вескі". Ф/к.
15.00 Навінь.
15.10 "Комік Маскоўскага цырка Карандаш". Т/о.
16.20 "Калейдаскоп сустрэчаў".
17.05 Крэда.
17.25 "Творчая сустрэча".
17.55 Госьці ў хату.
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 Рэфэрэндум: шчырая размова.
19.50 Баскетбол. Чэмпіянат Эўропы. Мужчыны. Беларусь — Босьнія і Гэрцагавіна. У перапынку (19.40) — Дзеньнік фэстываля "Залаты шлягер".
20.30 "Хто гэта?"
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Аўта-парк.
22.15 М/ф "Прэфэранс штопятніцу".
23.50 Навіны.
0.05 Каралеўскае галяваньне.

ОРТ

11.00 Навіны.
11.10 "Першыя асобы".
11.55 "Расейскі транзыт". С. 4.
12.50 "Желдік", "Вярніце Рэкса". Мультфільмы.
13.15 "Брэйн рынг".
14.00 Навіны.
14.20 "Касьмічныя вырагавальнікі лейтэнанта Марша".
14.45 Кактус і К.
14.55 До-мі-соль.
15.15 Покліч джунгляў.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 "Тэт-а-тэт".
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навінь.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Гадзіна пік.
18.35 "Адгадай мэлёдыю".
19.05 "Каб памяталі.."
19.45 "Дабранач, дзеці!"
20.00 Час.
20.40 КВЗ-асарці.
21.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. "Мілан" (Італія) — "Гётзборг" (Швэцыя).
23.20 Навіны.
23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд 7 матчаў.

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 У сьвеце капіталу.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 "Небясьпечны паварот". М/ф. С. 1.
16.20 Блёк-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Тэлечасопіс "Здароўе".
17.15 "Даміно" Міхаіла Баярскага.
17.45 Суайчыньнікі.
18.10 Клюб губэрнатараў.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 "Гарадок".
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 "Адысэрміноўка прысуду". М/ф.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 "Хто на што здатны".
0.05 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 16.00, 18.55, 23.05 Інфарм ТБ.
12.10 "Партрэт жанчыны".
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.40, 20.35 Тэлеслужба бясьлекі.
14.10 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
15.00 "Адысэя Аляксандра Вярцінскага". Ф. 2.
16.15 "Асабістая справа". У.Жырыноўскі.
16.40 "Інспэктар Гэджэт".
17.05 Храм.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Партрэт жанчыны".
20.10 "Таямніцы палацаў". Д/ф.
20.50 Спартовы агляд.
21.05 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
21.55 Падзея.
22.10 "Раман імпэратара". С. 2.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сёньня.
7.15 "Зьмяніце навакольле".
7.55 Лепшыя цыркі сьвету. "Каралеўскі цырк".
9.15 М/ф "Дзяўчынка з гораду".
10.30 М/ф "Цудоўныя гады".
10.50 Доктар Угал.
11.15 М/ф "Акіяны агню".
12.45 Лятынаманія.
13.15 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
14.45 Пэдагогіка для ўсіх.
15.20 Расейская мова.
15.40 Міжнародны жаночы турнір па тэнісу. Кубак Крамля.
16.40 Навіны.
17.00 "Дзеці супраць монстраў".
17.30 "Вуліца Сэзам".
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 Фільм "Тата-прывід" (ЗША).
20.35 Расейскі альбом. Гурт "Калібры".
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
22.30 Часінка.
23.20 Чэмпіянат сьвету па рафтынгу.
23.50 Кавярня "Абломаў".

ЧАЦЬВЕР, 31

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Аўта-парк.
8.30 Вяскоўцы.
9.00 "Разьвітальнае". Д/ф.
9.30 Каралеўскае галяваньне.
10.10 "Таямніца Сьнежнай каралевы". С. 2.
11.20 "Выспа натхненьня". Тэатралізаваная казка.
11.50 Госьці ў хату.
12.20 "Я з табой не разьвітаюся". Ф/к.
12.50 "Не будзіце пса, які сьпіць". М/ф.
15.00 Навінь.
15.10 "Капітан Фракас". М/ф. С. 1.
16.25 Мультфільм.
16.35 "Сугучнасьць".
17.05 "Марсава поле".
17.35 Заняткі Н.Наважылавай.
18.05 Творцы.
18.30 Музычны антракт.
18.40 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.35 "Трапічная сьлёка".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.15 М/ф "Мой ласкавы і пяшчотны зьвер".
24.00 Навіны.
0.15 "Крок".

ОРТ

8.00 Навіны.
8.15 "Новая ахвяра".
9.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. "Грасхопэр" (Швэйцарыя) — "Осэр" (Францыя).
11.00 Навіны.
11.10 "Пад дахам сьвету".
11.55 "Расейскі транзыт".
12.50 "Браты Лю". Мультфільм.
13.15 "Брэйн рынг".
14.00 Навіны.
14.20 "Касьмічныя вырагавальнікі лейтэнанта Марша".
14.45 Лега-та!
15.10 Цін-Тонік.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Рок-занятак.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.05 Гадзіна пік.
18.30 "Грай, гармонік любы!"
19.00 "Мая сям'я".
19.45 "Дабранач, дзеці!"
20.00 Час.
20.40 Фільм "Неба і зямля".
23.15 Навіны.
23.25 "Абоз".
0.15 "Пятніца, 13".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 Эксп-весьнік.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 "Небясьпечны паварот". М/ф. С. 2.
16.20 Блёк-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Ляго-мільён.
17.20 Пецярбургскія сэзоны.
17.45 "Цёмная" для Н.Бэтанэлі.
18.00 Новае пятае кола.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Сам сабе рэжысэр.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 Фільм "Каханьне".
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 "Слухаць падазрана".

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 14.00, 15.55, 18.55, 23.45 Інфарм ТБ.
12.10 "Партрэт жанчыны".
13.10 Тэрмін адказу — сёньня.
13.35 Парады садоўнікам.
13.45, 20.50 Тэлеслужба бясьлекі.
14.15 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
15.05 Мультфільм.
15.15 "Тэлекампакт".
16.10 Ток-шоў "Навуздагад". С.Мяшка.
16.40 "Інспэктар Гэджэт".
17.05 "Павана Маўра".
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Партрэт жанчыны".
20.20 "Я — геній".
21.05 Спартовы агляд.
21.15 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
22.05 Падзея.
22.25 Як быць каханымі.
22.50 "Раман імпэратара". С. 3.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сёньня.
7.15 "Зьмяніце навакольле". С. 3.
8.05 Лепшыя цыркі сьвету. "10-ы фэстываль "Залатога цырку". Рым. Частка 2-я.
8.35 М/ф "Цудоўныя гады".
9.15 М/ф "Выкраданьне Чараўніка".
11.15 М/ф "Рэйнбоў Драйф".
12.45 Лятынаманія.
13.15 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
14.40 Прыхільнікам Тэрпсыхоры.
15.00 Расейская мова.
15.15 Міжнародны жаночы турнір па тэнісу. Кубак Крамля.
16.40 Навіны.
17.00 "Дзеці супраць монстраў".
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф "Ён сваё атрымае".
20.35 Расейскі альбом. Гурт "Настя".
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
22.30 Часінка.
23.20 М/ф "Камганія ваўкоў".
0.55 Начны канал. Эратычны шоў сьвету.

СУБОТА, 2

БТ

8.00 Беларускі дом.
8.15 Радавод.
8.55 Сутнасьць.
9.25 Беларускі мэрыдыян.
9.55 Усё гра ўсе.
10.20 "Калі мяне ня стане". Д/ф.
10.45 Шматгалосьсе.
11.15 Крок.
11.30 "Дрэвы на асфальце". М/ф.
12.45 "Есьць толькі імгненьні..."
13.05 Алімп: ад падножжа да вяршыні.
13.25 Майстроўня.
13.45 Калях.
14.15 Памяці акторкі.
14.45 Студыя "Вакно".
15.10 Тэлесьвятрына.
15.45 "Габэлены мастачкі Волыі Дзёмкінай".
16.15 Беларускі дом.
16.55 "Гісторыя каханьня".
17.15 Тэлесьвятрына.
18.00 Галерэя.
18.30 Конны спорт.
19.05 "Шляхціц Завальня". М/ф.
20.40 Калыханка.
21.00 Навіны.
21.45 Музычны антракт.
22.05 "Чаканьне палкоўніка Шалыгіна". М/ф.
23.30 Цёмны пакой.

ОРТ

7.00 Фільм "У матросаў няма гыганьняў".
8.25 "У краіне нявыкананых урокаў". Мультфільм.
8.45 Хатняя бібліятэка.
9.00 Навіны.
9.10 Слова пастыра.
9.30 "Не пазяхай!"
10.00 Раніцная пошта.
10.40 Смак.
11.00 Вяртаньне Трацьцякоўкі.
11.30 Фільм "Ідыёт".
13.30 "Пад знакам "Пі".
14.00 Навіны.
14.20 "Вяртаньне на выспу скарбаў".
15.10 "Амэрыка з М.Тарапутам".
15.40 Бацькоўскі "гэрарызм".
16.00 Тына Тэрнэр. Дарогі.
16.15 "Кола гісторыі".
17.00 Навіны.
17.20 Ералаш.
17.50 В сьвеце жывёлаў.
18.30 Фільм "Місія ў Кабуле". С. 1.
19.45 "Дабранач, дзеці!"
20.00 Час.
20.50 "Місія ў Кабуле". С. 2.
22.10 "Калямбур".
22.40 Фільм "Друк злы".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

7.00 Лукамор'е.
7.25 "Вяртаньне блуднага папугая". Мультфільм.
7.55 "Мак і Матлі".
8.20 Мультфільм.
8.35 На вашыя лісты.
9.05 Кнігарня.
9.20 Крамлёўскія нянькі.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Тэлечасопіс "Здароўе".
10.30 Добрай раніцы.
11.00 Доктара выклікалі?
11.30 Ананімныя суразмоўцы.
12.00 "Пазіт у Расеі — больш, чым пазіт..."
12.30 Прасьцей прастага.
13.00, 19.00, 23.35 Весткі.
13.20 "Тайна Сахары".
14.15 "Нічога, апроч..." К.Баравы.
14.30 Дэ факта.
15.00 Музыка на дэсэрт.
15.20 Сад культуры.
15.45 Свая гульня.
16.15 Дыямэнты сусьветнага балета.
16.55 Міжнародны жаночы турнір па тэнісу "Кубак Крамля".
17.55 "Каралева Марго".
19.35 Суботні вечар: прысьвячаецца Аркадзю Райкіну.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Цалкам сакрэтна.
22.00 "Буйства". М/ф.
23.50 Праграма "А".

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

9.25 Па раці пільне сякера.
9.55, 11.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 "Генар маю".
10.40 Памяці Уладыкі Іаана.
11.10 Ток-шоў "Навуздагад". А.Рамашын.
11.40 Жарсьці-мардасьці.
12.10 Хакей. Чэмпіянат Расеі.
14.15 Яшчэ адна Расея.
14.40 Тэатральная правінцыя?
15.10 Спартовы агляд.
15.25 Парадоксы гісторыі. "Шпіёнскія страсьці".
16.10 Уік-энд з дэтэктывам. "Экстрасэнс".
16.40 Восень — Царскае Сяло.
17.05 "Раўняецца каханьне..."
17.40 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.25 Уік-энд з дэтэктывам. "Мільён за разгадку".
19.40 Мультфільм для дарослых.
19.50 "Тры дні на роздум". М/ф. С. 1.
20.55 Сьвецкая кроніка.
21.10 Блеф-клюб.
21.50 "Парад парадаў" прадстаўляе.
22.30 "Раман імпэратара". С. 4.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00 М/ф "Цудоўныя гады".
7.50 "Зьмяніце навакольле".
8.35 Лятынаманія.
9.00, 13.00 Сёньня.
9.15 М/ф "Разьвітаньне славянкі".
10.35 Лепшыя цыркі сьвету. "Міжнародны фэстываль цырка ў Маскве". Ч. 1.
11.15 М/ф "Гувэр супраць братоў Кэнэдзі". С. 1.
13.15 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
14.40 "Занатоўкі вар'ята, ці Жыццё выдатнага дарадцы Аксенція Папрышчына". Тэлеспэктакаль.
15.45 Крок з кола.
16.05 Інфармацыйны агляд.
16.25 Шарман-шоў.
17.00 "Дзеці супраць монстраў".
17.30 Дог-шоў "Я і мой сабака".
18.00, 21.00 Сёньня.
18.30 "Крымінальная Расея: сучасныя кронікі".
19.00 "Таемныя злачынствы".
20.00 Надоечы.
20.45 Лялькі.
21.35 М/ф "Айчым".
23.45 Трэцяе вока.
0.30 Начны канал. "Плэйбой".

НЯДЗЕЛЯ, 3

БТ

8.00 Кола часу.
8.30 Здароўе.
9.05 "Канон".
9.30 Студыя "Калыханка".
10.05 Мультфільм.
10.15 Тэлебом.
10.45 Вяршыня сьвету.
11.05 Збройня.
11.40 "Усё нармальна, мама!"
12.10 Турабэктыў.
12.40 Міжнародны кур'ер.
13.10 Тэлевізійны АРТ-клюб.
13.40 Вяскоўцы.
14.10 "Вайна ў паветры".
14.40 "Адзіная прастора — мора".
15.40 Вяршыня сьвету.
16.00 Гандбол. Адборачны матч чэмпіяната сьвету. Беларусь — Галяндыя.
17.20 Тэніс.
17.55 Абібок.
18.25 Міжнародны музычны фэстываль "Залаты шлягер".
19.40 Калыханка.
20.00 Рэзананс.
20.50 Спартовы тэлекур'ер.
21.10 Навіны-ТБ.
21.25 Ток-шоў "Карамболь".
22.00 М/ф "Свабоднае падзеньне".
23.40 Аксамітавы сэзон.
0.10 Відзьма-нявідзьма.

ОРТ

6.55 Фільм "Школьны вальс".
8.30 Мультфільм "Кашанка".
9.00 Навіны.
9.15 "Непуцёвыя нататкі" Дзьм.Крылова.
9.30 Пакуль усе дома.
10.10 Раніцняя зорка.
11.00 "Вайсковы кур'ер".
11.30 "Грай, гармонік любы!"
12.00 У горадзе "N".
12.30 "Падводная адысэя каманды Кусто".
13.25 Сьмехапанарама.
14.00 Навіны.
14.20 Клюб вандроўнікаў.
15.10 Мультфэрвэрк.
15.55 Чэмпіянат Расеі па футболу.
18.05 "Шчасьлівы выпадак".
19.00 Час.
19.40 М/ф "Маскоўскія вакацыі".
21.40 Футбольны агляд.
22.10 Навіны.
22.20 Фільм "Новыя амэрыканскія графіці".
0.15 Амэрыканскі футбол.

КАНАЛ "РАСЕЯ"

7.00 Лукамор'е.
7.30 Мультфільм.
7.50 Спортлято.
8.00 "Мак і Матлі".
8.20 Мультфільм.
8.30 Гаспадыня.
9.00 Вуснамі дзіцяці.
9.30 Прысяга.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Рускае лято.
10.55 Прыз гурта "Сава".
11.00 Чалавек на зямлі.
11.25 Кнігарня.
11.55 Тэлетэатар. "Ездаю Калешкін".
12.25 Прасьцей прастага.
13.00, 23.00 Весткі.
13.20 "Атрад Д". М/ф.
14.40 "Нічога, апроч..." Е.Лахава.
14.55 У сьвеце жывёлаў.
15.25 Караоке па-расейску.
15.55 Рэпартэр.
16.10 Футбол бязь межаў.
16.40 "Ва ўсіх на вуснах".
17.00 Чароўны сьвет Дыснэя.
18.00 "Каралева Марго".
19.00 Люстэрка.
19.55 "Каралева Марго".
20.55 Рэпартаж ні пра што.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 "Фрак народа".
22.05 У Кюпы.
22.40 Рэк-тайм.
23.15 Лепшыя гульні НБА.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

9.25 Тата, маці тэ — спартовая сям'я.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 Овэртайм.
10.40 "Незацугляная Афрыка".
11.10 "Старае танга". В.Ковель.
11.30 Мультфільм.
11.40 Увесь гэты цырк.
12.10 "Вясельле ў Малінаўцы". М/ф.
13.35 Мультфільм.
14.10 Яшчэ адна Расея.
15.10 Няскончаны партрэт.
16.10 Спартовая праграма.
16.35 Дзіцячае ТБ: "Залаты ключ", "Каша-малаша", "Брасайка".
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Скарбы Пецярбурга.
19.25 Сьпявае Алёна Апіна.
19.40 "Тры дні на роздум". С. 2.
20.55 Усім выдаць.
21.10 Ноў смокінг.
21.55 Міжнародны агляд.
22.25 "Паглядзім".

IV КАНАЛ, НТБ

7.00 М/ф "Цудоўныя гады".
7.50 "Рэквіем для голаса і фартэпіяна".
8.35 Расейскі альбом. Гурт "Прынц-камплот".
9.00, 13.00 Сёньня.
9.15 М/ф "Двое гададным парасонам".
10.45 Лепшыя цыркі сьвету. "Міжнародны фэстываль цырка ў Маскве". Ч. 2
11.20 М/ф "Гувэр супраць братоў Кэнэдзі" (ЗША). С. 2.
13.15 "Таемныя злачынствы".
14.00 Надоечы.
14.40 Ляльки.
14.35 Пад'ём пераваротам.
15.05 "Тайна трэцяй планэты". Мультфільм.
15.55 "Рэжысэрская кухня".
16.25 "Прыцягненьне".
17.00 "Дзеці супраць монстраў".
17.30 Тэлегульня "Сто да аднаго".
18.00 Сёньня.
18.30 "Чалавек у масцы".
19.10 "Зьніклыя цывілізацыі".
20.00 Вынікі.
21.10 Сузор'е НТБ.
23.15 М/ф "Усе ладзі робяць гэта".

28.10 – 3.11

КІНО. МЕНСК

АЎРОРА *(Прытыцкага, 23, тэл. 533-360, 533-361)* Маўчаньне шынкі, 28-2 — 17.00, 20.40; 3 — 17.00 (ільготны), 20.40 Мэлядрама на экране: Закаханы мужчына, 28-3 — 19.00 Для дзяцей: Гэты нягоднік Сідараў, 28-30 — 14.30 Спадарожнік на плянэту Ўран, 31-3 — 14.30

БЕРАСЬЦЕ *(пр. газэты "Праўда", 25, тэл. 728-660, 716-888)* – Дасканалыя бандыты, або Лясныя браты, 28-31 — 14.20, 18.30; 1-2 — 18.30; 3 —18.40 Фірма (2 сэрыі), 28-31 — 16.00, 20.10; 1-2 — 16.00; 3 — 20.20 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 1-2 — 20.00 Для дзяцей: Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 3 — з 16.00 па 18.30 Вар'яты на стадыёне, 1-3 — 14.30

ВІЛЬНЯ *(Каліноўскага, 55, тэл. 655-262)* – Праз каналізацыю (баявік), 21-26 — 15.20; 27 — 15.20 (ільготны) Каханьне і магія, 21-27 — 18.30, 21.20 Запавет блакітнага дзядзькі (эратычны фільм), 21-27 — 20.05, 21.20 Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Усьмешка", 22, 26-27 — 21.00 Альтэрнатыўная дыскатэка, 24 — 21.00 Танцавальны вечар "Для тых, каму за 30", 25 — 20.30 Кіна-дыска-шоў для дзяцей і падлеткаў, 27 — 15.00

ЗЬМЕНА *(Даўгабродзкая, 4, тэл. 353-903)* – Малыш-каратэ, 28-29, 31 — 14.00, 20.00; 30, 2 — 20.00 Амадэй (2 сээр.) (Рэжысэр Мілаш Форман, фільм пра трагічны лёс кампазытара Моцарта), 28-31 — 16.00; 2 — 14.00 Паданьні пра Беларусь ("Дакрануцца да мінулага", "Полацкія пябірыны", "Крыж ля дарогі"), 30 — 15.00 Да Дню памяці "Дзяды": Вяртаньне Міхася Забэйды (кінасустрэча са стваральнікамі фільма: Л.Гідравічус, Р.Ясінскі, І.Тышчанка, Г.Марчук), 2 — 18.00 Для дзяцей: Карпуша, 30 — 10.00, 14.00; 1 — 10.00, 12.00

КАМСАМОЛЕЦ *(Жылуновіча, 39, тэл. 454-194)* – У кінатэатры адбываецца месячнік пажарнай бясьпекі. "Пажар у кватэры" (дак. фільм) дэманструецца перад пачаткам сэансаў Магія, 28-3 — 12.00, 19.00, 20.20 Махнаты сарцасед-2, 28-3 — 15.00, 17.00, 20.30 Крымінальны квартэт, 28-3 — 13.00, 16.20 Заля індыйскага фільма: "Полымя" (2 сэр.), 28-3 — 14.00, 18.00 Для дзяцей: Увага, чарапаха!, 28-1 — 10.30; 2-3 — 11.00 Відэапаказ: Ангелец, які падняўся на хопм, а спусьціўся з гары, 28-3 —14.00 Цацачныя ваяры (баявік), 28-3 — 16.00

КАСТРЫЧНІК *(пр. Ф.Скарыны, 73, тэл. 329-325, 329-429)* – Брама пекла, 28-1 — 14.10, 18.00, 19.30; 2-3 — 14.10 (ільготны), 18.00, 19.30 Апошні кінагерой, 28-3 — 15.40, 21.00

Партызан Дзядзька Бак, 28-3 — 17.50, 21.20 Правая і левая рука д'ябла, 28-30, 1-3 — 16.00, 19.30; 31 — 16.00 Да дню памяці "Дзяды": Прынясі, Божа, хмару, 1 — 15.00

КІЕЎ *(бульвар Шаўчэнкі, тэл. 373-270)* – Адзіночка, 29-1, 3 — 15.00; 2 — 15.00 (ільготны) Амаральныя гісторыі, 29, 31 — 16.50, 18.40, 20.30; 30, 1-3 — 16.50, 18.40 Відэапаказ, 28-3 — 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Для дзяцей: Хон Гіль Дон, 19, 3 — 13.30

МАСКВА *(пр. Машэрава, 13, тэл. 231-448, 231-533)* – Тры жаданьні (П.Муэйз у добрым сямейным фільме), 28-2 — 16.10, 21.20; 3 —14.30 (ільготны), 19.30, 21.30 Спаборніцтва, 28-2 — 18.10; 3 — 16.20 Дзіцячая дыскатэка "Лімпапо", 2 — 14.00; 3 — 12.00

МІР *(Казлова, 4а, тэл. 333-771)* – Сабакі пекла (новы стэрэафільм), 28-31 — 14.00, 16.00, 18.00, 20.00; 1 — 14.00, 16.00, 18.00, 19.30; 2-3 — 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 19.30 Прыдуркі ў Галівудзе, 28-31 — 13.00, 17.00, 21.00; 1-3 — 13.00, 17.00 Куля ў палёце, 28-3 — 15.00, 19.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 1-3 — з 20.00 па 23.00

ПАРТЫЗАН *(Талбухіна, 18, тэл. 663-526)* – Куля блукае, 21-23, 25-27 — 16.00, 19.15, 21.00; 24 — 16.00 (ільготны), 19.15, 21.00 На халяву, 21-27 — 17.45 За цудоўных дам!, 25 — 14.30 (дабрачынны) Для дзяцей: Сьвет казак (кіналектар), 21-22 — 12.00

ПЕРАМОГА *(Інтэрнацыянальная, 20, тэл. 237-245)* – Казка на ноч, 28-3 — 15.00, 17.00 Кінаклюб "Гімэнэй": Назіральнік жахаў, 28-3 — 19.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 30-4 — 21.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма для дзяцей і падлеткаў, 4 — з 16.00 па 18.00 Дэнс-шоў, 2-3 — з 24.00 па 6.00

ПІЯНЭР *(Энгельса, 20, тэл. 278-945)* – Кабарэ (2 сэрыі), 28 — 19.00 Кроўныя повязі, 28 — 15.00, 17.00; 29-31 — 15.00, 19.00; 1 — 15.00; 2-3 — 17.40 Гарачыя галовы, 28 — 13.00; 29-30 — 13.30, 17.00; 2-3 — 14.10 Гарачыя галовы-2, 1 — 13.10, 17.00; 2-3 — 16.00 Для дзяцей: На залатым ганку сядзелі..., 28-30 — 10.00 Выпадкі ў квадраце 36-80, 28-30 — 11.30 Ягорка, 31-1 — 10.00 Восьмы цуд сьвету, 31-1 — 11.30 Цудоўны лес, 2-3 — 10.30 Зорныя войны, 2-3 — 12.00

РАДЗІМА *(Лізы Чайкінай, 16, тэл. 426-779)* – Памерці за..., 28 — 15.00 (ільготны), 18.00; 30-3 — 15.00, 18.00 Трое мужчынаў і немаўля, 28, 30-31 — 16.20, 20.20; 1-3 — 16.20 Музычна-забаўляльная відэапраграма, 28 — з 18.00 па 22.00 Музычна-забаўляльная праграма, 1-3 — з 19.00 па 24.00 Відэа-дыска-шоў для падлеткаў, 30 — з 18.00 па 21.30 Клюб знаёмстваў (для тых, каму за 30), 31 — з 19.00 па 23.00 Відэазаля: Маленькі цягнік (для дзяцей), 30-3 — 16.00 Купак Паўночнай зоркі, 30-3 — 18.00 Гэтакі круты ўблюдак, 30-3 — 20.00 У кінатэатры працуе відэабар. Для дзяцей: Восеньскі падарунак фэяў, 30-31 — 10.30; 2-3 — 13.30 Кінаклюб "Казка", 31 — 12.00 Кінаклюб "Падлетак", 31 — 15.00

РАКЕТА *(Рабочы зав., 3, тэл. 260-620)* Маладая лэдзі Чатэрлей, 28-31 — 17.00, 20.00; 2-3 — 15.00, 18.20, 20.00 Жандар і жандармэткі, 28-31 — 18.40; 2-3 — 16.40 Відэапаказ, 28-30 — 16.50, 19.00; 2-3 — 15.30, 17.40

САЛЮТ *(пр. Ракасоўскага, 150а, тэл. 474-167)* – На халяву (крымінальная камэдыя), 28-31, 2-3 — 16.00, 19.40 Хуткасьць, 28-31 — 17.40, 21.20; 2-3 — 14.00, 17.40, 21.20 Начны танцавальны рух, 1-2 — з 21.00 па 6.00

СУЧАСЬНІК *(Харкаўская, 70а, тэл. 515-563)* – Паварот лёсу, 28-2 — 15.00, 18.30; 3 — 18.30 Спакушэньне, 28-3 — 16.30, 20.30 Для дзяцей: Залаты цюлень, 30 — 14.30 Непераможная нага, 3 — 15.00

СЬЦЯГ *(Вялікаморская, 3, тэл. 211-009)* – Трам-тарарам, ці Бухты-Барахты (у галоўнай ролі А.Панкратаў-Чорны), 28-29, 1 — 16.30; 2-3 — 12.30, 16.30 Шукаецца герой ("Атрад паліцыі КАФС"), 28-29, 1 — 18.30, 20.00; 2-3 —14.00, 18.30, 20.00 Для дзяцей: Мэтычара-зьвер марскі 2, 11.00 Хітрая варона (мультфільмы), 3 — 11.20

УДАРНІК *(Жукоўскага, 15б, тэл. 259-630)* – Аднойчы ў Амэрыцы (фільм I), 28-3 — 15.30 Аднойчы ў Амэрыцы (фільм II) 2 сэр., 28-3 — 16.40 Спакушэньне, 28-3 — 19.20 Для дзяцей: Вельмі страшная гісторыя, 30 — 14.00 Мультфільмы (зборнік), 2-3 — 14.00

ЦЭНТРАЛЬНЫ *(пр. Ф.Скарыны, 13, тэл. 208-297)* – Праз каналізацыю, 28-3 — 11.00, 14.20, 17.40, 21.00 Каханьне і магія, 28-3 — 12.45, 16.05, 19.25

ЭЛЕКТРОН *(Казінца, 117, тэл. 789-563)* – Скінь маці зь цягніка, 28-1 — 13.40, 18.10; 2-3 — 17.10 Скарпіён, 28-1 — 16.30, 21.00; 2-3 — 15.30, 21.00 Сьледчы, 28-1 — 12.20, 15.10, 18.40; 2-3 — 19.40 Копі цара Салямона, 2-3 — 13.00 Парыскія гарэзьніцы, 2-3 — 14.30, 18.40 Кошт квітку — 2000 руб. Для дзяцей: Вялікія прыгоды Зора, 2-3 — 11.30

Відэасалён:

Перакрыжаваньне сьветаў (Рэжысэр Крышна Ра, у галоўнай ролі Рутгэр Хаўэр, ЗША, фантастычны баявік).

Тэатры

29 кастрычніка — 4 лістапада

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТАР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

30 серада – М.Задорнаў. Таполевая завея. Камэдыя ў 2-х частках.

31 чацьвер – Я.Купала. Паўлінка. Камэдыя ў 2-х дзеях.

Малая сцэна

30 серада, 31 чацьвер – А.Чэхаў. Чайка. Камэдыя ў 4-х частках.

ВОЛЬНАЯ СЦЭНА

1 пятніца – Віта Брэвіс або Нагавіцы сьвятога Георгія. М.Адамчык, М.Клімковіч. Фарс-рэпэтыцыя

4 панядзелак – Юбілейны вечар заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, прафэсара А.І.Бутакова

ДЗЕ-Я

29, АЎТОРАК 19.00

30, СЕРАДА 19.00 Прэм'ера камэдыі "Жаніцьба", М.Гогаль.

31, ЧАЦЬВЕР

1, ПЯТНІЦА 19.00 "Здань", Ф.Аляхновіч.

2, СУБОТА 19.00

3, НЯДЗЕЛЯ 19.00 "Круці...", Ф.Аляхновіч.

КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛЯ "МЕНСК"

30 кастрычніка –Валянціна і Дуфуня Вішнеўскія і цыганскі табар (шоў-праграма). Рэжысэр — Д.Вішнеўскі

УСЁ ПРА ЎСЁ

КУЛЬТУРА

У РУМЫНІІ ПАБУДАВАНЫ ПОМНІК ЗАСНАВАЛЬНІКУ ДАДАІЗМУ

На пачатку кастрычніка румынскія афіцыйныя асобы адкрылі помнік у гонар 100-х угодкаў з дня нараджэньня заснавальніка эксцэнтрычнага накірунку ў мастацтве - дадаізму - Трыстана Цары (Tzara) у яго родным горадку Майнэшці (Moinesti). Помнік з бэтону вышынёй 13 мэтраў і шырынёй 2.6 мэтры, які выкананы нямецкім скульптарам Інга Глясам, узвышаецца над дарогай, што вядзе ў Майнэшці. Помнік уяўляе сабой камбінацыю літараў, каторыя злучаюцца ў слова "Dada", вынайдзенае Царам падчас Першай сусьветнай вайны для азначэньня новай плыні ў мастацтве. Цара пакінуў Майнэшці падлеткам і перабраўся ў Швэйцарыю, а потым пераехаў у Францыю. Ён набыў шумную вядомасьць, чытаючы ўласныя вершы ў адной з кавярняў Цюрыха ў кампаніі такіх самых мастакоў-нонканфармістаў. Цікава тое, што ў той жа час у гэтым утульным швэйцарскім горадзе жылі такія гістарычныя асобы, як кат Джэймс Джойс і Ленін. Дадаізм адкідваў традыцыйнае мастацтва і спрабаваў шакіраваць публіку шляхам выкарыстаньня нонканфармісцкіх і іррацыянальных ідэяў. Сярод яго найбольш знакамітых прадстаўнікоў - француз Марсэль Дзюшамп і амэрыканскія мастакі Эндзі Ўорхол і Джаспэр Джонс.

ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛЁГІІ

"PLAYBOY" АДКРЫВАЕ ТЭЛЕСЕТКУ Ў ЛАЦІНСКАЙ АМЭРЫЦЫ

У аўторак, 8 кастрычніка, кампанія "Playboy Enterprises Inc." абвясьціла пра тое, што аб'яднаўвае намаганьні з "Cisneros Television Group" для запуска дзьвюх новых тэлевізійных сетак "Playboy TV/Latin America" і "AdultTVision/Latin America". Яны стануць часткай новага прадпрыемства, якое называецца "Playboy TV Latin America LLC". "Cisneros Television Group" абвяшчаецца падраздзелам карпарацыі "Cisneros Group of Cos.", якая валодае тэлестанцыямі па ўсёй Лацінскай Амэрыцы. Ягоная доля ў новым прадпрыемстве складае 81 %, у "Playboy" – астатнія 19 %. Акрамя таго, "Playboy" будзе атрымліваць аплічэньні за ліцэнзаваньне перадачаў і выкарыстаньне гандлёвай маркі "Playboy" у праграмах платнага тэлебачаньня. Сьпярша каналы "Playboy" і "AdultTVision" будуць трансьлявацца на эксклюзіўнай аснове карпарацыяй "Galaxy Latin America", якая прапануе тэлегледачам з 144 спадарожнікавых тэлеканалаў. Новыя каналы дадаюць ужо існуючыя тэлесеткі "Playboy" у Англіі ды Японіі.

МУЗЫЧНЫЯ НАВІНЫ

1. Гэры Чэроўн з Extreme, магчыма, стане новым вакалістам гурта Van Halen. Гэта азначае, што шанцы атрымаць асалоду ад гучаньня "хітовых" кампазыцыяў "I Can't Drive '55" і "Just a Gigolo" на канцэртах Van Halen рэзка зьменшацца (выключэньнем можа стаць хіба што адна "More Than Words"). Тым часам аўтар песень Extreme Нуна Бэтанкур таксама ня дрэмпе: ягоны сольны альбом павінен выйсьці ў студзені 1997 года.

2. "Ракавая жанчына" незалежнай музыкі з Чыкага Ліз Фэер зьбіраецца памяняць свой статус і стаць "ракавой матуляй" 90-х. Калі верыць паведамленьням, вядомая выканаўка і аўтар песень чакае ў будучым годзе нараджэньня дзіцяці. Да таго часу Фэер можа пасьпець таксама выпусьціць новы запіс на студыі Matador Records.

3. Гітарыст Джон Скуайр, які раней граў у Stone Roses, арганізаваў новы гурт пад назвай The Sea Horses. Для гэтага праекта Скуайр (чый кантракт з Geffen Records яшчэ, дарэчы, ня скончыўся) аб'яднаўся з вакалістам зь Нью-Ёрка Крысам Хэлмі і басістам Сьюартам Флэтчэрам. Апроч таго, да гурта можа далучыцца былы барабаншчык "Каменных ружаў" Рэні.

ВІДЭА

28 – кастрычніка 3 – лістапада

НОВЫЯ ФІЛЬМЫ:

"ГАРАЧАЯ КРОЎ-2"

ЗША, 1996, 82 хвіл, Маст/кам ацэнка: 3.0/3.5, Red Blooded 2; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. Рэж. Дэвід Блайт, у р. Кэры Сэлін, Крыстофэр Райэн Вінтэрс, Бэрт Янг. Круты "гарачы" баявік з элемэнтамі драмы і трылера, які вытрыманы ў духу папулярных "дарожных фільмаў-экшн" (напрыклад, "Спадарожніка").

"АДЗІН У ЛЕСЕ"

ЗША, 1996, 92 хвіл, Маст/кам ацэнка: 2.5/3.5, Alone In The Woods; узроставае абмежаваньне: дзецям варта глядзець яго разам з бацькамі. Рэж. Джон Путч, у р. Ларэйн Ньюмэн, Мэт'яс Х'юз, Дэн Маквікар. Камэдыя ў стылі "Адзін дома". Ізноў адзін маленькі хлопчык змагаецца супраць двух бандытаў...

"РАКАВЫЯ ЯЙКІ"

1996, 118 хвіл, Маст/кам ацэнка: 3.5/3.5, Роковые яйца; узроставае абмежаваньне: ад 13 гадоў <СР>. Рэж. Сяргей Ломкін, у р. Алег Янкоўскі, Гарык Сукачоў, Сямён Фарада, Аляксей Жаркоў, Аляксандар Шырвінт, Міхаіл Казакоў, Мікалай Ігнатаў. Камэдыя-драма-прытча, што зьнятая паводле аднайменнай повесьці М.А.Булгакава "Ракавыя яйкі".

"КАЛІ Б ГЭТЫЯ СЬЦЕНЫ МАГЛІ РАЗМАЎЛЯЦЬ"

1996, 95 хвіл, Маст/кам ацэнка: 4.0/3.5, If This Walls Could Talk; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. Рэж. Нэнсі Савока, у р. Демі Мур, Шэр, Сісі Спэйсэк. Сацыяльная драма зь лепшымі галівудзкімі акторкамі. Душашчыпальнае кіно пра праблему абортаў...

АПРОЧ ГЭТАГА:

"ЛЯЛЕЧНАЯ ГІСТОРЫЯ" (TOY STORY)

адна з самых касавых мультпоўнамэтражак (200 млн.$!) студыі Ўолта Дыснэя. Толькі зараз у Менску зьявілася копія мультфільма ў "лязэрнай" якасьці);

"УЦЕКАЧЫ" (FLED)

баявік. В р. Стывэн Болдуін, Лоўрэнс Фішборн); "Кватэра Джо" (Joe's Appartment; "прусаковая" камэдыя. У р. Джэры О'Конэл, Мэган Ворд);

"СІЛА ЖЫЦЬЦЯ / ПЕРАМОЖЦА АТРЫМАЕ ЎСЁ" (EVERYTHING TO GALE)

трылер. У р. Шон Янг, Джэк Скалія);

"БАРХАНАЎ І ЯГОНЫ ЦЕЛААХОЎНІК"

(камэдыя. У р. Ігар Бочкін, Віктар Ракаў, Ларыса Ўдавічэнка).

***Фільмы прадастаўленыя студыяй "TON video" т. (017) 233-92-30.*

Прыглядалася Тоня ВІДЗЕНКОВА

ПРЫСАДА ЗАЛАТОЙ АНТЫЛОПЫ:

— Актор-рэжысэр Том Хэнкс, які скончыў вытворчасьць свайго фільма "Зроблена на славу" (The Thing That You Do), прыгадвае зараз, якія парады ён атрымаў ад прафэсіяналаў, калі толькі пачынаў здымаць. Напрыклад, Рон Хаўард казаў яму, што самыя лепшыя фільмы сьвету былі шырокафарматнымі. Майк Нікалс папярэдзіў: "У цябе ніколі ня будзе хапаць стужкі". Ну а самую лепшую параду, на думку Хэнкса, даў Гары Маршал: "Мяняй абутак падчас ланчу".

— Сэмюэл Л. Джэксан мог бы паказацца няўдзячным, калі б ня меў цалкам рацыю. Так, ягоная роля ў фільме Квэнціна Таранціна "Бульварнае чытво" (Pulp Fiction) прынесла яму намінацыю на "Оскар". Але ці робіць гэта рэжысэраў добрымі акторамі? На думку Джэксана, не. "Квэнцін заўсёды жадаў быць кіназоркай,— гаворыць Сэм.— Ён не дапускае таго, што ён — добры рэжысэр і добры пісьменьнік, але вельмі пасрэдны актор. Квэнцін жадаў, каб "Бульварнае чытво" зрабіла для яго тое, што "Рокі" для Сталонэ. Такой была ягоная стаўка. Ён думае, што стварыў новых герояў і толькі адны крытыкі мелі мужнасьць сказаць яму, што не". Сэм далей казаў пра Спайка Лі: "Спайк заўсёды Спайк, нягледзячы на тое, якога пэрсанажа ён спрабуе граць. Але гэта яго не спыняе ад здымак у фільмах". Джэксан, які нядаўна пачаў здымацца ў стужцы "The Long Kiss Goodnight", мае шанцы атрымаць "Оскара" ў намінацыі "лепшы актор" за ролю помсьлівага бацькі ў фільме "Час забіваць" (A Time To Kill), які зьняты рэжысэрам Джоэлем Шумахерам, які (калі ведае, што для яго добра) ніколі ня стане перад камэрай.

— Вам хацелася б даведацца, чаму Дастын Хофман, а не Аль Пачына зьняўся ў галоўнай ролі ў фільме "Амэрыканскі буфала" (American Buffalo), бо гэта менавіта яму належала ідэя ўзнавіць п'есу Дэвіда Мэмэта. Хофман тлумачыць гэта так: "Рэжысэр (Міхаэл Карэнтэ) прапанаваў гэтую ролю Аль Пачына, але той запатрабаваў іншага рэжысэра". Тады Карэнтэ зьвярнуўся да Хофмана, які таксама адмовіўся і растлумачыў гэта тым, што не жадае быць уцягнутым ў гэтую справу. Тымчасам Мэмэт зьмірыўся з рэжысэрам, які ўсё яшчэ спрабаваў прыцягнуць Хофмана. На пытаньне, ці не адчувае ён "дух" Аль Пачына, "які лунае над праектам", Хофман адказаў, што гэта яго крыўдзіць, калі так кажуць. Яшчэ да Аль Пачына гэтую ролю граў Робэрт Д'ювал у Нью-Ёрку на Брадвэю і, на ягоную думку, выканаў яе бліскуча.

САМАЕ СЬВЕЖАЕ ЗЬ ВІДЭАХІТОЎ
TON video
т. 233-92-30

4. У мінулы ўік-энд Майклу Джэксану нарэшце атрымалася прарвацца ў Паўднёвую Карэю. Ён выступіў на Алімпійскім стадыёне ў Сэуле, які прымае 60,000 гледачоў. Аднак нападжвальнікі канцэртаў здолелі прадаць толькі 70 % білетаў. Ня выключана, што такія невясёлыя паказчыкі сталі вынікам дзеньня 50 грамадзкіх і рэлігійных груп, што не прымаюць музыкі і паводзінаў Джэксана на сцэне, а таксама даўніх абвінавачаньняў яго ў растленьні малых дзяцей. Толькі пасьля некалькіх месяцаў правапорак паўднёвакарэйскі ўрад (ў прыватнасьці, Міністэрства культуры) пагадзіўся на ягоныя выступы пры ўмове, што падчас канцэртаў ён устрымаецца ад непрыстойных рухаў і выказваньняў.

СКАНДАЛЫ

ГАЗЭТА ПРЫЗНАЕ, ШТО НАДРУКАВАЛА ФАЛЬШЫЎКУ

Адна з самых масавых ангельскіх бульварных газэтаў The Sun абвясьціла, што відэазапіс, на каторым нібыта зазьнятая сцэна спатканьня 35-цігадовай прынцэсы Даяны зь яе былым каханкам Джэймсам Х'юітам, на самой справе зьяўляецца "адным з найбольш эпатажных розыгрышаў дзесяцігодзьдзя". У заяве, якую перадалі брытанскім сродкам масавай інфармацыі, газэта прызнае, што "трапілася на вуду незвычайна поўкім махлярам". Відэазапіс працягласьцю 80 сэкундаў быў прапанаваны рэдактару The Sun падчас таемнай сустрэчы з двума мужчынамі, якія дзейнічалі ў якасьці пасрэднікаў. На пачатку кастрычніка ў адным з нумароў на сваёй першай пласе газэта надрукавала фатаздымкі, зробленыя на аснове гэтага відэазапісу. На адным з фатаздымкаў жанчына, падобная да Даяны, распранаецца да спартовых трусікаў і ліфчыка ў прысутнасьці мужчыны. На другім яна сядзіць у мужчыне на сьпіне, на трэцім - ігрыва кідаецца падушкамі. Праз свайго прадстаўніка Даяна заявіла, што не пазнае ні сябе, ні Х'юіта на фатаздымках, надрукаваных у газэце. Гэты чорна-белы відэазапіс вельмі кепскай якасьці толькі пацьвярджае апасеньні Даяны, што за ёй ідзе сапраўднае назіраньне з тае пары, як яна расталася з прынцам Чарльзам пасьля 15 гадоў сужэнскага жыцьця. Раней прынцэса Ўэльская не адпойчы сьцьвярджала, што яе тэлефонныя размовы праслухоўваюцца. Стэнаграмы тэлефонных званкоў, якія яна рабіла са сваім знаёмым мужчынам, незразумелым чынам пэрыядычна зьяўляліся ў ангельскай прэсе. У мінулым годзе Даяна прызналася ў любоўнай сувязі з капітанам Х'юітам, якая доўжылася пяць гадоў. У сэнсацыйным тэлеінтэрвію BBC яна заявіла, што проста "душы ў ім ня чала". "Махляры здолелі нас пераканаць у тым, што на відэазапісу двое занятых любоўнай гульнёй людзей на самой справе зьяўляюцца прынцэсай Уэльскай і Джэймсам Х'юітам", гаворыцца ў заяве. Рэдактар The Sun Сьюарт Хігінз узяў на сябе ўсю адказнасьць за такую памылку і паабяцаў папрасіць прабачэньня перад прынцэсай і Х'юітам пісьмова.

Падрыхтоўка матэрыяла і пераклад на расейскую мову ІА "ЭКАПРЭС", 1996.

КАЛІ ВЫ ВЫРАШЫЛІ НАБЫЦЬ КАМПУТАР

Уявім, Вы вырашылі набыць IBM-сумяшчальны кампутар. Фірмаў-вытворцаў такіх кампутараў вельмі шмат, бо фірма IBM зрабіла гэта адным з асноўных момантаў сваёй рынкавай стратэгіі (у адрозьненьне ад таго ж Apple, што манапалізаваў вытворчасьць "Макінтошаў"). Для спажыўца гэтая рынкавая палітыка разам са станоўчымі рысамі (ёсьць выбар, канкурэнцыя ў адным сэктары рынку) нясе ў сабе і небясьпеку: IBM-сумяшчальныя кампутары моцна адрозьніваюцца адзін ад аднога ў якасьці — у залежнасьці ад фірмы-вытворцы. Патэнцыйным пакупніком "Макінтошаў" гэта не пагражае.

БЕЛЫЯ, ЧЫРВОНЫЯ, ЖОЎТЫЯ...

Кампутары вырабляюць розным чынам.

Можна сабраць канструктарскі і вытворчы патэнцыял у адной фірме і прадаваць кампутары пад фірмовай маркай (IBM, Dell, Hewlett Packard, Compaq, Acer і інш.) праз сетку сваіх прадстаўніцтваў. У гэтым выпадку кажуць, што фірма прадае Brand Name — кампутары "белай зборкі". Насуперак распаўсюджанаму меркаваньню, гэта зусім не азначае, што такія кампутары зьбіраюць абавязкова ў Амэрыцы ці Эўропе. Завод можа знаходзіцца дзе заўгодна (напрыклад, у той жа Паўднёва-Усходняй Азіі). Сутнасьць у тым, што сама фірма-вытворца дае гарантыю таго, што магчымыя няспраўнасьці будзе адносна лёгка выправіць, трэба толькі зьвярнуцца ў сэрвісную сетку. Такім чынам, адрозьненьне кампутара Brand Name у тым, што пры ўзьнікненьні праблемаў можна сьмела ісьці ня ў краму, што яго прадала, а ў прадстаўніцтва фірмы, адрэса якога павінна быць паведамленая Вам пры пакупцы.

Іншы спосаб вытворчасьці кампутараў — арганізацыя завода па вытворчасьці кампутараў з камплектуючых, ці непасрэдная зборка кампутараў з камплектуючых проста ў гандлёвай фірме. Калі кампутар сабралі такім чынам у трэціх краінах, то кажуць, што ён "жоўтае зборкі".

Пад вызначэньне "чырвонай зборкі" падпадаюць кампутары, сабраныя ў Расеі.

Кампутар — гэта адладжаная праца электонікі і праграмаў. Вядучыя вытворцы гэтай тэхнікі правяраюць працу сваіх кампутараў з сотнямі найбольш папулярных праграмаў. Таму кампутары "белай зборкі" больш надзейныя за іншыя і, адпаведна, кошт у разы паўтары большы. Высокі кошт на іх абумоўлены яшчэ і тым, што вядомая фірма забасьпечвае сваім пакупнікам вялікую колькасьць пасьля продажных паслугаў. На Захадзе так і адбываецца. Але ў нас, дзе аб'ём прадажаў "белай" тэхнікі на сусьветныя паняцьці пакуль маленькі, фірмам проста нявыгадна разварочваць гандлёвую сетку. Таму, набываючы кампутар "белай зборкі", мы крыху пераплочваем за тое, чаго на самой справе не атрымліваем.

Ёсьць і яшчэ адна праблема з кампутарамі Brand Name. Як правіла, вытворца прыкладае да іх гарантыю на некалькі год. Але канфігурацыя кампутара часта старэе хутчэй, чым сканчаецца тэрмін гарантыі, і кампутар патрабуе мадэрнізацыі. Для кампутараў "жоўтай" і "чырвонай" зборкі праблемы зьмены канфігурацыі не існуе: мноства фірмаў у Расеі спэцыялізуецца, напрыклад, на мадэрнізацыі 286-х кампутараў у 386-я. У выпадку ж кампутара Brand Name зьмена канфігурацыі вельмі складаная, бо ў іх мадэрнізацыю можна рабіць часта толькі з выкарыстаньнем камплектуючых менавіта гэтай фірмы. Натуральна, такая апэрацыя абыходзіцца даражэй. Акрамя таго, пры зьмяненьні канфігурацыі без удзелу фірмы-вытворцы Вы губляеце права на гарантыйнае абслугоўваньне.

Найбольш танныя кампутары "чырвонай зборкі". Тлумачыцца гэта і больш нізкімі транспартнымі, мытнымі і іншымі выдаткамі, і тым, што расейскія зборшчыкі часта выкарыстоўваюць нетэставаныя дэталі, верагоднасьць паломкі каторых вышэй, чым у пратэставаных. (Дарэчы, пры "жоўтай" зборцы часьцей выкарыстоўваюцца пратэставаныя дэталі). Гэта, канешне, не азначае, што Ваш "чырвоны" кампутар абавязкова праз месяц зломіцца, а "белы" ня зломіцца ніколі. Проста верагоднасьць адказу ў першым выпадку больш высокая. Зь іншага боку, пры ўзьнікненьні нейкіх праблемаў з кампутарам "чырвонай" зборкі выправіць сытуацыю можа не абавязкова вытворца, але і проста адукаваны спэцыяліст-кампутаршчык. Больш таго, большасьць расейскіх фірмаў зараз даюць гарантыю на свае кампутары, а таксама забясьпечваюць даволі шырокі спэктар пасьляпрадажных паслугаў.

Ёсьць кампутары "чырвонай" зборкі, якія робяцца на замову ў незаводзкіх умовах. Але гэта зусім іншая размова...

КАНФІГУРАЦЫЯ

Аднак выбар кампутара — гэта выбар ня столькі маркі машыны, колькі ейных характарыстык. Выбар канфігурацыі залежыць ад Вашых мэтаў і задачаў — ад праграмнага забесьпячэньня, зь якім Вы зьбіраецеся працаваць на кампутары.

1. Выбіраючы паміж 386-м і 486-м

Галоўны элемэнт любога кампутара — працэсар. Менавіта ён робіць усе падлікі, выдае заданьні і кантралюе іхнае выкананьне ўсімі модулямі (клявіятура, дысплей, прынтар і г.д.). Ад характарыстык працэсара ў вялікай ступені залежыць хуткадзейнасьць кампутара.

Напэўна, Вы ведаеце, што працэсары (а, адпаведна, і самі кампутары) бываюць 286-я, 386-я і 486-я, а таксама стары 86-ы і сучасны Pentium, каторыя мы тут не разглядаем.

Сьпярша трэба выбраць магутнасьць працэсара. Найперш Вам трэба ведаць, што магутнасьць працэсара можа адрозьнівацца ня толькі па лічбах (286, 386, 486), але і па літарах, якія стаяць у маркіроўцы за лічбамі (SX, DX, DX2, DX4). Пасьлядоўнасьць узрастаньня магутнасьці наступная: 286, 286/287, 386SX, 386/387SX, 386DX, 386/387DX, 486SX, 486DX2, 486DX4. Мадэлі, нумары каторых сканчаюцца на 7, маюць матэматычны супрацэсар, які дазваляе рабіць матэматычныя падлікі.

Набываць 286-ы кампутар ужо ня варта — такія кампутары маральна састарэлі. Новыя праграмы, хутчэй за ўсё, на ім працаваць ня будуць, старых жа Вам проста хутка ня будзе хапаць. Напрыклад, на 286-х кампутарах нельга працаваць з Windows і гуляць у Doom. Таму, для выбару 286-га кампутара аргумэнт "жадаю набыць самы танны" не падыходзіць — ня трэба блытаць аўтамабіль і матацыкаль з каляскай.

Далейшы выбар залежыць ад асаблівасьцяў Вашай працы. Калі Вы працуеце, у асноўным, з тэкставымі файламі, невялікімі базамі дадзеных і простымі электроннымі табліцамі, то мадэлі 386SX Вам цалкам хопіць. Калі праца зьвязаная з графікай, асабліва каляровай, ці вёрсткай, то найлепш, канешне, набыць мадэль 486. Калі Вы думаеце набываць да кампутара разнастайныя дадаткі (кшталту мультымэдыя — прайгравальніка для лязэрных дыскаў (CD-rom) ці sound blaster), то лепш 486 ці нават больш моцны. Калі Вы шмат працуеце ў абалонцы Windows, прычым адначасова і з тэкстам, і з табліцамі, то кампутар магутнасьцю меней, чым 486DX Вас расчаруе. Але калі Вы аддаеце перавагу DOS і ня вельмі складаныя праграмы, то 486-ы кампутар можа падацца Вам занадта шыкоўнай пакупкай. Трэба таксама мець на ўвазе, што на 486-м кампутары вельмі нязручна граць у Public і Tetris, створаныя ў эпоху 286-х: кубікі падаюць вельмі хутка.

Зрэдку назва мадэлі кампутара пачынаецца зь літары "і" (і386, і486). Гэта азначае, што працэсар кампутара выраблены фірмай Intel — лідарам у гэтай галіне. Тое самае паведамляе і надпіс Intel Inside. Гэтыя кампутары, як правіла, больш дарагія, але ўжо праблемаў з такім працэсарам ня будзе (могуць быць праблемы з іншымі складнікамі).

А ўвогуле, чым мацней кампутар, тым прыемней зь ім працаваць. Ня варта забываць і іншае: новыя праграмы пішуцца, як правіла, пад найноўшыя кампутары і часта на менш магутных не працуюць. Так што калі Вы працуеце з сучасным праграмным забесьпячэньнем і не жадаеце мяняць кампутар праз год, то набывайце больш магутную машыну.

2. Тактавая частата

Чым тактавая частата болей, тым лепш. Гавораць таксама, "адрозьненьне ў тактавай частаце сутнасна ў рамках адной клясы кампутараў, але ня мае асаблівай значнасьці пры пераходзе ад клясы да клясы". Таму, калі Вам прапануюць за адзін і той самы кошт кампутар з тактавай частатой у 33 МГц і ў 60 МГц (пры астатніх роўных умовах) — набывайце апошні.

3. Апэратыўная памяць

Яна бывае 2, 4, 8 ці 16 Мбайт (ня блытайце гэта з характарыстыкамі жорсткага дыску — гл. ніжэй). Ад ейнай велічыні залежыць, праграмамі якой клясы Вы зможаце карыстацца. Так, для працы ў DOS дастаткова 2-х Мбайт, для працы ў Windows і гульні кшталту Doom лепш мець 4 Мбайта, а для працы з добрымі графічнымі пакетамі патрэбны ўсе 8 Мбайт.

Сытуацыю, у каторай непрафэсійнаму карыстальніку спатрэбяцца 16 Мбайт апэратыўнае памяці, уявіць цяжка. Але ўсё-ткі трэба мець на ўвазе, што чым болей, тым лепей (калі, канешне, ёсьць грошы), а купляць менш 4 Мбайт наўрад ці мэтазгодна.

АБ'ЁМ ЖОРСТКАГА ДЫСКУ: ЧЫМ БОЛЕЙ, ТЫМ ЛЕПЕЙ

Адной з самых важных і зразумелых для карыстальніка характарыстык зьяўляецца памер ягонага вінчэстэра — жорсткага дыска, на якім захоўваецца інфармацыя. Пры вызначэньні аптымальнага для Вас аб'ёму вінчэстэра арыентуйцеся на больш высокія характарыстыкі. Адзінка дыскавай памяці ня вельмі дарагая, акрамя таго, ейны кошт увесь час паніжаецца — таму набывайце ня менш за 120 Мбайт. Калі ж Вы зьбіраецеся працаваць з Windows і праграмамі пад Windows ці гуляцца ў прыгожыя сучасныя гульні, то неабходны мінімум — 210 Мбайт.

Памятайце, што самыя сучасныя праграмы, як правіла, займаюць шмат часу. Так што ў любы момант памяць Вам абавязкова спатрэбіцца.

ДЫСКАВОДЫ: ЛЕПШ 3, ЧЫМ 5

Пры выбары кампутара трэба зьвярнуць увагу на тып дыскаводаў — прыстасаваньняў для счытваньня інфармацыі з дыскетаў. Дыскеты бываюць 3-х дзюймовыя і 5-ці дзюймовыя. 3-х дзюймовыя дыскеты могуць быць аб'ёмам 720 Кілябайт (маркіроўка DD) ці 1,44 Мэга-Байты (HD); 5-ці дзюймовыя — 360 Кб (DS), 720 Кб (DD) і 1,2 Мб (HD). Важнейшы парамэтар дыскавода — шыльнасьць запісу, якая ўказвае на тое, з дыскетай якога аб'ёму ён можа працаваць. Трэба прасачыць, каб 3-х дзюймовы дыскавод быў разьлічаны на працу з дыскетамі 1,44 Мб, а 5-ці дзюймовы — з дыскетамі 1,2 Мб. Калі кампутар мае абодва тыпы дыскаводу, то гэта цудоўна. Але памятайце, што 5-ці дзюймовы стандарт паступова адмірае і пры жаданьні сэканоміць грошы абмяжуйце свой выбар 3-х дзюймовым дыскаводам.

МАНІТОРЫ: VGA ЦІ SVGA

У продажы можна сустрэць маніторы (дысплеі), якія даюць монахраматычную выяву (часьцей чорна-белую) ці каляровую выяву.

Адрозьніваюць некалькі тыпаў маніторaў: GGA, EGA, VGA і SVGA. Яны валодаюць рознай якасьцю адлюстраваньня выяваў, што фарміруюцца ў самім кампутары. Ведайце, што маніторы GGA і EGA маральна састарэлі (некаторыя праграмы ня могуць на іх працаваць), і калі Вам прапануюць набыць іх — не рабіце гэтага. Купляйце VGA, а яшчэ лепш — SVGA.

Выява на экране ўтвараецца з мноства кропак (зерняў), якія сьвецяцца. Памер іх вызначае дазваленьне дысплея, гэта значыць яснасьць ўзнаўленьня дробных дэталяў выявы. Чым драбнейшыя зерні, тым больш ясная выява і, адпаведна, даражэйшая прылада. Стандартныя значэньні памеру зерняў — 0,39 мм і 0,28 мм.

Паляпшае якасьць выявы так званая прагрэсіўная разьвёрстка. Пры яе выкарыстаньні выява фарміруецца не ў 2 этапы (сьпярша цотныя, потым няцотныя строкі), а адначасова. На маніторах, якія выкарыстоўваюць прагрэсіўную разьвёрстку, стаіць метка Non Interlaced.

Яснасьць узнаўленьня выявы — ня столькі тэхнічная, колькі эрганамічная характарыстыка. Ад гэтага паказчыка залежыць стамляльнасьць Вашых вачэй і проста самаадчуваньне пры працы на кампутары. Так што, калі Вы зьбіраецеся праводзіць за кампутарам шмат часу, не эканомце на сваім здароўі і набывайце манітор зь зернем 0,28. Дапаможа Вам і спэцыяльнае антыблікавае пакрыцьце, якое зрэдку наносяць на шкло. Яно зьмяншае адбітак сьвятла ад вокнаў і лямпаў асьвятленьня.

Пры працы манітор зьяўляецца крыніцай электрамагнітных выпраменьваньняў, якія аказваюць негатыўнае ўзьдзеяньне на здароўе чалавека. Але вось выпраменьваньне ад маніторaў Low Radiation практычна бясьпечнае для чалавека, бо яны адпавядаюць швэдзкаму стандарту MR-II, найбольш жорсткаму з усіх. Калі набыты Вамі дысплей не Low Radiation, то Вам абавязкова трэба набыць спэцыяльны абарончы экран, які б адпавядаў стандарту MR-II.

Пры пакупцы зьвярніце ўвагу на крывізну экрана. Справа на тое, што пры вялікай крывізьне прастакутныя выявы пры поглядзе на экран пад простым вуглом будуць здавацца барылкападобнымі. Крывізна экрана ў сваю чаргу залежыць ад ягонай велічыні. У залежнасьці ад памера па дыяганалі адрозьніваюць 14, 15, 17, 19-ці і г.д. дзюймовыя экраны (гэта адпавядае прыблізна 36, 38, 43 і 49 см). Найбольш распаўсюджаны экран 14', і ён цалкам падыходзіць для большасьці карыстальнікаў. Але для тых, хто мяркуе займацца графічнымі працамі (рэкляма, мастацкая вёрстка і г.д.), спатрэбіцца манітор большага памеру — бо чым больш пляскатым будзе экран у Вашага дысплея, тым меншым скажэньням будзе падвяргацца выява на ім.

КЛЯВІЯТУРА: МЯККАЯ І ЖОРСТКАЯ

Найбольш зручныя пры працы клявіятуры са 101 ці 102 клявішамі. Клявіятуры бываюць "мяккімі" і "жорсткімі", ці, як гавораць, з "клікам", ці без шчаўчка. Ад тыпу клявіятуры залежыць настрой падчас працы за кампутарам, і таму Вы павінны літаральна сваімі рукамі адчуць, які тып падыходзіць менавіта для Вас.

Некаторым падабаецца шчаўчок, які гукам пацьвярджае, што клявіятура спрацавала, але ў невялікім офісе ці дома клявіятура "з клікам" прынясе мала задавальненьня іншым. Зь іншага боку, ёсьць яшчэ і такі нюанс: пры друку Вашыя пальцы не заўсёды трапляюць дакладна ў цэнтар клявішаў і могуць закрануць суседнія. Калі ў Вас клявіятура зь мяккімі клявішамі, надрукуюцца два знакі. Вось чаму шмат хто аддае перавагу клявіятуры з "жорсткімі" клявішамі.

Выбірайце па-магчымасьці клявіятуру, на якой расейскія і лацінскія літары пазначаныя розным колерам. Гэта спрашчае пошук літараў для тых, хто не друкуе ўсьляпую.

ДАДАТКОВАЕ АБСТАЛЯВАНЬНЕ

У залежнасьці ад Вашых патрэбаў можна набываць кампутары адразу ж з такімі дадаткамі, як CD-rom, sound blaster і г.д. Мы пра іх падрабязна распавядаць ня будзем. Але вось што лепш набыць адразу разам з кампутарам, дык гэта "мыш". Хаця большасьць праграмаў працуюць і бяз "мышы", але зь ёю зручней. У большасьці выпадкаў "мыш" уваходзіць у камплект прадметаў, якія прыкладаюцца да кампутара, але лепш пры пакупцы гэта ўдакладніць. Кошт "мышы" можа вагацца ў значных межах, але для непрафэсійцаў прыдасца і самая танная. Галоўнае, каб яна падыходзіла да Вашага кампутара.

ПАКУПКА КАМПУТАРА

Выбіраць кампутар лепш разам са спэцыялістам. Калі гэта немагчыма, зрабіце пры пакупцы наступныя дзеяньні. Уключыце кампутар, пачакайце, пакуль ён загрузіцца і затым выключыце яго. Пачакайце 20-30 сэк. і ўключыце ізноў. Паўтарыце гэтую працэдуру 5-6 разоў, каб выявіць дэфэкты электронікі. Вэнтылятар павінен працаваць ціха. Клявішы не павінны западаць. Курсор "мышы" павінен бегаць па экране пры малейшым ейным зруху. Пакруціце ручкі яркасьці, кантраста і інш. на маніторы. Краі выявы на экране павінны быць без каляровага — чырвонага, сіняга ці зялёнага — атачэньня. Натуральна, не забудзьцеся на гарантыйны талён, тэхнічныя дакумэнты (асобна на сам кампутар, манітор, клявіятуру, "мыш"). Праверце, ці ёсьць інструкцыі на расейскай мове і ці ўказаныя ў дакумэнтах адрэсы прадстаўніцтваў фірмы.

Нашая парада

Набываючы кампутар, памятайце, што Вы набываеце не прадмет доўгатэрміновага карыстаньня. Кампутар жыве год-два — ня больш: ён старэе ня столькі тэхнічна, колькі маральна: зьяўляецца прынцыпова новае праграмнае забесьпячэньне, новыя стандарты, пад каторыя Ваш кампутар непазьбежна прыйдзецца мадэрнізаваць. Таму пры выбары кампутара трэба мець на ўвазе і гэтую магчымасьць. Спэцыялісты сьцьвярджаюць, што 286-ы кампутар мадэрнізацыі не паддаецца, а лінія SX, саступаючы па сваіх іншых характарыстыках лініі DX, мае болей магчымасьці для далейшай мадэрнізацыі.

У выбары канкрэтнай мадэлі Вам, канешне, дапамогуць выпрабаваньні 13 пэрсанальных кампутараў, якія былі праведзеныя Брытанскай асацыяцыяй спажыўцоў.

КАМПУТАРЫ IBM

СПЭЦЫФІКАЦЫІ	Amstrad PC-9486	Compaq Presario 433	Compaq Prolinea 4/50	Dell Dimension 450si	Elonex PC-450/VL	Gateway 2000 4DX-50V	HP Vectra VL-24/33SE	IBM PS/Value point 450DX2/Si	Peacock TAKE	Viglen Conten der Professional DX	Zenith Z-Select 100Z
Краіна-вытворца	Ангельшчына	Ангельшчына	Ангельшчына	Ірляндыя	Ангельшчына	Ірляндыя	Францыя	Ангельшчына	Нямеччына	Ангельшчына	Нідэрлянды
Габарыты, уключна са злучэньнямі, вышыня/даўжыня/шырыня (см)	12x44x48	39x36x38	10x40x43	11x39x48	11x34x44	17x43x48	13x42x45	12x36x47	35x16x48	16x38x46	13x36x44
Самы вялікі памер выявы па дыяганалі (см)	30	30	34	34	32	33	32	33	32	30	33
Адрозныя асаблівасьці											
Тып працэсара і ягонае хуткадзеяньне (MHz)	486DX/2-66	486SX-33	486DX/2-50	486DXX/2-50	486DX/2-50	486DX/2-50	486SX-33	486DX/2-50	486DX/2-66	486DX/2-66	486DX/2-50
Магчымасьць даабсталяваньня чыпам P24T	+	+	+	+	+	+	+	+			
Аб'ём апэратыўнае памяці: наяўная/самая большая (Mb	4/48	4/20	4/100	4/32	4/64	4/64	4/64	4/64	4/64	4/32	4/64
Аб'ём жосткага магнітнага дыску (Mb)	212	212	338	260	212	405	162	133	212	170	212
Аб'ём звышапэратыўнай памяці (Mb) 1>					64	128			128	128	
Аб'ём відэапамяці (Mb) 2>	1	0.5	1	1	1	1	0.5	00.5	1	0.5	1
Колькасьць спэцыялізаваных вольных разьёмаў 3>	5	2	3	3	2	6	4	3	5	5	3
Наяўнасьць унутраных і зьнешніх вольных панэляў 4>						+	+	+			
Колькасьць партоў (пунктаў падключэньня зьнешняга прыстасаваньня да ўнутранай шыны мікрапрацэсара) 5>	4	4	4	4	4	4	4	4	4	4	3
Наяўнасьць рабочага праграмнага забесьпячэньня 6>	+	+			+	+				+	
Эксплюатацыйныя характарыстыкі											
Хуткадзеяньне 7>	III	III	III	III	III	IIII	II	II	IIII	IIII)	III
Якасьць выявы 8>	II	III	IIII	II	II	III	II	III	II	III	IIII
Якасьць працы клявіятуры	III	III	III	III	II	III	III	II	II	III	III
Якасьць працы "мышы"	I	II	II	II	IIII	IIII	III	II	II	IIII	IIII
Прастата зборкі і запуску	II	IIII	IIII	III	III	III	IIII	III	III	IIII	IIII
Прастата ў карыстаньні	III	III	IIII	III	II	III	III	IIII	II	III	III
Інструкцыя па эксплюатацыі	III	III	IIII	III	IIII	III	III	IIII	II	III	I
Узровень шуму 9>	II	I	II	III	I	I	I	II	III	I	I
Якасьць характарыстык і магчымасьць даабсталяваньня	III	I	III	II	II	IIII	III	III	II	III	
Прастата ўнясеньня ўдасканаленьняў 10>	II	III	III	III	IIII	III	II	III	II	II	III
Заўвагі		Усё ў адным корпусе						Зьняты з вытворчасьці		1) Апошняя ммадэль больш хуткая	

КАМПУТАРЫ APPLE

СПЭЦЫФІКАЦЫІ	Apple Perfarma 475	Apple Power Macintosh 6100/60
Краіна-вытворца	Ірляндыя	Ірляндыя
Габарыты, уключна са злучэньнямі, вышыня/даўжыня/шырыня (см)	8x32x48	8x41x48
Самы вялікі памер выявы па дыяганалі (см)	29	29
Адрозныя асаблівасьці		
Тып працэсара і ягонае хуткадзеяньне (MHz)	68LSCO40-25	Powe PC 601-60
Магчымасьць даабсталяваньня чыпам P24T		
Аб'ём апэратыўнае памяці: наяўная/самая большая (Mb		
Аб'ём жосткага магнітнага дыску (Mb)	4/36	8/72
Аб'ём звышапэратыўнай памяці (Mb) 1>	160	160
Аб'ём відэапамяці (Mb) 2>		
Колькасьць спэцыялізаваных вольных разьёмаў 3>	0.5	2
Наяўнасьць унутраных і зьнешніх вольных панэляў 4>		
Колькасьць партоў (пунктаў падключэньня зьнешняга прыстасаваньня да ўнутранай шыны мікрапрацэсара) 5>	5	5
Наяўнасьць рабочага праграмнага забесьпячэньня 6>	+	
Эксплюатацыйныя характарыстыкі		
Хуткадзеяньне 7>	гл. [1])	
Якасьць выявы 8>	III	IIII
Якасьць працы клявіятуры	II	III
Якасьць працы "мышы"	III	III
Прастата зборкі і запуску	IIII	IIII
Прастата ў карыстаньні	IIII	IIII
Інструкцыя па эксплюатацыі	IIII	IIII
Узровень шуму 9>	III	II
Якасьць характарыстык і магчымасьць даабсталяваньня	II	III
Прастата ўнясеньня ўдасканаленьняў 10>	IIII	IIII
Заўвагі	[1]) Валодае той самай хуткасьцю, што і сярэдняя IBM-сумяшчальная мадэль	Каб працаваць з Windows, неабходна пашырэньне ОЗУ на 8 Mb і дадатковае праграмнае забесьпячэньне

АБАЗНАЧЭНЬНІ:

+ валодае ўласьцівасьцю
IIII найлепшыя вынікі
III
II
I найгоршыя вынікі

ТЭХНІЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ

1> Калі ў працэсара ёсьць зьнешняя супэрапэратыўная памяць, то ён будзе працаваць хутчэй. Чым большы ейны аб'ём, тым лепей.

2> У кампутараў з аб'ёмам відэапамяці толькі 0.5 Mb будуць цяжкасьці ва ўзнаўленьні складанай графікі

3> Напрыклад, каб прымацаваць дадатковае аўдыё- ці відэапрыстасаваньне. Тры разьёмы — добры мінімум

4> Для ўстаноўкі CD-rom ці дадатковага дыскавода для дыскетаў

5> У IBM-сумяшчальных кампутараў маецца адзін паралельны порт (для прынтэра) і набор дадатковых партоў (для прыстасаваньняў кшталту мадэмаў і джойсьцікаў)

6> Залежыць ад таго, дзе вы будзеце купляць. Шукайце лепшыя варыянты

Эксплюатацыйныя характарыстыкі

7> Выпрабоўвалася хуткасьць кампутараў пры працы з Windows, а таксама хуткасьць запамінальных прыладаў, працэсараў і відэапрыстасаваньняў

8> Рэгуліроўка яркасьці, кантрастнасьці і яснасьці, наяўнасьць скажэньняў, мігценьня і блікаў

9> Шум ад мадэляў, пазначаных знакам II, вельмі выразны ў ціхім пакоі

10> Указвае, наколькі проста абсталяваць кампутар дадатковымі плятамі, новым працэсарам ці дыскаводам, ці пашырыць памяць.

РЭПАРТАЖ

Кніжны клюб у Менску

"Ці будзеш на клюбе?.. Гэта трэба пашукаць на клюбе... На клюбе наўрад ці гэта пойдзе..." — можна пачуць ад менскіх аматараў кніг, кніжных "жучкоў", а часам і буйных "вараціпаў" кніжнага бізнэсу.

Штосуботу ад чатырох раніцы "на клюбе" пачынаецца бурлівае жыццё. Заплаціўшы за ўваход усяго дзьве тысячы "зайцоў", тут можна адшукаць даўно забытую кнігу з глыбока савецкіх часоў, набыць апошнюю маскоўскую ці піцерскую навінку, дамовіцца пра партыю ў некалькі тысячаў асобнікаў ці проста паштурхацца каля латкоў, столікаў, стосаў ды пачак стракатых, бліскучых, тонкіх і тоўстых кніг, кніжак, кніжачак... Тое, што бывае і ў кнігарнях, можна набыць крыху таньней, можна, калі парупіцца, замовіць кнігу, якую ўвогуле немагчыма знайсьці. Хоць гэта і называецца "Кніжны клюб", насамрэч гэта рынак. Можа быць, "Клюб" — адна з самых дасканалых і пасьлядоўных рынкавых установаў у Беларусі, а можа й адна з найстарэйшых.

Яшчэ ў семідзясятыя з тых, хто цягаўся па кнігарнях і "букіністах", расшукваючы сьвежы кніжны "дэфіцыт" ці нейкі адмысловы "помнік", альбо выменьваў ці нават прадаваў нейкія свае здабыткі ды лішкі, паступова склалася кола тых, хто зрабіў з гэтага калі ня першую, дык другую сваю прафэсію. Зьбіраліся каля "букініста", потым зьбіраліся на імправізаваных кірмашах у прадмесьці. Найбольш трывалым месцам была Пціч — ваколіца чыгуначнай станцыі недалёка ад Воўчкавіцкага вадасховішча. Туды, на лясны прагалак, зьяжджаліся штонядзелю часам сотні прадаўцоў і кліентаў. Асабліва ходкаю літаратурай была тады фантастыка —"грамадзтва бяз будучыні" летуцела ў салодкіх ці жахлівых мроях. У той час пачалі зьяўляцца й "падпольныя" пераклады заходняй фантастыкі, хутка здэтановаўшы цэлы кніжны выбух: які-небудзь аматар, скажам, у Адэсе пераклаў на расейскую "невядомы" раман Робэрта Шэклі, а іншыя, у сваю чаргу, раздрукоўвалі яго і рассылалі ад Масквы да самых да... На гэтым ужо сталі зьбівацца капіталы, паўставалі цэлыя мануфактуры. На Пцічы можна было таксама без асаблівых праблемаў набыць Біблію, а часам натрапіць і на якуюсьці "антысавеччыну" накшталт Салжаніцына. Але й "саветы" не драмалі. Гандляроў адлоўлівалі, сканфіскоўвалі кнігі, падзілі сапраўдныя аблавы. Адна з такіх легендарных аблаваў адбылася, калі памёр Брэжнеў. Улады падтрымалі "ўсенародную жалобу", кінуўшы сотні міліцыянтаў, каб атачыць лясок ля чыгункі, дзясяткі людзей былі схопленыя, былі й зьбітыя. Але калі зьявіліся так званыя "дагаворныя цэны" ў букіністах, дыктавала іх менавіта Пціч. Ужо тады, на мяжы 70-80-х, гэта быў амаль сапраўдны свабодны, дакладней, стыхійны рынак з канкурэнцыяй ды іншымі атрыбутамі.

У канцы 80-х ён, нарэшце, афарміўся арганізацыйна, хутка скідваючы лічыну тусоўкі аматараў-кнігалюбаў, хоць і захаваў назву "клюб". Цяпер тут і ў галаву нікому не прыходзіць рабіць выгляд, што ты нявінна мяняеш Гогаля на Гофмана. Ідзе суворая рынкавая праца.

Рынак пазбаўлены рамантыкі, самаахвяраваньня за ідэю, таму яго і называюць часам баромэтрам эканомікі ды ўвогуле грамадзтва — у баромэтра няма ідэалёгіі. Якое ж надвор'е прапануе баромэтар "Клюбу" ды як ён увогуле выглядае?

Цяпер уся дзея адбываецца ў Палацы культуры трактарнага заводу. Яшчэ з глыбокай ночы да будынку пачынаюць зьяжджацца аўтамабілі, часам нават трайлеры, падцягваецца драбната з пакункамі на колках. Самая раніца пасьля адкрыцьця — гэта час прафэсіяналаў, сур'ёзных перамоваў, пагадненьняў, гуртовых закупаў. Пазьней набіваецца натоўп тых, хто проста цікавіцца ці шукае неабходную кніжку.

Першае ўражаньне, што ўсяго зашмат, усё стракаціць, і, здаецца, былі б грошы, набраў бы цэлы мех. Прыгледзеўшыся, бачыш — на большасьці прылаўкаў амаль адно й тое самае. Бліскучыя каляровыя вокладкі складаюць адну й тую камбінацыю: дэтэктыў, фантастыка, парады: як схуднець, разбагацець, зрабіць цукерку, як Вам "обустроить свой компьютер" ці — "как нам обустроить Россию"... Масква, Пецярбург, Растоў-на-Доне, Екацярынбург... Калі й сустракаецца часам Менск, дык гэта "Минск" і з тым самым малым расейскім наборам. У прынцыпе, можна падзяліць кнігі на некалькі асноўных катэгорыяў: кнігі для забавы — густы тут хутка зьмяняюцца — учора Чэйз, сёньня які-небудзь Іваноў-Пятроў; кнігі для вучняў і прафэсіяналаў — тэхніка, споўнікі, даведнікі, падручнікі — патрэба ў іх расьце, растуць і цэны; кнігі для дзяцей — цяпер расейцы выкінулі на рынак тоны ліцэнзійнай прадукцыі з шыкоўнымі малюнкамі і вагоны сваёй уласнай, ня менш часам шыкоўнай, але яшчэ больш пахабнай, чым усе томы, джэры, дональды-дакі й алядыны разам; кнігі для "інтэлектуалаў" — заўжды пакрысе разыходзяцца, хоць бум Ніцшэ і бярдзяевых, здаецца, назаўсёды прайшоў; і, нарэшце, самыя неабходныя і заўжды пры любым рэжыме ці ўладзе, жабрацтве ці дабрабыце ходкія — кнігі для дурняў, тыя самыя, пра тое, як усім адразу спадабацца, нічога не рабіць, а жыць добра, папрыгажэць і абсалютна аздаравіцца за два сэансы саматэрапіі... Не хапае толькі парадніка, як у тры прыёмы пабудаваць шчасьлівае жыццё і рынкавы сацыялізм, і пры гэтым зусім бясплатна.

Ад расейшчыны пачынае сьвярбець у вачах. Вось, напрыклад, куток "вялікай славянскай ідэі", а тут проста шэрагамі выстаўленыя "Российская история", "История русской церкви", "История русской культуры", "Николай II и его семья", "Россия и евреи" — і гэтак бясконца й бясконца. Апошнім часам усё больш падручнікаў — для ВНУ, для школак, для самых маленькіх. Шчыра кажучы, некаторыя зь іх даволі прыстойна зробленыя і зусім нам не перашкодзілі б як дадатковая літаратура, але дадатковая — да сваёй "гісторыі", "культуры", "царквы", "мовы"... Патрэба ў падручніках ёсьць, і людзі бойка купляюць чужую гісторыю і ўжываюць чужую культуру. Тут, на рынку, тэрмін "культурная агрэсія" набывае нечаканую рэчаіснасьць, ажыццяўляецца проста на тваіх вачах.

Існуе на "Клюбе" і беларуская кніга. І, што цікава, адсунутая пасьля пэўнага нацыянальнага буму пачатку 90-х на самы край рынку, цяпер яна пачынае йзноў прэтэндаваць на пэўнае месца. Тыя самыя падручнікі, але ўжо беларускае мовы, рэгулярна ляжаць на століках. А раз іх прыносяць, дык значыць нехта й купляе. Ёсьць тамы "Беларускай энцыкляпэдыі", альбомы мастацтва, новыя дзіцячыя кніжкі. Можна адшукаць патрэбныя кніжкі часопісаў "Спадчына", "Беларуская мінуўшчына", нешта са старых выданьняў. Што гэта, новая тэндэнцыя ці спроба пазбавіцца "неліквіду"? Пакуль цяжка вызначыць, але, здаецца, — ужо тэндэнцыя. У такім выпадку "Клюб" чакае новыя беларускія кніжныя праекты, і ці не паспрабаваць зрабіць беларускую кнігу з аўтсайдэра рынку ягоным лідэрам? Магчыма, гэта рамантыка, але...

Што з сучасных расейскіх выданьняў цікавага можна знайсьці тым, хто вучыцца на гуманітарных факультэтах альбо цікавіцца культуралёгіяй:

КУЛЬТУРОЛОГИЯ. Учебное пособие. — Растоў-на Доне: "Феникс", 1995.

Гуревич П. КУЛЬТУРОЛОГИЯ. Учебное пособие. — Масква: —"Знание", 1996.

Ерасов Б. СОЦИАЛЬНАЯ КУЛЬТУРОЛОГИЯ. Пособие для студентов. —Масква: "Аспект Пресс", 1996.

Смелзер Нейл. СОЦИОЛОГИЯ. Перакл. з ангельскай. — Масква: "Феникс", 1994.

ПРОИСХОЖДЕНИЕ ВЕЩЕЙ. Очерки первобытной культуры. Масква. —"НИН", 1995.

Вацлаў Арэшка

Кніга — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёьць кнігі:

1. Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы. – Менск: Сучасная літаратура, 1995. – 310 с. 40.000 БРБ
2. Адам Глёбус. Скрыжаваньне. – Менск: БАДППР – "Ковчег", 1993. – 46 с. 7.000 БРБ
3. Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны. – Вільня, 1994. – 192 с. 24.000 БРБ
4. Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчынскі / Пераклад з польскай. – Вільня-Менск: "Наша Ніва" – "Мастацкая Літаратура", 1994. – 93 с. 10.000 БРБ
5. Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША. – Менск, 1993. – 352 с. 25.000 БРБ
6. Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі. – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 336 с. 24.000 БРБ
7. Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія. – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1996. – 486 с. 35.000 БРБ
8. Лоўзі Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі. – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 328 с. 24.000 БРБ
9. Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі. – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1995. – 272 с. 20.000 БРБ
10. Джын Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку. – Менск: БФС – "Кліч", 1995. – 312 с. 20.000 БРБ
11. Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію. – Менск: БФС, 1996. – 272 с. 24.000 БРБ
12. Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс"). – Менск: "Ковчег", 1994. – 64 с. 7.000 БРБ
13. Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст. Камплект каляровых паштовак (12 асобнікаў). – Менск: НВФ "Vaukalaka", 1996. 25.000 БРБ
14. Беларускі гістарычны агляд. 1996, т. 3, сшытак 1. 35.000 БРБ
15. Ш.Дэбаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку. – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1996. – 624 с. 40 000 БРБ
16. М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794). – Менск, 1994. – 168 с., каляровыя іл. 20 000 БРБ
17. Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie. – Warszawa, 1992. – 160 с. 20 000 БРБ
18. Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі. — Менск: БФС — "Лекцыя", 1996. — 343 с. 45.000 БРБ.
19. Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў. — Менск: БФС — "Тэхналёгія", 1996. — 560 с. 50.000 БРБ.
20. Ўэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня. — Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с. 15.000 БРБ.
21. Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1, 1996. 35 000 БРБ.
Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Альдебер Жак, Бендер Йохан, Груша Иржи и др. История Европы / Научное редактирование и предисловие к русскому изданию д-ра ист. наук Кошелева В. — Менск: Вышэйшая школа, 1996. — 385 с. 40 000 ас. ISBN 985-06-0079-9

Галавач П. Спалох на загонах: Аповесьць. Для старэйшага школьнага ўзросту / Прадмова А.Марціновіча. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 222 с. 5 700 ас. ISBN 985-02-0332-3

Мацкевич В. Белорусская демократия: вопреки очевидности (А.Бабайцев. Заключительная статья). — Менск: Агентство гуманитарных технологий, 1996. — 148 с. з табл. і малюнкамі. Наклад 1.000

Сорас пра Сораса (Напярэдзе хвалі) / Пераклад з ангельскай Сяргея Шупы. — Менск: Беларускі Фонд Сораса, 1996. — 165 с. ISBN 985-6022-07-X

Философия: краткий курс лекций / Сост. И.Мамыкин. — Менск: НКФ "Экоперспектива", 1996. — 78 с.-2 000 ас. ISBN 985-6102-13-8

Эрш, Жана. Філязофскае здумленьне. Гісторыя заходняе філязофіі / Пераклад з фр. Сяргея Барысевіча; Навук. рэд. Ігар Бабкоў. — Менск: Эўрафорум — Беларускі Фонд Сораса, 1996. — 400 с. 3 000 ас. ISBN 995-6022-06-11

НАВІНКА

Жана Эрш. Філязофскае здумленьне: Гісторыя заходняе філязофіі. — Менск: Эўрафорум — Беларускі Фонд Сораса, 1996.

Свой агляд заходнеэўрапейскае філязофіі Жана Эрш грунтуе не на фармальных праблемах, а на першапрычыне філязофскага мысьленьня — здумленьні. У гэтым арыгінальнасьць кнігі. Філязофскае здумленьне заўсёды ў руху, заўсёды ў пошуках жывога сэнсу. Апавядаючы пра яго, Жана Эрш пераасэнсоўвае, па сутнасьці, усю філязофскую традыцыю: дасакратыкі, Платон, Арыстотэль, эпікурэйцы, стоікі, Сьвяты Аўгустын, Тамаш Аквінскі, Дэкарт, Ляйбніц, Кант, Гегель, Маркс, Фрэйд, Бэргсон, Кіркегар, Ніцшэ, Гусэрль, Гайдэгер, Яспэрс.

Паводле словаў аўтара, здумленьне гэтых філёзафаў будзе актуальным ва ўсе часы.

НОВЫ БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" наладзіў распаўсюджаньне найноўшых беларускіх выданьняў у галіне гуманістыкі, а таксама мастацкае літаратуры. Наша мэта — зрабіць новую беларускую кнігу жывым фактарам сучаснае культуры.

Сыстэма "Новага беларускага кніжнага праекту" дзейнічае ў гарадах:

БЕРАСЬЦЕ

Кнігі Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію", Энтані Сьміта "Нацыяналізм у XX ст.", Ш.Дэбаша й Ж.-М.Пант'е "Ўводзіны ў палітыку" можна набыць у кнігарнях "СЬВІТАНАК" (бульвар Касманаўтаў, 120) і "АСЬВЕТА" (вул. Маскоўская, 57). У "Сьвітанку" таксама прадаецца камплект каляровых паштовак "Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст."

ГОМЕЛЬ

У памяшканьні Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі (пл. Перамогі, 2) пры Аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў (тэл. 55-71-97) адкрыты кніжны аддзел. Гэта адзіная кропка ў 500-тысячным горадзе, дзе можна набыць такі асартымэнт сучасных беларускіх кніг — мастацкую літаратуру, дасьледаваньні ў галіне гуманістыкі, найноўшыя пераклады. Апроч кніжак тут таксама можна прыдбаць самыя апошнія запісы беларускае музыкі.

ГОРАДНЯ

Продаж кніжнай прадукцыі адбываецца ў шапіку "ВАСІЛЁК" (насупраць Універсытэту).

МАЛАДЗЕЧНА

Кнігі можна набыць у шапіку ТБМ (на чыгуначным вакзале). Па даведкі можна зьвяртацца праз тэл. 6-71-70 да Алеся.

МЕНСК

Кніга Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію" прадаецца ў кнігарнях "Сьветач", "Акадэмкніга", "Кнігарня пісьменьніка", "Палітkніга". Кнігі Адама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы" і "Дамавікамэрон" прадаюцца ў крамах "Сьветач" і "Кнігарня пісьменьніка", у шапіку ў фае Нацыянальнай бібліятэкі.

СЬВЕТЛАГОРСК

Кнігі можна набыць у філіі БГАКЦ, Зялёная вул., дом 10, паверх 2. Тэл. (8-02342) 2-71-77.

КАСЭТЫ — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 25.000 БРБ):

1. НОВАЕ НЕБА. Сон у трамваі.
2. НОВАЕ НЕБА. Go home (1995).
3. НОВАЕ НЕБА. Дзеці чорнага гораду (1991).
4. КРАМА. Камэндант (1995).
5. КРАМА. Хворы на Rock-n-Roll.
6. КРАМА. Гэй, там; налівай! (1994).
7. N.R.M. LaLaLaLa (1995).
8. ULIS. Life (1996).
9. УЛІС. Чужаніца (1991).
10. УЛІС. Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. БОНДА. Найлепшыя песьні.
12. МЯСЦОВЫ ЧАС. Наша ўскраіна (1991).
13. ПАЛАЦ. Палац (1996).
14. Песьні беларускіх бардаў (1992).
15. РЭНЭСАНС (беларускі джаз).
16. БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ.
17. БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА (1-3)
18. БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА.
19. ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ (1-3).
Т.1: Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
Т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
Т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя.
Т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэг.
20. МРОЯ. Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. УЛІС. Блуканьне (1996).
22. ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ. Смутны беларускі блюз (1996).
23. КАМЭЛОТ. У краіне талераў (1995).
24. ZINDAN (1994).
25. КРАМА. The Best (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу.
У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

РАРЫТЭТ

Паведамленьне для аматараў «Нашай Нівы»

У рэдакцыі "Нашай Нівы" вы можаце замовіць рарытэтныя нумары з моманту аднаўленьня газэты ў Вільні:

№1-4 за 1991 г., №6-8 за 1992 г., №10, 12-18 за 1993 г., №1, 2, 6, 8-9, 12 за 1994 г., №5-8 за 1995 г.

Ахвотныя могуць замовіць сабе ксэракопію любога нумару.

Зьвяртайцеся на адрас:

Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89.

Паведамленьне для замоўцаў Літоўскае Мэтрыкі.

У Менск завезены шосты й восьмы тамы Мэтрыкі. Просьба да тых, хто не пакінуў пры замове нумароў сваіх тэлефонаў, зьвярнуцца да Андрэя Андрыеўскага праз тэлефон **239-78-49**.

Увага! На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць некалькі асобнікаў **Беларуска-Расейскага слоўніка др. Я.Станкевіча.** Гэтае ўнікальнае выданьне, якое выйшла ў Нью-Ёрку ў 1989 годзе, цяпер ужо зусім рэдкае. Слоўнік выйшаў пры дапамозе Беларускага Фонду імя Льва Сапегі, заснавальнікам якога быў сам др. Ян Станкевіч.

Слоўнік можна замовіць праз ***т. 239-78-49*** *(спытаць Андрэя Андрыеўскага).*

28.10 - 3.11.1996 Інфарматар N30

50 самых верных спосабаў справіцца са стрэсам

1. Масаж з выкарыстаннем падагрэтага алею. Актывізуе жыццёвыя сілы арганізму.

2. Gnocchi (італійскія клёцкі з бульбы і макаронаў). У іх шмат вугляводаў. Праведзеныя ў ЗША выпрабаваньні паказалі, што яны могуць дапамагчы перамагчы стрэс.

3. Мэлатанін. Цудадзейны гармон амэрыканскае вытворчасьці.

4. Дзёньнік. Выкладзіце стрэсавую сытуацыю. Загадайце сабе: "Спакойна, толькі спакойна. Усе праблемы адкладаю на заўтра".

5. Авакада — лепшы сродак для зьняцьця стомленасьці і лянотны. У гэтай гародніне шмат вітаміну Е.

6. Гамак, фатэль-качалка. Але неабходна зьнішчыць фактары зьнешняга ўзьдзеяньня.

7. Аўтагенная трэніроўка. Супакойвае нэрвы, накіроўвае эмоцыі ў іншае рэчышча, садзейнічае разьняволеньню.

8. Жывёлы. Калі лашчыш, напрыклад, котку, гэта здымае стрэс.

9. Дыхальныя практыкаваньні паводле сыстэмы ёгаў. Паляпшаюць крывазварот.

10. Пацалунак. Пяшчота вызваляе гармон эмоцыяў — эндарфін.

11. Плянаваньне часу.

12. Сьціскваньне галавы рукамі. Гэта патрабуе энэргіі цела, але здымае стрэс.

13. Акварыюм. Цудоўна супакойвае. Гэты сродак можа быць выкарыстаны нават на працы.

14. Салата, якую вырасьцілі на адкрытым паветры. Ў ёй шмат магнію, кальцыю і жалеза.

15. Музыка. Мэлёдыі, у якіх прысутнічае гармонія (напрыклад, клясычная), супакойваюць. Тэмп і рытм узьдзейнічаюць на сэрцабіцьцё.

16. Сон пасьля абеду. Дастаткова паспаць нават хвілінаў 15.

17. Зялёны колер. Ён супакойвае. Гэты колер даволі часта прысутнічае ў мастацкіх творах, напрыклад, у "Марской лілеі" Э.Манэ.

18. Бадмінтон. Усяго толькі пяць гадзінаў на тыдзень павялічваюць працягласьць жыцьця. У Гарвардзе прыйшлі да высновы, што бадмінтон — больш актыўны від спорту, чым тэніс.

19. Тай-хі. Сукупнасьць баявых мастацтваў, мэдытацыі і тэрапіі цела.

20. Бананы. У іх шмат сэратаніну, у якім мае патрэбу галаўны мозг. Сэратанін не дае стрэсу разрастацца.

21. Сэкс — лепшы "забойца" стрэсу. Гармоны, што кіруюць эмоцыямі (эндарфіны), запаўняюць арганізм і падаўляюць адмоўныя эмоцыі, перанапружаньне.

22. Рыбалка — цудоўны сродак разьняволіцца.

23. Душ. Адкрывае поры, здымае стому.

24. Індзейскія клічы. Шаманы раяць гэты сродак для разьняволеньня ваяроў перад нападам.

25. Гразі. Паляпшаюць крывазварот і ўзмацняюць нэрвовую сыстэму.

26. Саўна. Паляпшае крывазварот, аднаўляе сілы.

27. Стральба з лука. Канцэнтрацыя ўвагі на мішэні і кантроле за целам дапамагае пазбавіцца стрэсу.

28. Шпацыр. Сьвежае паветра аднаўляе баланс кісларoду ў клетках. Са словаў прафэсара Д.Ешке зь Мюнхэна, цалкам дастаткова адводзіць на шпацыраваньне дзьве гадзіны на тыдзень.

29. Сьлёзы. Здымаюць стрэс. Адбываецца вывядзеньне з арганізму атрутных рэчываў.

30. Скумбрыя. Наяўныя ў ёй тлушчавыя кіслоты ўзмацняюць сэрца.

31. Сьпевы. Здымаюць стрэс і нават боль.

32. "Пахучая лямпа". Вы канцэнтруецеся на этэрных алеях, і Вашыя думкі набываюць спакойную хаду.

33. Лапах (дрэва). Гарбата зь ягонае кары ўзмацняе імунную сыстэму, робіць яе яшчэ больш устойлівай. Пра гэта ведалі яшчэ інкі.

34. Скокі. Той, хто скача 3-4 разы на тыдзень, на 64 працэнты зьмяншае рызыку інфаркта.

35. Карэньні кокі. Палінэзійцы ўжывалі іх у якасьці наркотыка. Зараз ужываецца як супакаяльнае.

36. Сонечныя ванны. Узмацняюць сэрца, паляпшаюць крывазварот — пры ўмове, што вы не пераборшчваеце. Норма — да 10 хвілінаў.

37. Сьмех. Садзейнічае разьняволеньню і нават "адключэньню".

38. Гіпноз. Стан паміж сном і нясном. Падсьвядомасьць кантралюецца.

39. Дыхальная тэрапія. Яе радзіма — Кітай, Японія. Садзейнічае актывізацыі дыханьня ў пэрыяд стрэсу, робіць яго больш роўным. У арганізм паступае болей кісларoду.

40. Мяліса. Гарбата і настой з гэтай расьліны супакойваюць нэрвы.

41. Ванны з ілам. Ачышчаюць арганізм ад атрутных рэчываў.

42. Сьнеданьне, асабліва зь вялікай колькасьцю бялка.

43. Кігонг (колавае пагладжваньне далоні). Ягоная радзіма —Кітай.

44. Кібэрнэтычны шлем з навушнікамі. Пасланьні, у якіх прысутнічаюць гукі навакольнага асяродзьдзя, якія перадаюцца на шлем, разьнявольваюць. Гэты мэтад папулярны ў ЗША.

45. Эўкаліпт. Жэле раяць уціраць у скроні перад сном.

46. Шакаляда. Вядучая праграмы CAT-1 М.Шрэйнэмаркес карыстаецца гэтым сродкам перад кожнай перадачай.

47. Камін. Калі мы глядзім на агонь, гэта супакойвае.

48. Слова "не". Не ўзвальвайце на сябе занадта шмат справаў. Не забывайцеся на адпачынак.

49. Акупунктура. Дабратворнае і гаючае ўзьдзеяньне іглаўколваньня было вядомае яшчэ 3000 гадоў таму.

50. "Gelee royale". Матачкіна малако, спажыўнае і гаючае.

АДКАЗВАЕМ НА ПЫТАНЬНІ ЧЫТАЧА

Басанавічус Сяргей, студэнт. Менск

Які самы стары ў сьвеце музэй, самы буйны ў сьвеце?

Самы стары. Самым старым у сьвеце музэем зьяўяецца музэй Ашмала ў Оксфардзе, які пабудавалі ў 1679-1683 гг. і назвалі ў гонар калекцыянэра Ілаеса Ашмала (1617-1692). З 1924 г. у музэі месьціцца экспазыцыя старадаўніх навуковых прыбораў.

Самы буйны музэй. Сьмітсанаўскі інстытут — адна з самых даўніх навукова-дасьледчых і культурных установаў ЗША — уключае ў сябе 14 музэяў са штатам 6 тыс. чалавек. Ягоны збор налічвае 137 млн. экспанатаў.

Самым буйным і найбольш часта наведным музэем у Англіі лічыцца Брытанскі музэй (заснаваны ў 1753 годзе), які быў адчынены для наведваньня з 1759 г. Галоўны будынак музэю знаходзіцца ў Блумсбэры, Лёндан. Ягонае будаўніцтва было пачатым ў 1823 г., агульная плошча складае 8,7 га. У 1989 г. музэй наведалі 4 396 138 чалавек.

Самы папулярны. Самым папулярным у сьвеце зьяўляецца Сьмітсанаўскі нацыянальны музэй авіяцыі і космасу ў Вашынгтоне, акруга Калумбія, ЗША, які быў адчынены ў ліпені 1976 г. Рэкорд па наведваньні быў пастаўлены ў 1984 г., калі з-за вялікай колькасьці наведвальнікаў (118 437 чалавек) давялося часова зачыніць дзьверы.

Мікалайчанка К. пэнсіянэр, Ворша.

Скажыце, калі ласка, як вярнуць свае грошы ў Грамадзянскі зыск у крымінальнай справе?

Калі Вы жадаеце вярнуць свае грошы, у Вас ёсьць дзьве магчымасьці: ці зьвярнуцца з зыскам у грамадзянскі суд, ці выступіць у ролі грамадзянскага зыскоўцы ў крымінальнай справе. Яна можа быць узбуджана бяз Вашага ўдзелу, але і Вы самі можаце падаць заяву пра яе ўзбуджэньне.

ШТО РЭАЛЬНА ГЭТА МОЖА ВАМ ДАЦЬ?

Па-першае, калі суд аддмовіўся накласьці арышт на рэшту грашовых сродкаў і маёмасьці фінансавай установы, застаецца надзея, што гэта зробіць сьледзтва.

Па-другое, пры высьвятленьні сьледзтвам усіх абставінаў гаспадарчай дзейнасьці фірмы, магчыма, будуць выяўленыя роднасныя структуры, якія схавалі частку маёмасьці і грошы.

Па-трэцяе, калі нават на рахунках фірмы няма грошай, узбуджэньне крымінальнай справы дазваляе спадзявацца, што ўкладчыкі нешта атрымаюць. Справа на тое, што ў нашай краіне крымінальная справа на факт злачыннага дзеяньня ўзбуджаецца толькі ў адносінах фізычнай асобы (у шэрагу краінаў крымінальнае заканадаўства дазваляе казаць пра адказнасьць за злачынства ўстановы — юрыдычнай асобы). Той, каго падазраюць, абвінавачваюць, ці які знаходзіцца пад судом — асоба заўсёды фізычная, гэта значыць грамадзянін. Калі сьледзтва высьвеьтліць і давядзе, што асабістыя фінансавыя справы кіраўніка фірмы ідуць някепска менавіта за кошт тых грошай, якія фірма атрымала на падмане грамадзян, то спагнаньне па зысках унёсчыкаў можа быць зьвернута на ягоную маёмасьць — як фізычнай асобы, якая мае адносіны да злачынства.

Але асабліва радавацца пры атрыманьні весткі пра ўзбуджэньне крымінальнай справы супраць кіраўніцтва "вашай фірмы" ня варта: крымінальная справа — справа доўгая, і апісаныя вышэй тэарэтычныя магчымасьці не рэалізоўваліся пакуль ні ў адным зь вядомых нам выпадкаў.

З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА?

Перш-наперш, неабходна давесьці, што дзеяньні кіраўніцтва падманнуўшай Вас фірмы насілі наўмысна несумленны характар. Калі ў дзеяньнях гэтага прадпрыемства Вы бачыце дзеяньні наўмыснага характару, Вы павінны паведаміць пра свае падазрэньні ў АУС на месцы знаходжаньня гэтага прадпрыемства. Неабходна ведаць, што ў кожным выпадку ёсьць свае асаблівасьці, і ў кожным выпадку неабходна ведаць, якіх спэцыяльных ведаў у галіне крымінальнага права ад Вас не патрабуецца — дастаткова Вашага пераканаьня ў злачыннасьці дзеяньняў.

Вусны зварот, як правіла, не дае вынікаў. Таму неабходна скласьці заяву на імя начальніка сьледчага аддзела, у якім трэба абгрунтаваць Вашыя меркаваньні. У заяве абавязкова пазначце, якія менавіта дзеяньні Вы лічыце незаконнымі, калі яны мелі месца, а таксама папрасіце правесьці праверку дадзеных абставінаў і ў выпадку неабходнасьці ўзбудзіць крымінальную справу па выяўленых фактах. І, калі ласка, меней эмоцыяў...

Абавязкова пераканайцеся, што вашая заява, прынятая ў АУС, была зарэгістраваная — у іншым выпадку яна проста можа згубіцца і Вам прыдзецца паўтарыць свае дзеяньні ізноў. Рэгістрацыя заяваў адбываецца ў дзяжурным у "Кнізе рэгістрацыі заяваў грмадзянаў", якая павінна быць у кожным аддзяленьні міліцыі. Абавязкова даведайцеся рэгістрацыйны нумар сваёй заявы.

Канешне, з падобнай заявай можна зьвярнуцца ў органы пракуратуры ці ў народны суд, але хутчэй за ўсё, яна будзе накіравана ў АУС для праверкі.

У адпаведнасьці з заканадаўствам РБ, пракурор, сьледчы, орган дазнаньня абавязаны прымаць заявы і паведамленьні пра любое зьдзейсьненае ці магчымае злачынства і прымаць па іх рашэньні ў тэрмін да 3 сутак з дня атрыманьня заявы ці паведамленьня, а ў выключных выпадках — да 9 сутак.

На практыцы адносна тэрмінаў разгляду заяваў і лістоў грамадзянаў па фінансавых кампаніях усё адбываецца крыху інакш. Для праверкі паведамленьняў патрабуецца значна болей часу.

Складанасьць тут заключаецца ў тым, што Крымінальна-Працэсуальны Кодакс, мае на ўвазе злачынствы яўнага характару (забойства, крадзёж і г.д.). У дадзеным жа выпадку злачынства заўсёды схаванае, таму тэрмін прыняцьця рашэньня павялічваецца да 30-і сутак.

У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 – 23):

Кошты на менавіх рынках: Камароўка (ІНФ. №1, 7, 10, 21); Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФ. №2, 8); Аўтарынак (ІНФ. №3, 12); Кошты на кампакт-дыскі (ІНФ. №4); Кошты на кватэры ў Менску. Кошты на офісы (ІНФ. №5, 17); Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФ. №6); Кошты на камутары. Менск (ІНФ. №9); Кошты на філязофска-гуманітарную літаратуру (ІНФ. №18); Кошты на кватэры ў Менску (ІНФ.№24); Кошты на турыстычныя падарожжы ў Менску (ІНФ.№26). Кошты на запасныя часткі для аўто (ІНФ.№27); Кошты на авія і чыгуначныя квіткі (ІНФ.№28).

Транспарт: Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №1,15); Расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №2, 12); Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФ. №3, 16, 17); Расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФ. №5).

Адукацыя: Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФ. №1); Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФ. №2); Дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФ. №3-4); ВНУ. Акадэміі (ІНФ. №8-10).

Біржа працы: Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФ. №1- 9); Новыя вакансіі і працоўныя месцы на Беларусі (ІНФ. №1-28).

Адпачынак: Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФ. № 1-15); Вучымся гуляць у більярд (ІНФ. № 16-24); Тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФ. №1- 25). Тэсты, адказы на пытаньні чытачоў (ІНФ.№26-29).

Спажывец: Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краіноў блізкага і далёкага замежжа (ІНФ. №2); Твае правы, пасажыр (ІНФ. №2); Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спэцыяльнае маркаваньне (ІНФ. №3); Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФ. №4); Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФ. №5); Пра новыя даляры. Праўда пра цыгарэты. Штрыхавы код — як яго расшыфроваць (ІНФ. №6); Як выбіраць абутак (ІНФ. №7); Міжнародная сыстэма гатэляў (ІНФ. №10); Каб выросла рэпа вялікая.. (ІНФ. №11); Як набыць аўтамобіль у Нямеччыне (ІНФ. №18 Заканчэньне); Вучымся эканомна кіраваць аўтамабілем (ІНФ. № 12, 15, 17); Зрабі сам (ІНФ. № 16); Соньнік (ІНФ. № 15, 17, 18 Заканчэньне); Спажывецкі тэст — прасы (ІНФ. № 20); Спажывецкі тэст — тэлевізары (ІНФ. № 21); Кошты на аўто ў Польшчы (ІНФ. № 21, 22); Гумкі (ІНФ. № 23); "Time Share". Як пазьбегнуць непрыемнасьцяў (ІНФ. № 23). Інвэстыцыйныя фонды: некалькі парадаў дробнаму ўкладальніку (ІНФ. № 23); Пырскі шампанскага (ІНФ. № 23); Рыбныя прадукты (ІНФ. №24); Гарэлка: Чаго баяцца? (ІНФ. №24); Каб кватэра была цёплай (ІНФ.№26); Фарбуем вопратку і тканіну (ІНФ.№26); Калі я паміняю батарэйкі (ІНФ.№27). Спажывецкі тэст — кухонныя камбайны (ІНФ.№28).

Інструктар: Друкарня ў кожнай кватэры; За родную школу; Зьбіраемся ў падарожжа (ІНФ. № 19); Алэрацыя "ВАГІ" (ІНФ. №24).

Здароўе: Перш чым зьвяртацца да лекара. Як кінуць паліць (ІНФ. №4); Прыродныя атруты (ІНФ. №10); Атлетычныя клюбы, шэйпінг, аэробіка, тэнісныя корты (ІНФ. №18); Комплексная ацэнка забруджаньня асяродзьдзя Менску і вобласьці (ІНФ. № 19); Тэст: асьпірын (ІНФ. № 22); Небясьпечныя лекі (ІНФ. № 22); Пра шкоду пасіўнага паленьня (ІНФ. № 22); Без дыэты не абысьціся (ІНФ. № 23); Перш чым купіць цацку, панюхайце! (ІНФ. № 23).

Гаспадарка: Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлікі на вопратцы. (ІНФ. №5); ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФ. №6); Як мыць і чысьціць посуд. Калі заліло кватэру... (ІНФ. №8); Як пабудаваць садовы домік. Дом і дзялянка (ІНФ. №9).

Прэс-рэліз. Сьвет за тыдзень (ІНФ.№28, 29).

Беларускі кампутар: Кампутарныя энцыклапэдыі. Гісторыя сьвету на CD-ROM (ІНФ.№29).

Грамафон: Старонка вершаванага радка (ІНФ. №6, 8, 11, 17, 19, 20, 24, 25, 26).

Харчаваньне: Якую гарбату мы п'ем. Пра часнык (ІНФ. №7); Бары, рэстарацыі, кавярні Менску (ІНФ. №15).

Спорт: Вынікі спаборніцтваў і інш. (ІНФ. №7, 9, 19).

Бібліятэка: Новыя паступленьні ў кнігарні. Рэцэнзіі (ІНФ. №9, 10, 11, 15, 16, 18-27).

За мяжою: Хто такія ньюёрцы; Ліставаньне з навучальнымі ўстановамі ЗША (ІНФ. №17); Ці будзе кітай другой Японіяй? (ІНФ.№29).

Беларусь і сьвет. Індзейцы у Беларусі (ІНФ. № 21).

Адвакат: Ахова правоў чалавека. Міжнародная Амністыя (ІНФ. №17).

Псыхалёгія: Сцэнар чалавечага жыцьця пішацца яшчэ ў дзяцінстве (ІНФ. №24). Калі Ён купаецца, усе павінны залезьці ў ваду і плясацца (ІНФ. №24).

Чалавек. Пра цяжкае жыцьцё і лёгкую сьмерць; Дзёньнік без канца. Г.Матусевіч. Тэст: самая простая памяць (ІНФ. №27)

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ:

Рынак: Новыя кошты на розныя товары.

Грамафон: Новыя вершы нашых чытачоў.

Некалькі элемэнтарных парадаў пра якасьць прадуктаў

Якую мінэральную ваду піць? Якую бульбу набываць і дзе? Адказы на гэтыя, актуальныя для кожнай гаспадыні пытаньні, дае нямецкі часопіс "Бунтэ".

Які хлеб лепшы? У белым хлебе мала вітамінаў і мінэралаў, скарынкі, у якой шмат спажыўных рэчываў. Карысьнейшы хлеб з мукі грубага памолу, у ім захоўваюцца усе вітаміны, што ёсьць у жыце.

Які рыс лепшы? Толькі ў неашалушаным ёсьць празрыстая скурка, якая мае вітаміны і мінэралы — такія, як магній, фосфар. Калі Вы не набылі менавіта такога, ужывайце рыс у ежу крыху недавараным.

Які сыр, ёгурт, малако больш карысныя? Набываючы іх, зьвярніце ўвагу на надпіс "непастэрызаваны" — высокая тэмпэратура забівае карысныя рэчывы.

Пра гародніну. У сьвежай спаржы мала калёрыяў, гэтая гародніна паглынае ваду. Капуста браколі садзейнічае выводу з арганізму атрутных рэчываў, узмацняе імунную сыстэму.

Ці карысная шакаляда? Цукар, які маецца ў гэтым прадукце, надае энэргіі, але не нашмат. Калі колькасьць цукру ў крыві зьмяншаецца, чалавек становіцца вялым.

Якія вітаміны патрэбны арганізму? Кожны дзень трэба прымаць вітамін С і вітамін Е. Яны абараняюць клеткі. Магній захоўвае ад стрэсаў. Наконт перадазіроўкі вітамінамі можаце не непакоіцца. Выключэньне — вітамін А: ягоны лішак асядае ў нырках.

Ці можна карыстацца мікрахвалевай пячкай: яна практычная, эканоміць энэргію. Аднак можа здарыцца так, што ежа прагрэецца толькі зьверху, а знутры застанецца халоднай. Пры падаграваньні ежы ўтвараюцца бялковыя малекулы, якія ня можа пераварыць арганізм маленькага дзіцяці — для дзяцей лепш ужываць звычайны спосаб падагрэву.

Мінэральная вада вымывае з арганізму атрутныя рэчывы. Выбірайце гатункі, у якіх мала натрыю: зь ежай ён і так трапляе ў арганізм у вялікіх колькасьцях.

Ці карыснае масла? Гэта — натуральны прадукт, але ён мае халестэрын. Халестэрыну няма ў маргарыне, але затое ў ім ёсьць алергенны нікель і яшчэ нявывучаныя тлушчавыя кіслоты.

Рыбу есьці карысна: яна мае якасныя бялкі і тлушчавыя кіслоты "Амэга-3". Яны зьніжаюць колькасьць халестэрыну і магчымасьць затору крывяносных сасудаў. Старайцеся не набываць сельдзь, якую вылавілі ў Балтыцкім моры —яна атручаная хімікатамі. У штучна выгадаваным ласосі вельмі часта вялікі працэнт колькасьці антыбіётыкаў. Лепш ешце натуральнага ласося і рыбу з Атлянтычнага акіяну.

У 100 г бульбы толькі 70 калёрыяў. У гэтай гародніне шмат вітаміна С, кальцыю і фосфару. Усе гэтыя рэчывы маюцца ў скурцы, таму часьцей варыце бульбу "у мундурах". Новая небясьпека: эгіпецкая бульба атручаная бактэрыямі, што выклікаюць захворваньні сьлізістай абалонкі.

Якому зь белых вінаў аддаць перавагу? Два бакалы "Бардо" на дзень —цудоўна. Зьмесьціва алькаголя не павінна перавышаць 10 працэнтаў. Чырвонае віно, калі піць яго кожны дзень, зьніжае колькасьць халестэролу ў арганізму і павышае колькасьць ліпапратэіну, зьніжае рызыку атэрасклерозу і інфаркту.

Перавага кансэрваў у тым, што іх можна доўга захоўваць, у іх няма кансэрвантаў. Недахоп — пры вырабу кансэрваў высокая тэмпэратура забівае вітаміны B1, B2, B6 і C.

Французскія ахвяры беларускай партызанкі:

«ружовая пляма» гісторыі сусьветнай вайны

Прадмет сучаснай гістарычнай навукі — чым далей ад нас другая сусьветная вайна, чым больш зьяўляецца твораў пра яе, тым больш «белых пляма́ў» у яе гісторыі заўважае вока зацікаўленага дасьледчыка. Парадокс гэты ўзмацняецца, калі засяродзіць увагу на падзеях таго часу на тэрыторыі Беларусі, у прыватнасьці, зьвярнуцца да гісторыі савецкага партызанскага руху.

Колькі ўжо за 50 гадоў надрукавалі літаратуры на гэтую тэму: і зборнікі дакумэнтаў, і мэмуары ўдзельнікаў, і навуковыя распрацоўкі... Кнігамі гэтымі, напэўна, можна заставіць не адзін пакой. І ўсё адно гісторыя савецкае партызанкі ў Беларусі ў 1941-44 г. — амаль суцэльная «белая пляма». А складаецца гэтая вялізная «пляма» з мноства невялікіх «плямак», якія зьзяюць амаль некранутай беласьцю й вабяць дасьледчыка забыцца на йснаваньне шматмоўя літаратуры «нібытапрагэта», самому паглыбіцца ў архіўныя нэтры й з дапамогай дакумэнтаў паспрабаваць высьветліць, а які ўсё ж сапраўдны колер хаваецца за белым зьзяньнем. І тады пачынае белата патроху ружавець, і з кожным новым дакумэнтам гісторыя атрымліваc ўсё больш насычаны колер — быццам у бялюткае малако ціханіха, па кроплі, капае яркачырвоная кроў...

8 жніўня 1996 г. мінула 55 гадоў з таго часу, як першы грамадзянін Францыі быў залічаны ў савецкі партызанскі атрад у Беларусі. Прынамсі, такая дата пазначаная ў «Сьпісах іншаземцаў, што прымалі ўдзел у партызанскім руху на Беларусі ў 1941-1944 гг.» (гэтыя «Сьпісы...», складзеныя супрацоўнікамі былога Партархіву ЦК КПБ недзе ў 1950-х, ніколі не друкаваліся) насупраць прозьвішча П'ера Ражэ Фэршы, жыхара Бардо, 16-гадовага партызана атраду №48 з Магілёўшчыны.

Усяго за гады вайны ў савецкай партызанцы ў Беларусі бралі ўдзел каля 60 французаў. Гэта былі палонныя альбо перабежчыкі з французскіх і нямецкіх вайсковых частак — добраахвотнікі з французкага легіёну ўраду Вішы й жыхары анэксаваных Эльзасу й Лятарынгіі — зь нямецкае арміі. Парознаму склаўся партызанскі й пасьляпартызанскі лёс гэтых людзей. Чатырнаццаць зь іх атрымалі савецкія ўзнагароды. Хтосьці пасьля ліпеня 1944 трапіў у Чырвоную Армію (А.Барбіш, В.Бруно, Л.Вэрдэн, Р.Дэкс і інш.). Некаторыя пасьпяхова вярнуліся дадому, прычым прынамсі аднаму зь іх беларускае партызанкі здалося замаля: былы баец атраду імя Гастэлы брыгады імя Варашылава, што дзейнічала на Віцебшчыне, Жорж Нус у 1969 г. быў ужо ў Віетнаме, дзе ў шэрагах мясцовых партызанаў ваяваў супраць амэрыканцаў... Аднак сьляды значнай часткі гэтых французаў губляюцца недзе ў беларускіх партызанскіх лясах (так, апошні вядомы запіс пра згаданага ўжо П'ера Фэршы кажа, што ён «26.11.43 пакінуты ў тыле ворага»). Між тым дакладна вядома, што дзесяць зь іх засталіся ў гэтых лясах назаўжды.

Як вядома, вялікае заўсёды бачыцца на адлегласьці. Таму гэтая мізэрная частка тых шматтысячных ахвяраў, што панесьлі прадстаўнікі розных народаў падчас партызанскае вайны ў Беларусі ў 1941-1944 гг., здаецца кропляй вады, у якой можна разгледзець мора. Абставіны пагібелі іншаземцаў, якія, відаць, найчасьцей зусім выпадкова трапілі ў вір партызаншчыны, і большасьць зь якіх не пасьпела нават засвоіць мову тых, хто ваяваў побач зь імі, даюць, на наш погляд, пажытак для роздуму й для некаторых высноваў...

Такім чынам, чацьвёра французаў загінулі падчас правядзеньня баявых апэрацыяў. Дакладна праз 2 гады пасьля пачатку савецка-нямецкае вайны, 22 чэрвеня 1943 г., недзе на Берасьцейшчыне загінуў бацц партызанскае брыгады імя Панамарэнкі, 22-гадовы лятарынгец Марсэль. 28 красавіка 1944 г. загінуў і «пакінуты на полі бою» сваімі «братамі па зброі» з брыгады «Дзядзькі Колі» (Меншчына) 24-гадовы ўраджэнец Брусэлю, былы токар з парыскае аўтафабрыкі «Рэно» Мішэль Мініані (ці Мічэні). Прабыў ён савецкім партызанам усяго паўгады (дата залічэньня ў брыгаду — 28.9.43 г.).

У адрозьненьне ад сваякоў М.Мініані, сваякі жыхара Страсбуру Ягана Вінклера могуць, калі будуць мець жаданьне, наведаць магілу свайго родзіча. Гэты немалады ўжо чалавек (1897 ці, зь іншых зьвестак, 1887 г. нар.) 22 кастрычніка 1943 г. добраахвотна перайшоў з Лагойскай «СС» у атрад імя Катоўскага брыгады «Народныя мсьціўцы» (пазьней — імя Варанянскага) і загінуў 17 траўня наступнага году «падчас мінаваньня шляху Астрашыцкі Гарадок — Радашкавічы». Пахаваны на вясковых могілках у вёсцы Селішча Лагойскага раёну.

Знайшоў свой апошні прытулак у беларускай зямлі й партызан атраду імя Шчорса брыгады імя Шчорса Раман Дубост (1922 г. нар.). Вось як апісвае апошні бой камандзір гэтай брыгады М.Дзербан у дакладной запісцы на імя начальніка Беларускага штабу партызанскага руху: «Перабежчык француз Дубост, які быў на заданьні ў в. Альхоўка, сустрэўся з ротай РОА (Рассійскай Вызвольнай Арміі. — І.Л.), ён меркаваў, што яны йдуць здаваць партызанам, і падышоў да іх усутыч, і калі апошнія прапанавалі яму здацца, Дубост адказаў лаянкай на адрас «народнікаў», залёг у кювэт і пачаў адстрэльвацца, біўся да апошняга патрону, у гэтай перастрэлцы ім былі забітыя 10 чал. і параненыя 12, і агонь спыніў ён толькі тады, калі варожая куля абарвала яго жыцьцё...» (Нацыянальны архіў РБ, фонд 3500, вопіс 4, справа 132, том 1, аркуш 115). Застаецца дадаць, што адбыўся гэты бой 10 кастрычніка 1943 г.

Пра Рамана Дубоста мы яшчэ згадаем далей, а цыпер адзначым, што ўвогуле ў партызанскай брыгадзе імя Шчорса зь Меншчыны французаў ваявала як нідзе — поўны «чортаў тузін» (больш чым кожны пяты ад агульнай іх колькасьці!). Калі як сьлед вывучаць дакумэнты, можна заўважыць адзін цікавы нюанс: 12 з 13 перабежчыкаў-французаў зьявіліся ў брыгадзе да 1 студзеня 1943 г., яшчэ адзін — да 10 траўня таго самага году, а пасьля гэтага колькасьць французаў тут ня толькі не павялічвалася, але і ўвесь час зьмяншалася. Вось што піша пра гэта М.Дзербан: «Правядзеньнем палітыка-выхаваўчае працы сярод перабежчыкаў атрады брыгады дамагліся таго становішча, што ў мінулым людзі, якія знаходзіліся ў варожай арміі, працуюць някепска на нашую карысьць, так напрыклад: пры дапамозе перабежчыка француза Дубост Рамана й ваеннапалоннага француза Джо (Джо Дабэрт —парыжанін 1920 г. нар. з вышэйшай адукацыяй: у дужках адзначым, што адукацыя Дубоста — 2 клясы — І.Л.) намі была выкрытая група шпегаў «легіянэраў» (sic! — І.Л.), што былі засланыя ў атрады з заданьнем разведвальнага характару на карысьць немцаў» (НА РБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 132, т.1, арк. 115).

Здаецца, што вынікам менавіта гэтай «працы» стаўся расстрэл 14-га й 15-га ліпеня 1943 г. двух партызанаў з атраду «Камуніст», двух парыжанаў: Міль Рэнэ (1914 г. нар.) і Аляксандра Гета (1919 г. нар.). Але гэта было яшчэ ня ўсё. Вось цытата з «Выпіскі з журнала баявых дзеяньняў партызанскага атраду імя Варашылава брыгады імя Шчорса за 1943 г.»: «20.12.43 г. Расстраляныя 2 чал. перабежчыкі з французскага батальёну ў п/а імя Варашылава для шпіянажу й разьведкі. Кіраўнік — Панкавец М. Удзельнікі — Панкавец М., Касьцюковіч М.» (НА РБ, ф.3500, воп.132, т.1, арк. 227). На гэты раз свой апошні прытулак у беларускай зямлі знайшлі жыхар Клермон-Фэрану Поль Тэрлідэй (1905 г. нар.) і жыхар г. Саспэль Эжэн Легаль (1912 г. нар.). У партызанскую брыгаду імя Шчорса французы больш не перабягалі...

Апошнія дзьве французскія ахвяры беларускае партызанкі таксама загінулі ад рук сваіх паплечнікаў. 16 траўня 1944 г. быў страчаны бацц партызанскае брыгады Гудкова (Віцебшчына) Леон Бэге (1912 г. нар.). Такі самы лёс напаткаў і жыхара мястэчка Давэн з дэпартамэнту Па-дэ-Кале Кадыла Жона (ці Кона; 1918 г. нар.). І дарма, што 12 лістапада 1942 г. у гутарцы камандзіра партызанскае брыгады Крупскага раёну С.Мазура з супрацоўнікам Камісіі па гісторыі Айчыннае вайны ён быў ахарактарызаваны як «вельмі актыўны партызан» (НА РБ, ф. 3500, воп. 93, арк. 10). Ужо 24 чэрвеня 1943 г. гэты француз быў «расстраляны як фашыст».

Мусім падвесьці абяцаныя вынікі. Такім чынам, дакладна вядома, што прынамсі 16% (10 з 60) французаў - савецкіх партызанаў загінулі ў беларускіх лясах. 40% зь іх сталіся ахвярамі немцаў ды іхніх хаўрусьнікаў, 60% страчаныя згодна з прысудам «Особых отделов» савецкіх партызанскіх адзінак. Дакумэнты, паводле якіх было б магчыма высьветліць сапраўдную вінаватасьць страчаных, трэба шукаць у архівах менскага КГБ, а мо й маскоўскае ФСБ, але мы й ня ставілі перад сабою гэткага заданьня. Здаецца, што тэндэнцыя й так прасочваецца даволі выразна. Наколькі карэктна будзе перанесьці яе на агульную колькасць партызанаў, што загінулі ў 1941-1944 г., няхай вырашаць будучыя дасьледчыкі й, натуральна, шаноўныя чытачы.

Ігар Лялькоў

Музэй на тэрыторыі

Нататкі з канфэрэнцыі

Лагоднымі днямі «бабінага лета» 14-16 кастрычніка ў Полацку адбывалася ІІ-я Міжнародная канфэрэнцыя, прысьвечаная музэефікацыі гістарычных тэрыторыяў. Наладзілі імпрэзу супрацоўнікі Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка пры арганізацыйнай і фінансавай падтрымцы Віцебскага аддзяленьня Беларускага Фонду Сораса. Да ўдзелу ў навуковым форуме былі запрошаныя спэцыялісты з Полацку, Віцебску, Браслава й Менску, а таксама з Кіева, Пскова, Масквы й Санкт-Пецярбургу.

Асноўнае пытаньне — музэефікацыя тэрыторыі старажытных гарадоў ды садова-паркавых комплексаў і сядзібаў. У тым, што тэма гэтая надзвычай актуальная, удзельнікі пераканаліся як падчас агляднае экскурсіі ў полацкім гістарычным цэнтры, гэтак і ў часе наведваньня Бачэйкава — колішняе сядзібы Цеханавецкіх.

Першы працоўны дзень распачаўся з грунтоўных дакладаў навуковых супрацоўнікаў сэктара музэйнага праектаваньня Беларускага Інстытуту праблем культуры Алы Сташкевіч і Алеся Каўбаскі. А.Сташкевіч зьвярнула ўвагу на нявызначанасьць базавых паняткаў тэмы канфэрэнцыі. Юрыдычнаму забесьпячэньню музэефікацыі, а дакладней — яго адсутнасьці на нацыянальным узроўні, прысьвяціў свой разважлівы выступ А.Каўбаска.

Супрацоўнік Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытуту Вадзім Гліньнік распавёў пра захаваньне тэрыторыі Вялікага пасаду — найбуйнейшае часткі гістарычнага цэнтру Полацку. З крытычным аглядам досьведу музэефікацыі архітэктурных помнікаў старажытнага Пскова выступаў археоляг-мастацтвазнаўца пскоўскага інстытуту «Спэцпраектрэстаўрацыя» Юры Бірукоў. Прафэсар катэдры ляндшафтнае архітэктуры Маскоўскага архітэктурнага інстытуту д-р Вергуноў зьдзівіў прысутных тым, што, нягледзячы на 30-хвілінны рэглямэнт, сумленна адчытаў акадэмічную (па часе) лекцыю са слайдамі аб сваіх турыстычных вандроўках па сьвеце. Разьвіццю Браслаўскага музэйнага аб'яднаньня прысьвяціла сваё паведамленьне дырэктар тамтэйшага краязнаўчага музэю Галіна Падалян.

Другі дзень удзельнікі паехалі ў Бачэйкава. Па дарозе выкладчык катэдры гісторыі Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсітэту Ўладзімер Лобач распавёў пра вынікі сёлетняе бачэйкаўскай археалягічнае экспэдыцыі, а мілая полацкая журналістка Ларыса Малашэня экспромтам прасьпявала тамтэйшую купальскую песьню. На ўшчэнт здэградаванай тэрыторыі колішняй сядзібы Цеханавецкіх рэй вёў вядомы аматар садова-паркавай старасьвеччыны д-р Анатоль Федарук. Палымянасьць прамовы і шчыры імпэт прафэсара змусілі прысутных на хвілю адкаснуцца ад скрайняй занядбанасьці гэтай гістарычнай мясьціны і ад яе сучасных архітэктурна-пляніровачных дурнотаў: бальнічнага будынку сылікатнае цэглы, пасаджанага амаль на месцы зруйнаванага бараковага палацу ў цэнтры парку, ды несумернага гістарычнаму асяродзьдзю і недарэчнага жалезабэтоннага «касманаўта» перад клясыцыстычным сядзібным флігелем.

У флігелі супрацоўнік Віцебскага абласнога краязнаўчага музэю Алег Сядлоўскі азнаёміў удзельнікаў з практыкай мастацкіх акцыяў віцебскіх творцаў, якія ўжо колькі гадоў запар ладзяць у Бачэйкаве свае пленэры. Разьмешчаная ў клясыцыстычным будынку мадэрнісцкая выстава ня дала нагоды выслаўляцца пра праблемы музэефікацыі гістарычнае сядзібы, затое выразна засьведчыла, што апошнім часам Бачэйкава ператварылася ў поле самарэалізацыі сучаснае культуры, гэткі экспэрымэнтальны абшар мастацкіх правакацыяў, дзеяў, акцыяў і скандалаў, бясконца цікавых, але да традыцыяў месца недарэчных.

У Полацак вярталіся празь Бешанковічы, дзе ў кабінэце мясцовага кіраўніка працягнуліся навуковыя дыскусіі. З кароткімі паведамленьнямі выступілі дацэнт катэдры батанікі Санкт-Пецярбурскай лесатэхнічнай акадэміі Нешатаеў («Мэтодыка пашпартызацыі й ацэнкі стану прыродных комплексаў гістарычных паркаў») і дацэнт Беларускай політэхнічнай акадэміі Сяргей Сергачоў («Палацавасядзібны комплекс у Дудзічах і праблемы фармаваньня сучаснага асяродзьдзя»). Пра мясьціны сусьветнае спадчыны на сваёй бацькаўшчыне ў даліне Катманду распавёў асьпірант катэдры тэорыі й гісторыі архітэктуры БПА Рохіт Раджыткар (Нэпал). Сваімі думкамі пра разьвіцьцё тэрыторыі былой Бачэйкаўскай сядзібы падзяліўся дырэктар музэю-запаведніка «Парк Манрэло» сп-р Лямін.

Гаварылі таксама пра рэстаўрацыю сядзібна-паркавага ансамблю ў Туганавічах — мясьціне, зьвязанай з імем Адама Міцкевіча, 200-годзьдзе якога мы будзем неўзабаве сьвяткаваць. З паведамленьнем пра гэта выступіла Тацяна Косьціч зь Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытуту. Супрацоўнік музэю-сядзібы І.Рэпіна ў Здраўнёве Валеры Шыманаў распавёў пра стан нядаўна згарэлага сядзібнага дому, які быў збудаваны паводле праекту славутага расейскага мастака.

Як звычайна, не абышлося і без кур'ёзу. Пецярбурскія навукоўцы, сутыкнуўшыся з традыцыйнай беларускай гасьціннасьцю, тры дні запар перабывалі ў стане добрае падпітку, праз што ўсялякія спробы наладзіць зь імі прафэсійныя сувязі аказаліся марнымі.

Напрыканцы варта адзначыць, што і бачэйкаўскія мастацкія акцыі, і сама полацкая канфэрэнцыя сталіся магчымымі дзякуючы руплівасьці выканаўчага дырэктара Віцебскага аддзяленьня Беларускага Фонду Сораса сп-ні Валянціны Кірылавай. Полацкая навуковая імпрэза, прысьвечаная адной зь лякальных праблемаў захаваньня культурнае спадчыны, зьявілася знакам дэцэнтралізавацыі беларускае культуры, сьведчаньнем ажыўленьня нашых рэгіянальных навуковых асяродкаў.

В.Г.

Kalandar

KALANDAR

28 kastryčnika

U hety dzień... u 1949 h. u avijakatastrofie zahinuŭ francuski majstar boksu Marcel Cerdan, jaki byŭ kachankam śpiavački Edith Piaf.

29 kastryčnika

U hety dzień... naradzilisia: Joseph Goebbels (1897-1945), hitleraŭski ministar prapahandy; Janka Sałamievič (1938), biełaruski encyklapedyst.

30 kastryčnika

U hety dzień... u 1988 h. mienskaja milicyja pałkami, vadamiotami i ślezaciečnym hazam razahnała mitynh-rekvijem Dziady.

Naradzilisia: irlandzki dramaturh i palityk Richard Brinsley Sheridan (1751-1816); amerykanski paet Ezra Pound (1885-1972).

31 kastryčnika

U hety dzień... u 1517 h. Marcin Luter admoviŭ papu rymskamu ŭ pravie adpuskać hrachi, a ŭ 1984 h. ad ruki zabojcy zahinuła premjer Indyi Indira Gandhi.

Naradzilisia: anhielski paet John Keats (1795-1821); kiraŭnik Kitaju ŭ 1943-49 hadach Czang Kaj-Szek (1887-1975).

1 listapada

U hety dzień... naradzilisia: Łuka Bende (1903), biełaruski litaratar-pasłuhač NKVD; biełaruski piśmieńnik Viačasłaŭ Adamčyk (1933).

2 listapada

U hety dzień... naradzilisia: biełaruski mastak i paŭstaniec Michał Andryjoli (1836-93); biełaruski piśmieńnik Maksim Łužanin (1909)

3 listapada

U hety dzień... u 1957 h. na kalaziamnuju arbitu byŭ zapuščany savieckі satelit Sputnik II z sabakam Łajkaj na borcie — pieršaj žyvoj istotaj u kosmasie.

Naradziŭsia Jakub Kołas (1882).

Марэк Навакоўскі

ВАЕННАЕ СТАНОВІШЧА

Стала цёмна. Мароз мацнеў. Прадмесьце заўчасна абязьлюдзела. Толькі адтуль, дзе крапасным масывам чарнела гута, даносіўся бесьперапынны бразгат. Гэта танкі і гусенічныя транспартэры набліжаліся да забарыкадаваных брамаў камбінату. Войска абкружала гуту. У тым самым кірунку рухалася калёна жаўнераў з аўтаматамі з насунутымі багнэтамі. У сьвятле нешматлікіх ліхтароў калёна незвычайна зіхацела халодным бляскам. Дарогу да гуты загароджвалі бэтонныя перашкоды. Каля іх стаялі два ахоўнікі ў шапках-вушанках. Прытопвалі нагамі і пляскалі ў далоні. На грудзях у іх віселі аўтаматы. На процілеглым баку загароджанай дарогі зьзяў кокс у печцы. Трэці з жаўнераў грэўся каля яе. Варочаў кіем чырвонае вугольле. Доўгія, вострыя, як шкілеты, соплі зьвісалі з страхі камяніцы. Вартавы трохі адсунуўся ад сьцяны дому, што небясьпечна натапырылася зьверху. Нешматлікія мінакі абыходзілі жаўнера здалёк. Ён іх праводзіў насьцярожаным поглядам. Тады ягоныя далоні пакідалі палоску цяпла над вагнём і клаліся на сталь аўтамата. Людзі шпаркім крокам пераходзілі вуліцу. Не глядзелі ў ягоны бок. Вокны камяніц былі цёмныя. Сканчаўся трэці дзень ваеннага становішча, і набліжаўся камэнданцкі час.

З завулку выехала таксоўка. Наблізілася да заблякаванай дарогі. Спынілася перад бэтоннымі блёкамі на бруку. Вартавыя падыйшлі да машыны. Зброю трымалі напагатове. Праверка дакумэнтаў. Адкрылі багажнік. Доўга корпаліся ў ім. Таксоўка паехала назад.

Стала ціха. Бразгат бранятэхнікі каля гуты сьцішыўся. Доўга ніхто не паказваўся. Таму нечакана водгалас крокаў загучаў вельмі рэзка. Нехта паволі і цяжка перасоўваў ногі. Згорблены, бясформны сылюэт замаячыў у браме. Прыкульгаў да коксавай печкі. Гэта была старая кабета зь мехам цераз плячо. Малады жаўнер уважліва паглядзеў на яе. Яна скінула свой цяжар са сьпіны. Твар яе быў худы, зусім змарнелы і зморшчаны. Запад хусты на чало спадалі пасмы сівых валасоў. Яна пачала гэрць рукі над жарам.

— Халодна табе, жаўнерык, — сказала і прытулілася да печкі. Заплюшчыла вочы.

Каля гуты загучаў пранізьлівы вой сырэны. Разьдзёр марозную цішу. Вартавыя пры дарозе неспакойна зварухнуліся. Малады жаўнер таксама ўглядаўся ў той бок. Старая кабета нават не кранулася. Яна выглядала, як нежывы прадмет. Трымала далоні над жарам. Рэўматычныя і выкрыўленыя пальцы няспынна трымцелі. Малады жаўнер нецярпліва пакратаўся. Яму пачала муліць прысутнасьць старой кабеты. Ён шморгнуў носам і выразна зірнуў на свой гадзіньнік. Тады старая цяжка ўзьняла галаву.

— Шкада... Шкада ўсіх... — вымавіла ціхім, хрыпатым голасам. — І цябе шкада... — Утаропіла ў жаўнера вочы старой маці. У той самы час гэта былі вочы ястраба, лупатыя і пранізьлівыя. — Кроў на сьнезе... Глянь, жаўнерык!

Малады жаўнер, яўна зьбянтэжаны, азірнуўся навокал. Сьнег паўсюль іскрыўся марознай бельлю. Некранута белы сьнег. Жаўнер здрыгануўся. Мароз мацнеў. А гэтыя словы старой былі яшчэ больш ледзяныя. І так упарта ўглядалася яна ў яго.

— Што вы, баба! — адгукнуўся ўрэшце жаўнер і бязрадным жэстам пасунуў аўтамат на грудзях. Гэта быў малады хлапец з пухлаватым вясковым тварам. Апусьціў галаву і пачаў кончыкам бота калупаць сьнег.

Старая закінула свой жабрачы мех на сьпіну. Павольна патупала ў цемру. Толькі сьнег хрумкаў пад яе нагамі.

— Хто гэта там?! — крыкнуў адзін з вартавых з дарогі.

— Нейкая дурніца! — адгукнуўся, хвіліну памарудзіўшы, малады жаўнер. Прысеў да печкі. Кокс патрэскваў. Дым, агонь...

1 студзеня 1982 г.

У АЎТОБУСЕ

Гэта быў аўтобус нумар 122. Ён ехаў па вуліцы Бэльвэдэрскай. Людзі маўчалі. Апошнім часам людзі маўчаць, і не чуваць ужо тых характэрных жартаў ці лаянак, такіх звыклых для гарадзкога трансларту. Нават непрадугледжаная затрымка перад скрыжаваньнем ня выклікала ніякіх камэнтароў. Затрымка гэтая адбылася з-за калёны бронемашын і ваенных грузавікоў, якая стужкай накіроўвалася некуды. За грузавікамі пагойдваліся накрытыя брэзэнтам гарматы. Калёну замыкаў газік. Урэшце праезд вызваліўся, і аўтобус паехаў далей. Ён асьцярожна рухаўся па абледзянелым асфальце. Якраз мінаў па левым баку квартал, дзе жылі савецкія дыпляматы і дарадцы. Будынкі рознай вышыні, абнесеныя мурам.

— Акапаліся кацапы! — гукнуў малады, непрыкметны мужчына ў пацёртай футравай шапцы. — Баяцца штурму. — Голас у яго быў нечакана звонкі й пранізьлівы. Ён па-вар'яцку зарагатаў.

Некалькі пасажыраў зірнулі ў ягоны бок. Але маўчалі.

— Што ты сказаў? — крыкнуў аднак нехта сьпераду. Ён быў тоўсты, нізкі. Таксама ў футравай шапцы, з бліскучым, выгаленым тварам. Ён пачаў энэргічна прасоўвацца да маладога мужчыны, што стаяў каля сярэдніх дзьвярэй. Дапамагаў сабе лакцямі.

Малады мужчына відавочна разгубіўся і аўтаматычна зірнуў на дзьверы. Кіроўца бачыў усё, што адбывалася, у люстэрка. Раптам ён націснуў на тормаз. Затармазіў рэзка і таксама рэзка рвануў машыну наперад. Людзі пакаціліся наперад і падхапілі з сабой таўстуна ў футравай шапцы. І хаця той спрабаваў супраціўляцца, аднак гэтая людзкая маса зьмяла яго, нібыта лавіна, і прыціснула да шкляной шыбы, якой кіроўца быў аддзелены ад рэшты аўтобуса. У гэты момант лёгкая ўсьмешка зьявілася на змучаным, зарослым твары кіроўцы. І адразу ж зьнікла.

Таўстун у футравай шапцы безвынікова кідаўся ў розныя бакі. Ён схапіўся за поруч і паспрабаваў прайсьці далей. Аднак здолеў прасунуцца толькі на мэтар, ня больш. Натрапіў на бакавое сядзеньне для інвалідаў. Там сядзеў івалід і нерухомай нагой загароджваў яму дарогу.

І вось прыпынак. Плынь сьціснутых людзкіх целаў канчаткова спыніла таўстуна ў футравай шапцы. Адначасова кіроўца націснуў патрэбную кнопку на таблё. Дзьверы аўтаматычна з шыпеньнем расчыніліся. Сярэднія найхутчэй. Малады непрыкметны мужчына, які ўжо стаяў на прыступках, борздка выскачыў з аўтобуса.

Таўстун у футравай шапцы прадзіраўся да пярэдняга выйсьця. Атрымлівалася ў яго цяжка. Чырвоны, разьюшаны бульдог. Ён сапеў. Кіроўца назіраў за ім з халоднай увагай. Ветліва чакаў. Урэшце той выйшаў. Пачаў бязрадна разглядацца навокал. Малады чалавек зьнік бязь сьледу. Тады таўстун запісаў нумар аўтобуса, які ад'ежджаў.

Пераклаў з польскай Валеры Буйвал

Марэк Навакоўскі (нар. 1935), польскі пісьменьнік. Ляўрэат прэміі французскага ПЭН-клюбу, прэміі «Салідарнасьці» ды іншых. У сакавіку-чэрвені 1984 г. сядзеў у турме за «абылганьне сацыялістычнага ладу і супрацоўніцтва з замежнымі дывэрсійнымі цэнтрамі». Кніга «Рапарт пра ваеннае становішча» выйшла ў Парыжы ў 1982-83 г. і за кароткі час была перакладзеная на дзесяць моваў як літаратурнае сьведчаньне польскай трагедыі. Сёньня мы друкуем дзьве навэлы з гэтае кнігі.



РЫМСКІ

Міхал Баразна

І варта сёньня на свае вочы бачыць мастацкія шэдэўры, раскіданыя па сьвеце божай ласкаю і зьнішчаныя ў Беларусі супраць гэтае волі? Уласна для сябе я ня стаўлю такога пытаньня, але яно насамрэч існуе ў краіне, замаскаванай пад пустэчу ў эўрапейскім гушчары.

Знаёмства з рукатворнай прыгажосьцю шмат вырашае ў жыцьці чалавека. Ня ўсім удаецца яшчэ ў раньнім дзяцінстве адчуць узьдзеяньне арыгіналаў высокага мастацтва. Можна гэтую эмацыйную ўзьнёсласьць змадэляваць у сваёй сьвядомасьці. Але ж гэтага недастаткова. Мы маем унікальны фэномэн аднабаковых культурных сувязяў. Наша будзёншчына сьведчыць пра неадэкватнасьць успрыняцьця насельніцтвам сфармаваных жыцьцём вобразаў. Грамадзтва добраахвотна валачэ на шыі паразытычны баласт-рэшту таталітарнай культуры. Прымусовае наведваньне чаргі маўзалею, экскурсія да «вечнай стаянкі» крэйсэра «Аўрора» і г.д. застаюцца трывалымі «маякамі» ў полі культурных каштоўнасьцяў. Вось і здаецца, што «нет ничего прекрасней...»

Рым (Roma).

З раніцы пайшоў па старых вуліцах. Адчуваньне няспыннай жывапіснасьці празь пераліваньне адценьняў. Фактуры шалупіньня фарбавых слаёў і старой тынкоўкі, цьвіль, абарваныя падлеткамі сьвежыя афішы, незразумелыя «графіці» розных колераў маляўніча перапаўзаюць са сьцяны на сьцяну старога гораду.

Шкада, што на словах не перадасі гук і пахі цэнтру горада. Гукі нашых гарадоў універсальныя, невыразныя. Вечны горад запамінаецца трэскам матаролераў, стражатаньнем цыкадаў, своеасаблівым восм сырэнаў, шумнай гаворкай жыхароў. «Рымчукі» ставяцца да свайго «вечнага» гораду не як да старога дзіравага экспанату, пакрытага лякам і музэйным пылам. Гэта жывы арганізм з натуральнымі праявамі жыцьця. Можна ўбачыць, як рэшткі антычнасьці выкарыстоўваліся пры будаўніцтве базілік і жытла.

Падыходзіў да Foro Romano. Захавалася ад гэтага некалі велізарнага комплексу вельмі мала. Старажытныя руіны больш цікава глядзяцца ў творах мастакоў-ідэалістаў. Насамрэч вынік разбурэньня ня можа правака-

СТАНДАРТ



ваць узьнёслае захапленьне.

Ля Калізэю (Colosseo) жыццё надзвычай бурліва. Ідзе рэстаўрацыя гэтага агромністага кубка. Спадабаліся яго бліскучыя на сонцы рыштаваньні, праўда, рэстаўратараў на іх ня бачна. Мяркую, што ў прахалодзе і цішы «сем разоў адмяраюць».

Тагачасны чалавек любіў забавы больш за ўсё. Colesseo зроблены перш за ўсё для ўцех і перавышае сваімі памерамі, архітэктурнай вытанчанасьцю ўсе паганскія храмы. Матэрыялізаванае чванства, схованка непаўнавартасьці ўлады. Хрысьціянства сваёй культавай архітэктурай спрабавала адхіліць чалавека ад небясьпечнага ўзвышэньня прымітыўнага.

На пляцы Сьв. Пятра жандары забаранілі фатаграфаваць са штатыву. Добра, што

пасьпеў пару разоў «пстрыкнуць», пакуль яны да мяне падыйшлі. Сфатаграфаваць зблізку сабор, каб быў максымальна адкрыты мікеланджэлаўскі купал, вельмі цяжка — кадар перакрывае абэліск. Здалёк здымаць — рухаецца транспарт, ці стаяць велічэзныя турыстычныя аўтобусы. Аб'ектыў сам імкнуўся ўгару, дзе менш мітусьні. Урэшце, «верхніх» здымкаў аказалася больш.

Раней людзі ездзілі ў вечны горад аглядаць помнікі, а цяпер — толькі фатаграфавацца. Месцы, дзе катавалі першых хрысьціян, дзе шмат было забіта глядыятараў, сёньня — фон

для расьцягнутых ад задавальненьня вуснаў. Ch-e-e-se!

Мікеланджэла — майстар рэалізацыі фантастычных задумаў у архітэктуры, плястыцы і манумэнтальным жывапісу. У фрэсках ён найперш вялікі інтэлектуал, чым артыст. У калярыстыцы — саступае многім шукальнікам «пералівістай» жывапіснасьці. Моц духу неапісальная. Глядзеў і здзіўляўся, як яму заказчыкі дазволілі пачаць і завершыць «Страшны суд». На меркі постсавецкіх барацьбітоў за духоўнасьць, яго кардоны ніколі не прайшлі б цэнзуру мастацкіх нарадаў.

Увесь час трымаіць думка, што ўсё нашае жыццё — несапраўднае. Перавернутае. Мы баімся дыхнуць на старое, потым яго зьнішчаюць, нікога не пытаючыся. Мусім шанаваць часовае, непаўнавартаснае, упарта пакідаем сучаснасьць па-за плотам актуальнасьці. Каб убачыць прыгажосьць мармуру, забіраемся пад зямлю, у мэтро. А яны глядзяць, наадварот, — уверх.

Рым, 1996

ЗАНАТОЎКІ ЭГАІСТА

Ты адзіны...

Адам Глёбус

♥ Сьнедаў і мерыў тэмпэратуру. Ці не захварэў?

У чалавека норма вядомая — 36,6°. У д'ябла яна, напэўна, іншая, можна дапусьціць, што — 66,6° (бо лічба — 666). Калі пабудаваць простую сымэтрыю, паставіўшы чалавека паміж дабром і злом, дык тэмпэратура Бога наблізіцца да 0 і будзе 6,6° паводле Цэльсія...

Пасьнсдаўшы, я зазначыў на градусьніку норму — 36,6°. Значыць, ізноў лёгкая прастуда й перастома.

♥ Заўважыў, што большасьць вернікаў думаюць пра Бога, як пра вялікага кіраўніка, які можа выпісаць ордэр на жылплошчу ў Раі. О, каб так і было на самой справе!

♥ «Бойся Бога!» — гаворыць той, хто пажадаў уладарыць над табою.

♥ Нават цяжка ўявіць, як абрыдлі Богу людзі са сваімі прашэньнямі.

♥ З д'яблам можна пагаварыць, паспрачацца, пажартаваць... Перад Богам варта маўчаць і слухаць.

♥ Шмат разоў задаваў сабе адно й тое пытаньне... Чаму люблю прагулянкі па могілках? Пакуль не прачытаў у Альбэрта Савініа, што Эўропа — гэта магіла Бога.

♥ Пішу Бог зь вялікай літары яшчэ й таму, што вельмі люблю вялікія літары.

♥ «Вы сьмяротныя. Нашто вам думаць пра Багоў?» — пытаецца ўзрушаны кінік Дэмонакт. А я й думаю пра сьмяротнасьць Багоў.

♥ Вера — гэта не суцяшэньне, а наводзіны, у якіх ёсьць месца і суцяшэньню.

♥ Прызнаць існаваньне разумнейшага за сябе цалкам нармальна. А вось падпарадкоўвацца разумнейшаму, ня ведаючы яго, — глупства несусьветнае. Большасьць вернікаў якраз і падпарадкоўваецца, толькі не разумнейшаму, а хітрэйшаму, і ня Богу, а папу.

♥ Шкадую, што ня маю поўнай веры. Нават сьмерць не пераконвае, а яшчэ больш раздражняе фантазію і спараджае сумневы.

♥ Як сяброўства, зазвычай, пачынаецца са сваркі, так і вера бярэ выток з блюзьнерства і богазьневажаньня.

♥ Зьнявага чужых Багоў не дадае веры ў свайго Бога.

♥ Каб разьвеяць маркоту, робіцца шмат грэшных учынкаў, а галоўны зь іх — занатоўваньне рэвалюцыйных і атэістычных думак.

♥ Блюзьнерства — салодкім голасам сьвятара нашэптваць пра пекла.

♥ У манахаў, мусібыць, добры абутак, бо шлях да Бога доўгі і пакручасты. Ня варта мяне напракаць за іранічныя ноткі. Манахі — гэта людзі, што йдуць да Бога не праз вучэньне, а праз матэрыю. Манах — цялеснае ўвасабленьне вёры.

♥ Верыш, спадзяесься на Страшны Суд — і ўсё дзеля таго, каб на імгненьне ўваскрэснуць.

♥ Чалавек, які сядзіць на чамадане, заўсёды нагадвае мне пра Хрыста ў пустэльні.

♥ Бог — гэта прадчуваньне катастрофы.

♥ Грэшнікі зьбіраюцца ў царкве. Ня верыш? Учыні кепскае, прызнайся, і табе абавязкова параяць наведаць царкву...

♥ У мінорныя хвіліны пачынае здавацца, што сустрэча з д'яблам — такая ж недасягальная рэч, як і сустрэча з Богам.

♥ Той, хто выказвае нянавісьць да Бога, не абавязкова атрымае д'яблавы ўзнагароды.

♥ Развагі пра Бога, у большасьці сваёй, — гэта размовы пра ідэальны парадак.

♥ Калі адчуеш уласную разумовую абмежаванасьць, ведай: няма іншага выйсьця, акрамя як вызначыць канфэсійную прыналежнасьць продкаў, прайсьці ў храм і зьвярнуцца да Бога.

Музыка

Несталічная штучка

«Ну, што можна сказаць пра Шалкевіча?.. Шалкевіч... Шалкевіч гэта...» Прыклад на так пачаў сваю прамову Эдуард Акулін адкрываючы вечарыну барда з Горадні ў музэі Максіма Багдановіча.

Калі Акулін паведаміў, што Шалкевіч вельмі таленавіты бард, мне стала шчыра прыемна за старэйшага сябра. Калі прамоўца пералічыў невядомыя мне дагэтуль тонкасьці ды якасьці Віктара, я, яшчэ больш утульна ўладкаваўшыся на жорсткім музэйным крэсьле, зь яшчэ большым нецярпеньнем стаў чакаць апошняга. Калі ж пайшла дванаццатая хвіліна лекцыі пра ролю гэтага «чалавека й творцы» ў культурным жыцьці нацыі, я не на жарт усхваляваўся. Поўны трагізму голас Акуліна яўна падводзіў аўдыторыю да чагосьці інфэрнальнага. Але ўсё, чорт пабірай, аказалася нястрашным. За нейкія пяць сэкундаў Эдуард выдыхнуў паведамленьне пра тое, што той, каго мы так чакаем затрымліваецца на аўкцыёне, і што ён, таксама бард, скрасіць нам доўгія хвіліны чаканьня. Уся мая павага ўміг зьмянілася на злосьць і негадаваньне. Не на Акуліна, вядома. Той адрабляў сумленна й як мог. Пасьля ў імправізаванай залі адшукаўся Андрусь Мельнікаў, які таксама з радасьцю выйшаў закрываць амбразуру зрыву. Вечарына аднаго ператварылася ў міні-фэст. Унутрана сабраўшыся, я чакаў свайго зорнага часу. Але ён настаў не для мяне.

Ён ізноў адкруціўся. Распавёў, пэўна, на бягу прыдуманую байку пра нейкага жыдоўскага тэнара, якога таксама вельмі доўга чакалі ў Гародні, і ўсе разлагаднеліся. Я нават дараваў яму парутройку прададзеных зь ягонага малатка цырульняў. Хутка ў залі, больш падобнай да вялікай гасьцёўні, седзячы «на задах» і назіраючы выступоўца з-за галоваў, я адчуў сябе нібыта за вясельным сталом зь няўёмным маршалкам ў галаве. Цюлевыя фіраначкі замест сцэнічнага задніку толькі дадавалі гэтае хатнясьці. Разамлелыя госьці нарэшце дачакаліся й «Ганку з Пагулянкі», і «Польку-трамблямбляньку». Ды яшчэ тузін жыдоўскіх анэкдотаў, вартых увекавечаньня на CD у выкананьні аўтара. Напэўна самым сумным госьцем выглядаў тут я. Не таму, што мне было нецікава. Але, слухаючы шмат разоў чутыя песьні-анэкдоты ды анэкдоты-песьні, мне падалося, што актор забыўся на рэжысуру. Што актора панесла. Тут ён трохі пераціснуў з жартам, тут перастараўся мімікай. Я схаваўся за плечы гледачоў, каб нікога не раздражняць сваім задуменным тварам. Адкрыцца й напяцна мяне прымусіла песьня пра Вільню. Якую я пачуў ад яго ўпершыню й дзеля якой я, напэўна, і патрапіў сёньня сюды. Герой песьні сустракае сваё каханьне за сто крокаў ад Вострай Брамы. За сто міляў ад якой мне й дасюль здаецца, што я ў свой час яго не дачакаўся. Разьлічыўшы ўсе маналёгі ды імправізы свайго спэктаклю, аўтар на фінал пакінуў сьветлую, аптымістычную ноту. Песьню пра «вуліцу, поле, Вялікае Княства...» Але ўсё ж не адмовіў сабе й гасьцям у задавальненьні пасьпяваць на замову. І клічна скончыў свой вечар: «Добрай раніцы! Жлобская нацыя!» Што яшчэ сказаць пра Шалкевіча? Тым больш, што ён і так ведае, як я яго люблю.

Зьмицер Бартосік

Крывіцкая Мэкка

Конкурс

«... Пара ўставаць, духмянай выпіць кавы, і патануць у гулкасонных неэтрах Вільні», — казаў паэт. Паэт меў рацыю, у віленскіх вуліцах і завулках можна патанаць. З асалодаю, бяз роспачы, патанаць у сабе...

Віленскія вуліцы яшчэ прамаўляюць пра тое, што застасцца бяз нас. Будынкі, у якіх жыве цягліо тых, чые імёны жывуць, пакуль будзе жыць Беларусь. Брук, кожная драціна на якім — аповед...

У калейдаскопе стыляў, фарбаў і моваў у Вільні мяняецца шмат, але застаюцца віленскія вулкі, у якіх так лёгка патанаць..

Як завецца гэтая вуліца? Можа, Вы прыгадаеце, з кім, альбо з чым яна зьвязаная? Чакаем адказаў...

Сяргей Харэўскі

Помнікі нашы...

Другая гісторыя

Зь бегам часу мы даведваемся пра сотні прыкладаў зьнішчэньня найлепшых узораў нашае спадчыны. Ужо сёньня пералік складае вельмі доўгі мартыралёг ад якога шчыміць сэрца. Але мы не заўсёды ведаем, хто і як рыхтаваў гэтыя зьнішчэньні. Сярод пыльных архіўных справаў зусім нядаўняе мінуўшчыны я сустракаў дакумэнты, якія ня толькі сьведчаць пра тое, хто пэрсанальна адказны за злачынствы супраць нашае культуры, але дэманструюць вычварную лёгіку вандалаў, спавітую ў фразэалёгію, якую мы чуем апошнія гады зь беларускага радыё.

У Дзяржаўным архіве Магілёўскай вобласьці, у фондзе № 2336 «Упаўнаважанага савету па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР па Магілёўскай вобласьці», ёсьць справа №23 (вопіс 1) «Перапіска, якая тычыцца будынку касьцёлу, што знаходзіцца ў г. Мсьціславе». У гэтай справе на 11 аркушах адлюстраваная гісторыя замаху на Мсьціслаўскі касьцёл кармэлітаў.

У 1947 годзе камісія, якую ўзначальваў прадстаўнік Упраўленьня па справах архітэктуры БССР М.Кацэр, з удзелам прадстаўнікоў абласнога і мясцовых Саветаў, Міністэрства ўнутраных справаў і дырэктара абласнога краязнаўчага музэю Мігуліна агледзела шэсьць мураваных касьцёлаў, што захаваліся на тэрыторыі Магілёўскай вобласьці. Вынікі былі зафіксаваныя актамі, у якіх адзначаны стан будынкаў і страты, нанесеныя вайной.

Па выніках працы камісіі згаданае Ўпраўленьне у сваім лісьце ад 14.08.53 г. паведаміла абласному аддзелу архітэктуры, што, згодна з рашэньнем Савету Міністраў БССР № 625 ад 18.06.1953 г., узята на ўлік «помнікаў архітэктуры» па Магілёўскай вобласьці – 20 аб'ектаў. У прыкладзеным сьпісе былі два будынкі былых касьцёлаў: у Мсьціславе (кармэлітаў) і Магілёве (катэдральны). Зьвярніце ўвагу: з шасьці касьцёлаў, якія агледзела савецкае чынавенства, помнікамі вырашылі лічыць толькі два. Прыкладна ў такой прапорцыі ставіліся на ўлік і ўсе астатнія нашыя здабыткі.

Аднак мясцоваму кіраўніцтву карцела ўсё ж зьнішчыць і будынак касьцёлу ў Мсьціславе. Чаму? Гэта будзе зразумела, калі чытаеш «Докладную записку о количестве и состоянии недействующих бывших костелов и их практическом использовании в Могилевской области» ад 24.06.59 г. за №Д1-17, якая была накіраваная ўпаўнаважаным Савету па справах рэлігійных культаў СМ БССР пры Магілёўскім аблвыканкаме К.Вярбіцкім на імя старшыні Савету па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР(!), а таксама ў абласны камітэт КПБ і аблвыканкам.

У «Записке...» ўпаўнаважаны прыводзіць сьцверджаньні архітэктара Мызьнікава і супрацоўнікаў абласнога аддзела архітэктуры пра адсутнасьць эстэтычных і гістарычных вартасьцяў касьцёлу кармэлітаў у Мсьціславе. К.Вярбіцкі канстатуе, што будынак стаіць на ўліку як помнік, аднак —«... чаму ён аднесены да «помніка»?»

Адказ на гэтае пытаньне даў у сваёй даведцы абласны краязнаўчы музэй: «Каталіцкі касьцёл у Мсьціславе ўвайшоў у гісторыю як помнік тым, што на хорах маюцца карціны, якія адлюстроўваюць бітву расейскіх войскаў цара Аляксея Міхайлавіча, пад кіраўніцтвам Трубяцкога за г. Мсьціслаў у 1654 годзе. Іншых зьвестак у Магілёўскім абласным музэі няма».

Далей прыводзіцца «кваліфікаваная думка» дырэктара абласнога музэя тав. Мігуліна, якога Вярбіцкі называе «вядомым у вобласьці знаўцам жывапісу і карціна». Мігулін выказаў думку, што «карціны, намаляваныя фарбамі на сьцяне ўнутры будынка, з адлюстраваньнем бітвы расейцаў з польска-літоўскім войскам у 1654 г., не ўяўляюць гістарычнай і мастацкай вартасьці. І калі будынак узяты на ўлік толькі таму, дык будынак цалкам магчыма зьняць з уліку». Як бачым, паводле меркаваньня гэтых людзей, якія зусім ня ведалі гісторыі касьцёлу, ён мог лічыцца помнікам з-за росьпісаў XVIII ст.

Вярбіцкі характарызуе зьмест карціны: «... не бяруся меркаваць пра якасьць фарбаў і майстэрства пэндзляў мастакоў тагачаснай каралеўскай Польшчы. З фармальнага боку карціна прысьвечана бітве 1654 г. за Мсьціслаў... , але сэнс, укладзены ў экспазыцыю карціны зьяўляецца для нашага народу антыпатрыятычным, абразьлівым». Вярбіцкі «дае на гарэхі» і польскім гісторыкам, якія пісалі пра зьверствы маскоўскіх стральцоў: «Гэта скажонае, хлусьлівае і варожае апісаньне гісторыкамі каралеўскай Польшчы гістарычных падзеяў 1654 г., прасякнутае паклёпам і нянавісьцю з боку каралеўскае ўлады і каталіцкага сьвятарства. ... стыль і росьпісы ўнутры зробленыя на задуму езуіцкага ордэну кармэлітаў іншаземнымі архітэктарамі і мастакамі, таму архітэктура будынка і роспісы ў будынку ня маюць гістарычнай каштоўнасьці для беларускага народу і разьвіцьця яго нацыянальнага жывапісу і архітэктуры. Таму няма неабходнасьці трымаць яго на ўліку, і будынак належыць да зьняцьця з уліку».

На здымку: так выглядаў касьцёл у 1961 годзе.

Але гэтая спроба зьнішчэньня скончылася няўдала. Нават наадварот, улетку 1961 году былі выдаткаваныя грошы на рэстаўрацыю і адбудову касьцёла з захаваньнем культавага выгляду! Былі ўзьведзеныя рыштаваньні і прывезеныя будаўнічыя матэрыялы. Працу фінансавала Ўпраўленьне архітэктуры Саўміна БССР, а выконвала Горацкая БМВ №1 Магілёўскай вобласьці. Адбыўся сапраўдны цуд! Іншыя тлумачэньні, накшталт —загаварыла сумленьне, дрогнула рука, памяць пра дзядоў і гэтак далей, — непераканаўчыя. Як і каму ўдалося «прабіць» рамонт і такім чынам выратаваць гэтую бажніцу, засталося невядома.

Тэрмінова, на месцы, утвараецца яшчэ адна камісія. У склад яе увайшлі «спэцыялісты па культуры»: «намесьнік старшыні Мсьціслаўскага РВК тав. Купцоў, другі сакратар Мсьціслаўскага РК КПБ тав. Усачанка С., першы сакратар райкаму ЛКСМБ тав. Камай А., заг. адз. нар. адукацыі тав. Карпечкін С., заг. адз. культуры тав. Панамарова Д., настаўнік гісторыі СШ №3 тав. Нікіцін Ю., інспэктар па дзяржаўным архітэктурным кантролі тав. Сыты А., пры ўдзеле тав. К.Вярбіцкага».

Камісія засьведчыла: «... у скляпеньнях касьцёла знаходзяцца сховішчы гархарчгандлю і якія ў добрым стане(!). Дах з жалеза, але моцна пашкоджаны, драўляныя перакрыцьці згнілі і маюць абвалы, гзымсы абвальваюцца, дзьвярныя і ваконныя блёкі зьнішчаныя. У сьценах бачны расколіны. Таму аднаўляць будынак у культавым выглядзе немэтазгодна, на сродкі, якія пойдуць на яго рэстаўрацыю і аднову, лягчэй пабудаваць новы». Зноўку камісія з маніякальнаю ўпартасьцю цьвердзіць: «расейскія ваяры паказаны як забойцы і рабаўнікі... Гэта скажэньне гістарычнай сапраўднасьці і абраза»(!). Ва ўсе інстанцыі ляціць істэрычны ліст з Мсьціслаўскага райсавету з патрабаваньнем да Саўміну БССР — зьняць з уліку будынак касьцёла і прыпыніць фінансаваньне яго рэстаўрацыі! У гэтым лісьце адзначана і самая галоўная прычына: «росьпіс «Разьня Трубяцкога», на якім расейскія ваяры, якія прыйшлі вызваляць беларускі народ ад польскага-шляхецкага іга ў 1654 г., паказаны як забойцы і рабаўнікі. Такі росьпіс... абразьлівы для расейскага і беларускага брацкіх народаў». Пазнаеце лексыку?

Гэта ўнікальны выпадак у бясконцым мартыралёгу нашых здабыткаў, калі прага зьнішчыць бажніцу абгрунтоўвалася наяўнасьцю ў ёй мастацкага твора! Ні тое, што бажніца ўяўляе сабою ўзор «папскага барока» (гэты тэрмін азначаў прысуд сотням беларускіх помнікаў), ні тое, што ён знаходзіцца ў аварыйным стане (для большае доказнасьці маглі б і падпаліць, як бывала шматкроць)... Не, менавіта росьпісы, жывыя ілюстрацыі нашае гісторыі, павінны быць зьнішаныя. Вось толькі застаецца загадкаю, чаму тагачасным «інтэгратарам» не хапіла цяму прапанаваць сашкрэбсьці фрэскі?..

Пра тое, якое ў 1654 г. было «вызваленьне», чытаем у кнізе Генадзя Сагановіча «Невядомая вайна»: «... 22 ліпеня велікою потугою и усілством през штурм» мсьціслаўскі замак быў захоплены. Паводле шматлікіх сьведчаньняў відавочцаў тых падзеяў, пераможцы «места агнём выпалілі і людзей пасеклі», «народ усялякі шляхецкі, мешчан і жыдоў, а таксама простых людзей у пень высеклі, потым адтрубіўшы, сярод трупаў жывых знаходзілі і ў палон на Маскву забіралі, а скарбы ўсялякія забраўшы, замак і паркан увесь агнём спалілі дазваньня спустошылі», «... князь Трубецкой с товарищі город Мстіславль взял і высек і выжег, а побіл в нём больше пяті на десяті тысяч...»

Гэтая расправа атрымала ў гісторыі назву «Трубяцкая разьня». Успамін пра яе захаваўся ў людзей нават да нашага часу. Мсьціслаў, які па тых часах быў роўны Кіеву, быў спляжаны дазваньня. Менавіта пра гэтую падзею і сёньня сьведчыць росьпіс у Мсьціслаўскім касьцёле кармэлітаў – як напамін нашчадкам, як рэквіем па нашых продках.

Ігар Пушкін

P.S. Дзьве гісторыі мсьціслаўскага касьцёлу сьведчаць, дзе праходзіць падзел паміж вандалізмам і духоваасьцю. Так ствараюцца дзьве гісторыі. Паводле адной, гісторыя касьцёлу кармэлітаў у Мсьціславе – калазварот рабункаў, блюзьнерства і нянавісьці. У гэтай гісторыі ёсьць і свае архівы, і свае героі. Героі найноўшага часу ўжо ідэйныя, нястомныя і нязломныя ў сваім жаданьні вынішчаць і аплёўваць. Фрэскі XVIII ст. не давалі ім сну... Другая гісторыя – гэта стварэньне. Глаўбіц, які аднавіў бажніцу ў 1746-50 гадах, лічыў гэты касьцёл за адзін з найлепшых, а сам горад называў малой Вільняй. У 1887 годзе ў рэстаўрацыйных работах на гэтым касьцёле браў удзел юнак Леў Вітан-Дубейкаўскі, тутэйшы ксёндз пераканаў яго ў беларускасьці. На жаль, пакуль невядомыя імёны тых, хто выратаваў бажніцу кармэлітаў ад зьнішчэньня. Але дзякуючы гэтым невядомым людзям сёньня тут гучыць беларускае слова і правіцца сьвятая літургія.

Сяргей Харэўскі

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19[55], 27/10/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 6877 Кошт свабодны.